Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

# ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 5 (4448) 1 лютага 2008 г.

## У нумары:

**Брава, «Харвест»!**

Серыя «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі» — праект перспектыўны.

Стар. 4

**Спадчына**

Фонд Уладзіміра Караткевіча ў дзяржаўным архіве-музеі значна папоўніўся.

Стар. 5

**«Кухня» талентаў**

Інтэрв'ю з дырэктарам Мінскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча імя А. Глебава.

Стар. 10

**Развагі пра крытыку**

Пачатак палемікі вакол артыкула Ігара Запрудскага «Сапраўды» («Маладосць», № 12, 2007 год).

Стар. 12

**Партрэт паэта ў інтэр'еры жанру**

Паэзія Анатоля Грачанікава — непараўнальны ўзор разнастайнасці творчага выяўлення.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

***Для індывідуальных падпісчыкаў:***
1 месяц — 6400 руб.
Падпісны індэкс — 63856

***Ведамасная падпіска:***
1 месяц — 8300 руб.
Падпісны індэкс — 638562

***Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў:*** першае паўгоддзе, на 1 месяц — 4400 руб. Падпісны індэкс — 63815

***Льготная падпіска:*** 1 месяц — 6500 руб. Падпісны індэкс — 63880

*Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!*

# Падарожжа ў прасторы і часе

**Памяць пра мінулае жыве перш за ўсё ў гістарычных крыніцах: старажытных летапісах, афіцыйных дакументах, успамінах продкаў, прыватных лістах. А яшчэ — у паштоўках. Так, РВУ "Літаратура і Мастацтва" выпусціла ў свет новую кнігу "У пошуках страчанага: Гісторыя Беларусі ў старых паштоўках" (аўтар тэксту Алесь Карлюкевіч, паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава).**

На прэс-прэзентацыі з нагоды выхаду выдання першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч падкрэсліла, што з'яўленне новай кнігі — заўсёды важная падзея ў культурным жыцці нашай краіны. Менавіта за цыкл публікацый "У пошуках страчанага" аўтарскаму калектыву ў складзе А. Карлюкевіча, У.Ліхадзедава і П. Якубовіча Прэзідэнт нашай краіны ўручыў прэмію "За духоўнае адраджэнне" 2006 года. Міністэрства інфармацыі Беларусі пры фарміраванні дзяржзаказу зыходзіць з таго, што пры дзяржаўнай падтрымцы павінны выдавацца самыя значныя творчыя праекты, якія былі б рэальным унёскам нас, сучаснікаў, у багатую гісторыю беларускага народа.

Лілія Станіславаўна зазначыла: *"Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" вядома не толькі літаратурна-мастацкімі часопісамі "Полымя", "Маладосць", "Нёман", "Всемирная литература" і газетай "ЛіМ", якія сёння з'яўляюцца гістарычным гонарам нашай краіны. Калектыў установы дзейсна зарэкамендаваў сябе ў галіне кнігавыдання. Беларуская кніга займае добрыя пазіцыі на кнігавыдавецкім рынку краін СНД. Па выніках міжнароднага конкурсу "Мастацтва кнігі" за 2007 год Рэспубліка Беларусь атрымала 11 дыпломаў. Штогод на Дні беларускага пісьменства ганаруюцца лепшыя нацыянальныя праекты ў галіне кнігавыдання. Упэўнена, што дадзеная кніга будзе вартай самых высокіх узнагарод"*.

Намеснік галоўнага рэдактара газеты "Советская Белоруссия" Міхаіл Лябедзік расказаў пра ідэю праекта "У пошуках страчанага", які "жыве" на старонках выдання вось ужо чатыры гады.

Алесь Карлюкевіч, дырэктар РВУ "Літаратура і Мастацтва", асобна падзякаваў Аляксандру Аксёненку, дырэктару Мінскай фабрыкі каляровага друку, і адзначыў: *"Гэта кніга не адбылася б, калі б не было першаасновы — калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава... Адметная цікавасць да гэтага праекта з боку прадстаўнікоў дыпламатычных місій, якія працуюць у нашай краіне. У калекцыі У. Ліхадзедава ёсць паштоўкі памежных тэрыторый, звязаныя нашай агульнай гісторыяй з Расіяй, Украінай, Польшчай, дзяржавамі Прыбалтыкі. Спадзяюся, што гэта адлюструецца ў новых сумесных праектах, якія будуць спрыяць развіццю міжнародных стасункаў, развіццю культурнага супрацоўніцтва Беларусі з іншымі краінамі"*.

Уладзімір Ліхадзедаў падзякаваў за падтрымку і садзейнічанне ў выданні кнігі, якая, з яго слоў, у першую чаргу скіравана на духоўнае выхаванне нашага насельніцтва, на захаванне і аднаўленне помнікаў архітэктуры.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы вызначыў шматпланавасць праекта "У пошуках страчанага". Кніга цікавая як крыніца ведаў, эмоцый. Кожная паштоўка мае сваю гісторыю. Яна не толькі перадае выяву пэўнага часу або настрою, але і паўстае сведкай адносін паміж людзьмі. Кожная старонка кнігі — гэта адкрыццё для чытача.

Таксама слова бралі Аляксандр Фралоў, саветнік Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі, Марыя Даманьска, другі сакратар Пасольства Рэспублікі Польшча ў нашай краіне, якія выказаліся за супрацоўніцтва ў падобных праектах.

Адам Мальдзіс, аглядальнік газеты "Советская Белоруссия", доктар філалагічных навук, прафесар, які напісаў для кнігі пасляслоўе, зазначыў, што гэта выданне — добрая спроба для аўтараў і чытачоў зрабіць падарожжа адначасова і ў прасторы, і ў часе. У прасторы — па Беларусі, і ў часе — на стагоддзе ў мінулае. Нашым спадчыннікам будзе цяжэй рабіць кнігі-альбомы кшталту "У пошуках страчанага", бо тое, што мы бачым сёння ў кніжных і іншых крамах — ні па форме, ні па афармленні не адпавядаюць звыклай, стандартнай паштоўцы.

**Віктар КАВАЛЁЎ**

***На здымку: падчас прэзентацыі ў прэс-цэнтры "Дома прэсы".***

***Фота Кастуся Дробава***

# Вяртанне чарадзея

**Кнігай "Мікола Селяшчук. Гучанне музыкі нябёсаў" папоўнілася заснаваная ў 2005 годзе выдавецтвам "Мастацкая літаратура" серыя "Мастакі Беларусі". Прэзентацыя новага выдання адбылася ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва.**

Шыкоўны фаліянт, прысвечаны выдатнаму жывапісцу, майстру кніжнай графікі, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі, змяшчае ўспаміны, эсэ, дзённікі, фотаздымкі, рэпрадукцыі работ мастака. Прадстаўлены жыццяпіс Міколы Селяшчука, спіс праілюстраваных ім кніг. Укладальнік — мастацтвазнаўца і журналіст Наталля Шаранговіч. Яе ўступны артыкул уводзіць у казачны свет героя манаграфіі, настройвае на кранальную поліфанію калектыўнага расповеда, у які ўлучыліся галасы сяброў і аднакурснікаў мастака, яго настаўнікаў і калег, журналістаў, літаратараў, дзеячаў культуры — самых розных людзей, якія ведалі М. Селяшчука і, можа, ужо некалі пісалі пра яго. У гэтым шматталоссі — развагі, уражанні Гаўрылы Вашчанкі, Леаніда Шчамялёва, Льва Алімава, Уладзіміра Рылаткі, Таісы Бондар, Раісы Баравіковай, Галіны Багданавай, Валерыя Славука, Уладзіміра Слабодчыкава, Анатоля Кашапарава, Яўтена Коктыша... Усіх і не пералічыш.

Яшчэ помніцца выстаўка "Мікалай Селяшчук. Дарога дадому", якую да 60-годдзя з дня яго нараджэння наладзіў Нацыянальны мастацкі музей Беларусі. Прэзентацыя кнігі сталася лагічным працягам таго мемарыяльна-юбілейнага вернісажа. Прадстаўляючы выданне, прысвечанае нядоўгаму, трагічна перарванаму жыццю і яскравай творчасці свайго таленавітага вучня, народны мастак Беларусі, дырэктар Музея сучаснага выяўленчага мастацтва прафесар Васіль Шаранговіч гаварыў пра Міколу Селяшчука як пра не фармальнага, але фактычнага, уплывовага творчага лідэра цэлага пакалення. На прэзентацыі выступілі зямляк М. Селяшчука, брэсцкі мастак Леў Алімаў, намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва "Мастацкая літаратура" паэт Віктар Шніп. Пра складанасці працы над кнігай казала Наталля Шаранговіч: большасць работ М. Селяшчука знаходзіцца ў прыватных калекцыях, многія — за мяжой, таму нельга зрабіць дасканалы агляд яго твораў і нават скласці каталог, гэты надзвычай таварыскі чалавек, аднак, практычна не даваў інтэрв'ю журналістам — "узнавіць" Селяшчукову інтанацыю дапамаглі сябры мастака, якія знайшлі яго дзённікавыя запісы.

Новае выданне само па сабе — уражлівы твор, і ў гэтым заслуга Андрэя Савіча, які зрабіў мастацкае афармленне і гожую вёрстку кнігі. Выпуск яе ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ**

***На здымку: з новай кнігай — мастацтвазнаўца Н. Шаранговіч.***

***Фота аўтара***

З нагоды

# Развіццё патрабуе ініцыятывы

**Справаздачная калегія за год — заўсёды экзамен. І калегія Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь — таксама. Падводзячы вынікі работы галіны за 2007 год, міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч у спакойнай, разважлівай, але разам з тым выразна завостранай на галоўныя праблемах справаздачы не толькі прааналізаваў здабыткі, але і акрэсліў кірункі, у рамках якіх сродкам масавай інфармацыі, паліграфістам, кнігавыдаўцам, распаўсюджвальнікам друку рухацца далей у самы бліжэйшы час.**

Важнейшы з клопатаў — рацыянальнае выкарыстанне сродкаў дзяржаўнага бюджэту, якія выдаткоўваюцца на перыёдыку. Вырашаючы дзяржаўныя, ідэалагічныя задачы, ні ў якой меры нельга забываць на тое, што матэрыяльныя ўкладанні павінны быць пацверджаны справамі. Уражлівы прыклад эфектыўнага гаспадарання, граматнага выканання асветніцкіх, духоўных задач у звязку з патрабаваннямі часу — штотыднёвая газета "Культура". Цалкам самаакупляльнае выданне, газета мае наклад амаль 11 з паловай тысяч асобнікаў. А ўдзельная вага ўласных даходаў прадпрыемства "Культура і Мастацтва" (яно — яшчэ і выдавец часопіса "Мастацтва") складае 99 працэнтаў. Здавалася б, лішняя для чытача інфармацыя... Але ж у вышадку з "Культурай" рост эканамічных паказчыкаў звязаны з высокімі творчымі здабыткамі газеты, павелічэннем аб'ёмаў яе нумароў. І прычыны на тое ў самым простым — ініцыятыве калектыву газеты "Культура", адзначанай і прэміяй "За духоўнае адраджэнне", і важкай у журналісцкім асяродку "Залатой Ліцерай".

Але — і на гэтыя развагі падштурхнула калегія, даклад міністра, выступленні многіх аўтарытэтных кіраўнікоў галіны — у поспеху любога выдання ёсць, акрамя ўнёску журналісцкага калектыву, увогуле рэдакцыі, яшчэ адна прычына. І гэтая прычына — увага чытача. Плануючы дзейнасць выданняў РВУ "Літаратура і Мастацтва" (часопісаў "Полымя", "Маладосць", "Нёман", "Всемирная литература" і газеты "Літаратура і мастацтва"), і мы спадзяёмся на самую шырокую чытацкую ўвагу і падтрымку. Найперш — літаратурнай грамадскасці, школьнага настаўніцтва, літаратурнай, творчай моладзі. Мы ўпэўнены, што рухавіком эканомікі ў дачыненні да літаратурна-мастацкай перыёдыкі можа і павінна быць сур'ёзная "зваротная сувязь".

**Кастусь ЛЕШНІЦА**

## Дакументалістыка пра класікаў

**На Першым тэлеканале 9 і 10 лютага адбудзецца прэм'ера дакументальнага фільма "Купала. Колас. Тайны біяграфіі".**

Стваральнік фільма спецыяльны карэспандэнт АТН Міхаіл Равуцкі прызнаецца, што праца ішла не менш як два гады. "Мы не хацелі пераказваць біяграфіі класікаў беларускай літаратуры, прысвячаць фільм менавіта іх юбілею. Акрамя хранікальнасці хацелася ўкласці ў фільм і мастацкую падачу матэрыялу, — расказвае ён. — Мы імкнуліся паказаць класікаў не ў якасці "бронзавых помнікаў", а як жывых людзей. Разглядалі іх узаемаадносіны. Дапамагалі ў стварэнні фільма архівіст Віталь Скалабан, вядомы літаратуразнаўца Вячаслаў Рагойша ды іншыя.

Сёння многія навукоўцы працягваюць даследаваць жыццё і творчасць класікаў, выдаецца поўны збор твораў Коласа. А значыць і журналістам хопіць працы — кропку ў тэме ставіць рана...

**Анатоль ВАСІЛЬЧАНКА**

**Нядаўна ў памяшканні Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы прайшоў "круглы стол" пад назвай "Пытанні ўсебаковай аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь". Мерапрыемства адбылося пад эгідай Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. У абмеркаванні прынялі ўдзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, супрацоўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Інстытута дзяржаўнай бяспекі ды інш.**

# Як захаваць нематэрыяльную культуру?

### *Падставы для абароны*

Па словах старшыні Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА Уладзіміра Шчаснага, важнае значэнне для разумення праблемы мае Канвенцыя 2003 года аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая на сённяшні дзень ратыфікавана 79 краінамі свету. Асноўная мэта дакумента — паспрыяць захаванню і развіццю нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Яна ўключае ў сябе звычаі, веды і навыкі, абрады і спевы ды інш. Разам з гэтым разглядаюцца інструменты, прадметы, артэфакты, якія прызнаюцца культурнай спадчынай. Дарэчы, Беларусь далучылася да вышэйзгаданай Канвенцыі 20 красавіка 2006 года.

Адной з прычын падпісання дакумента стала праблема глабалізацыі. "Канвенцыя можа дапамагчы ў пошуках аптымальнага адказу на той ціск, які аказвае глабалізацыя на культурную разнастайнасць, у прыватнасці, на яе так званыя "жывыя" праяўленні. Больш паважлівыя адносіны да нематэрыяльнай культурнай спадчыны могуць стаць адным са шляхоў устанлявання сацыяльнай гармоніі," — адзначыў у сваім звароце Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Каіціра Мацуура падчас другой чарговай сесіі Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая прайшла ў Токіа восенню 2007 года.

Таксама ў артыкуле 15 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі) гаворыцца: "Дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь". Такім чынам, на заканадаўчым узроўні існуюць дзве падставы для сур'ёзнага разгляду вышэйзгаданай тэмы.

### *Тры праблемы нематэрыяльнай культуры*

Падчас пасяджэння "круглага стала" вызначыліся тры праблемы, на якіх яго ўдзельнікі засяродзілі асаблівую ўвагу.

Так, спрэчнаю стала інтэрпрэтацыя паняцця нематэрыяльнай культурнай спадчыны, былі адзначаны разыходжанні трактоўкі Канвенцыі 2003 года і Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны".

Удзельнікі "круглага стала" акрэслілі шмат акалічнасцей, якія трэба ўлічваць пры азначэнні паняцця. У прыватнасці, абмяркоўвалася пытанне аб правядзенні рысы паміж тэатралізаванымі абрадамі і абрадамі, якія захоўваюцца жыхарамі мясцовасці і перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Цікавая гаворка адбылася вакол крыжа Еўфрасінні Полацкай. Яго арыгінал, страчаны падчас Вялікай Айчыннай вайны, лічыцца матэрыяльнай культурнай каштоўнасцю. Ужо ў наш час ювеліры аднавілі яго. Але гэта ўжо — твор другасны, больш сімвалічны. А паколькі ён сімвал, узнікае палемічнае пытанне, ці трэба яго адносіць да нематэрыяльнай культуры?

Пасля гэтага ўдзельнікі "круглага стала" абмеркавалі праблему ўліку і стварэння нацыянальнага рэестра нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Згодна з Канвенцыяй-2003, працэс яго стварэння павінен адбывацца ў шчыльнай сувязі з суполкамі, групамі людзей, якія карыстаюцца і захоўваюць фальклорныя традыцыі народа Беларусі.

### *Вынік у дакуменце*

Уладзімір Шчасны як вядучы "круглага стала" адзначыў, што абмеркаванне тэмы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны можа мець працяг. У выніковым дакуменце пасяджэння замацавана неабходнасць стварэння нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра па ахове і вывучэнні нематэрыяльнай культурнай спадчыны, арганізацыі сістэмы яе ўліку і г.д. Палеміка доўжылася тры гадзіны, але і гэтага, напэўна, было мала. Бо кожны паварот праблемы ў той ці іншы бок выклікаў свае "за" і "супраць".

**Уладзімір ШУГАВЕЕЎ**

***Фота аўтара***

# Зімовы «Дабравест»

**Заканчэнне студзеня ў творчым асяродку беларускай інтэлігенцыі сталася пачаткам досыць адухаўлёнага, насычанага перажываннямі палілогу. У Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі праходзіла багатая на падзеі духоўна-асветніцкая праграма «Мастацтва і праваслаўе».**

Дыскусіі навукоўцаў, творцаў — людзей свецкіх ды духоўных ладзіліся ў працяг раней распачатага супрацоўніцтва, замацаванага ў пагадненні паміж дзяржавай і царквою. Чатыры гады таму, у 2004-м, падпісана і доўгатэрміновая праграма ўзаемадзеяння Беларускай Праваслаўнай Царквы з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. За прамінулыя гады навукоўцы ды святары зладкавалі шэраг імпрэз у сценах НАН Беларусі ды ў Жыровічах — у Мінскай духоўнай акадэміі. Сустракаліся мастакі, гісторыкі. І вось цяпер — мастацтвазнаўцы, фалькларысты, этнографы.

У сёлетнюю духоўна-асветніцкую праграму ўвайшлі выстава карцін і абразоў, "круглы стол" па тэме "Рэлігія і мастацтва" і канцэртная праграма калектываў рэспубліканскага фестывалю сучаснай хрысціянскай культуры "Дабравест". Па сутнасці ж, дамінавалі два асноўныя кірункі: выяўленчае мастацтва ды іканаграфія. А навуковая думка акцэнтавалася на повязі народных традыцый з рэлігійнымі.

"*Поле супрацоўніцтва ў нас — найвялікшае*, — падкрэсліў на "круглым стале" дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар архітэктуры, доктар мастацтвазнаўчых навук, прафесар Аляксандр Лакотка. — *Традыцыі — гэта тая крыніца, якой жывіцца сучаснае аблічча Беларусі*". Сапраўды, ва ўмовах глабалізацыі і развіцця нетрадыцыйных рэлігійных плыняў яны набываюць асаблівую духоўную значнасць — таму і навукоўцамі інстытута выдадзены з дзесятак тамоў, дзе багата прадстаўлена народная культура. Яшчэ тры кнігі знаходзяцца ў працы.

Зараз адна з актуальных праблем, якія вырашаць разам навукоўцам, даследчыкам і рэлігіязнаўцам, — адпаведнасць стыляў архітэктурнага ды іканапіснага. Аднаўляючы многія святыні, сакральныя пабудовы ды абразы, творцы ва ўсе часы ідуць шляхам іх паляпшэння. Але не заўсёды прыводзіла гэта да лепшага. Да прыкладу, ікона, адрэстаўраваная ў старажытным храме майстрамі XVII стагоддзя, ператваралася часам у новую карціну. Сённяшняя задача — аднаўленне іканастасаў першапачатковых. Згадкі аб працы ў полацкіх храмах, Свята-Петрапаўлаўскім саборы Мінска альбо па аднаўленні храма ў Мураванцы — сімвала самастойнай беларускай архітэктурнай школы — запатрабавалі асэнсавання праблем захавання менавіта сакральнай прасторы: іконы ў храме, храма ў прыходзе, прыхода ў вёсцы ці горадзе. А хто іншы, як не супольнасць філосафаў, гісторыкаў, этнографаў ды багасловаў правядуць аналіз? У адмысловай канферэнцыі вочна ды завочна ўдзельнічалі Г.Лаўрэцкі — кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт БНТУ, Г.Ласкі — з Мінскай духоўнай акадэміі, іерэй А.Шымбалёў — клірык Свята-Духава кафедральнага сабора, В.Жук — намеснік дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Б.Лазука — загадчык аддзела гэтага інстытута ды інш. Адкрываючы "круглы стол", акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, доктар эканамічных навук, прафесар Пётр Нікіценка згадаў вопыт Германіі. Краіны, якая з'яўляецца ўзорам укаранення крэатыўнай эканомікі, дзе культура, мастацтва, дызайн, кіно — уся духоўна-маральная прастора ўлічваецца як найвялікшая і прыбытковая сфера менавіта эканамічнага жыцця.

Беларуская духоўна-асветніцкая праграма "Мастацтва і праваслаўе" праходзіла ў акадэмічным гарадку з 21 па 25 студзеня. Рэалізоўвацца ж напрацоўкі будуць, пэўна, на працягу года — да наступнай такой сустрэчы.

**Ірына ТУЛУПАВА**

***Фота Кастуся Дробава***

# «Беражэм Купалы, Коласа радзіму»

**Край, шчодры на зычлівых людзей, спеўны і песенны куток зямлі — Беларусь урачыста святкавала юбілеі сваіх абласцей. Падпарэзаная слуцкімі паясамі, на капыльскіх тканых посцілках са старадарожскімі ручнікамі і караваем духмянага хлеба ў руках маладзіца-Мінщчына сустракала і землякоў, і суседзяў-гасцей.**

На юбілейныя ўрачыстасці з нагоды 70-годдзя Мінскай вобласці прыехалі дэлегацыі з Расіі — Маскоўскай вобласці, Паўднёвай адміністрацыйнай акругі Масквы, Смаленскай, Калінінградскай, Бранскай, Разанскай, Ніжагародскай, Курскай абласцей. А таксама госці з Украіны — прадстаўнікі Луганскага, Харкаўскага, Кіеўскага рэгіёнаў. Прысутнічалі прадстаўнікі і ўсіх абласцей нашага краю: урадавая пастанова, паводле якой была створана новая — цяперашняя сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення, датуецца 15 студзеня 1938 года. На Міншчыне тады налічваўся 21 раён, тэрыторыя ахоплівала 27,2 тыс. кв. км. І з-за таго, што вобласць мела значныя залежы торфу, ён выкарыстоўваўся не толькі як паліва, а і для рознага роду хімічнай вытворчасці. На гэткім падмурку працавалі шматлікія прадпрыемствы саюзнага і абласнога падпарадкавання. Асноўнымі галінамі прамысловасці былі метала- і дрэваапрацоўка, а таксама харчовая прамысловасць. Вядучы кірунак сельскай гаспадаркі вызначаўся як "зерне-бульба-жывёлагадоўчы". Цікава: тады, у 1939 годзе, на Міншчыне распаўсюджвалася 28 рэспубліканскіх, абласных і раённых газет, разавы тыраж якіх складаў 412 тыс. экз.

І хоць 70 год — у гісторыі як адно імгненне, але і яно пакінула свой адбітак. Тэрыторыя вобласці павялічылася амаль у паўтара раза (цяпер 39,96 тыс. кв. км), аснову эканомікі складае прамысловы комплекс рознагаліновай скіраванасці. На Міншчыне сканцэнтравана ўся вытворчасць калійных угнаенняў, каля 58 працэнтаў цукру, звыш 48 працэнтаў трыкатажных вырабаў. Добра вядома ў Беларусі і за мяжою прадукцыя "Беларускага аўтамабільнага завода", ТАА "Світанак", РУП "Беларуськалій" і інш. Показальна і тое, што *больш як 60 працэнтаў бюджэтных сродкаў накіроўваецца ў сацыяльную сферу...* Толькі ў 2007 годзе прэміямі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў былі ўзнагароджаны 77 юнакоў і дзяўчат. Аблвыканкам зацвердзіў грашовыя выплаты для 134 вучняў і 99 настаўнікаў. З абласнога бюджэту на гэтыя мэты было выдаткавана каля 800 мільёнаў рублёў.

Сёлета юбілярку ўганаравалі Ганаровым дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь Нявыглас, распачынаючы ўрачыстае пасяджэнне, уручыў сцяг старшыні Мінскага аблвыканкама Леаніду Крупцу. Ганаровымі граматамі Савета Міністраў краіны ўзнагароджаны СВК "Агракамбінат "Сноў" Нясвіжскага раёна, Мінская абласная клінічная бальніца і шмат працаўнікоў розных сфер. У свой урачысты дзень Міншчына назвала ганаровых грамадзян Мінскай вобласці: лётчык-касманаўт, двойчы Герой Савецкага Саюза, генерал-палкоўнік авіяцыі Уладзімір Кавалёнак, заслужаны майстар спорту, чэмпіён XVIII Алімпійскіх гульняў, прызёр XIX Алімпійскіх гульняў, рэкардсмен свету і Еўропы Рамуальд Клім, былы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Сяргей Паўлюкевіч, Героі Сацыялістычнай Працы Сяргей Шклярэўскі і Надзея Куніцкая.

На зямлі Міншчыны спасцігалі народную мудрасць майстры мастацкага слова і класікі беларускай літаратуры Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. Тут пісалі свае творы Максім Танк, Кандрат Крапіва і Паўлюк Трус.

Чароўныя мелодыі Станіслава Манюшкі, Ігара Лучанка, выдатныя скульптуры Анатоля Анікейчыка, навуковыя адкрыцці Мікалая Барысевіча — таксама ў духоўнай скарбонцы краю.

Дарэчы, у назву гэтых нататак вынесены радкі з верша Васіля Жуковіча "Мінщчына". Аленай Атрашкевіч верш пакладзены на музыку і гучыць добрым гімнам краю.

**Ірына ТУЛУПАВА**

***Фота Кастуся Дробава***



# Творчая сустрэча з моладдзю

**Нядаўна ў госці да студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя П. Машэрава наведаўся вядомы пісьменнік і дзяржаўны дзеяч, асоба, чыё імя занесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса, Мікалай Чаргінец. Студэнты з нецярпеннем чакалі гэтай сустрэчы. Усе ведалі, што не так даўно Мікалай Іванавіч адзначыў сваё сямідзесяцігоддзе. Але, калі ў аўдыторыю зайшоў энергічны, бадзёры чалавек, мала хто здагадаўся, што гэта і ёсць Мікалай Чаргінец.**

Мікалай Іванавіч расказаў пра сваю творчасць, пра напісаныя кнігі, агульны тыраж якіх налічвае некалькі соцень тысяч экземпляраў. Пра гэта многія з прысутных ведалі, бо чыталі яго захапляльныя вострасюжэтныя раманы.

Сёння мала пісьменнікаў, якія так масава авалодваюць цікавасцю маладых чытачоў. Насамрэч, ва ўсіх кнігах падкупляе вялікі вопыт аўтара, дасканалае веданне ім метадаў і прыёмаў барацьбы з арганізаванай злачыннасцю, высокапрафесійнае валоданне сучаснымі спосабамі раскрыцця злачынстваў па гарачых слядах, як гэта было ў часе яго службы, — усё гэта адыграла асноўную ролю ў запатрабаванасці творчасці пісьменніка.

Студэнты і выкладчыкі задавалі шматлікія пытанні. І не дзіўна, бо сапраўдны пісьменнік — гэта заўсёды асоба.

"Раскажыце пра сваю службу ў Афганістане!"

"Калі вы пачалі пісаць свае першыя мастацкія творы?"

"Як вы паспяваеце і пісаць, і кіраваць Саюзам пісьменнікаў, і актыўна працаваць у Савеце Рэспублікі.."

"Што дапамагае вам трымаць сябе ў такой выдатнай творчай і фізічнай форме?" — вось толькі некаторыя з пытанняў прысутных.

Мікалай Іванавіч адказваў адкрыта, з усмешкай, з гумарам і, разам з тым, шчыра:

— *Любоў да жыцця, да людзей-працаўнікоў — вось што дапамагае мне быць у форме. Ва ўсіх сферах жыцця чалавечы фактар быў і застаецца вырашальным. Там, дзе працуе адказны, ініцыятыўны, вопытны работнік, які спалучае такія якасці, як прыстойнасць, дабрата да людзей, заўсёды будзе парадак. Ад такіх людзей усе выйграюць: і справа, якую яны робяць, і Айчына, якой яны служаць.*

Да слова, вялікую цікавасць выклікала выстаўка кніг Мікалая Чаргінца, якую зладкавалі бібліятэкары навучальнай установы.

**Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА**

***На здымку: аўтографы ад Мікалая Чаргінца прыхільнікам яго творчасці.***

# Крылы для натхнення

"Я ад дрэва твайго лісток, залаты мой спрадвечны горад" — гэтыя радкі верша паэта Навума Гальпяровіча сталіся назвай творчай сустрэчы аўтара з землякамі. У Полацкім гарадскім Палацы культуры сабраліся сотні жыхароў горада, раёна, суседняга Наваполацка, дзе добра ведаюць Навума Гальпяровіча як журналіста, паэта, грамадскага дзеяча, які шмат гадоў працаваў на Полаччыне. На сустрэчу прыйшлі аднакласнікі, сябры, першая настаўніца Тамара Фёдараўна Кананок. Земляка сардэчна віталі мэр Полацка У. Тачыла, мэр Наваполацка Н. Качанава, старшыня раённага савета дэпутатаў М. Макеенак. Цёплыя словы пра земляка прамовіў ганаровы грамадзянін горада, пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Алесь Савіцкі, які таксама прыехаў з Мінска, каб прыняць удзел у вечарыне. Выступалі артысты, кампазітары, госці, гучалі творы аўтара, прысвечаныя сваёй малой радзіме.

— Гэта мой падарунак роднаму гораду, своеасаблівая справаздача перад землякамі за зробленае больш як за сорак гадоў творчай працы, — сказаў на пачатку вечара Н. Гальпяровіч. — Менавіта Полацк, Дзвіна, постаці вялікіх землякоў давалі і даюць мне крылы для натхнення.

У гэты ж дзень адбылася цёплая сустрэча з пісьменнікам і яго гасцямі ў роднай дзевятай школе, дзе вучні падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю па творах Навума Гальпяровіча.

**А. МАЛІНОЎСКІ**

***На здымку: падчас сустрэчы.***

***Фота Г. Чарказяна***

# Саперніцтва — сур'ёзнае

**У 2008 годзе адбудзецца чарговы нацыянальны конкурс "Мастацтва кнігі". Лаўрэаты стануць вядомы ў красавіку, а ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пройдзе ў Барысаве падчас Дня беларускага пісьменства-2008. Пра гэта распавёў кансультант упраўлення развіцця выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Валерый Рагалевіч.**

Пакуль не адбылося афіцыйнага пасяджэння журы, Валерый Антонавіч выказаў суб'ектыўныя думкі наконт найбольш яркіх выданняў мінулага года. У прыватнасці, ён засяродзіў увагу на кнігах "Мужчынскі касцюм на Беларусі", "Гісторыя мастацтва" ў 2 тамах, "Сакральны жывапіс", якія пабачылі свет у выдавецтве "Беларусь".

Добры водгук атрымала новая прадукцыя выдавецтва "Мастацкая літаратура". У прыватнасці, другая кніга серыі "Мастакі Беларусі", якая прысвечана Мікалаю Селяшчуку.

Вельмі цікавай як па напаўненні, так і па выкананні стала кніга "Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь". Цвёрдая вокладка, адмысловая скрынка для захоўвання, высакаякасная папера. Прывабныя каляровыя фотаздымкі, аповеды пра дасягненні нашай дзяржавы, яе значных асоб — усё гэта можна знайсці

на старонках выдання. Сёлета яго атрымае ў падарунак разам з пашпартам кожны юнак ці дзяўчына, якія дасягнулі 16 гадоў.

Па словах Валерыя Рагалевіча, кнігу-"пашпарт" плануецца дарыць не толькі сёлета. У крамы яна не паступіць. Дарэчы, такія кнігі-падарункі ўжо выпускаліся і раней.

**Уладзімір ШУГАВЕЕЎ**

***Фота аўтара***

# Насуперак перагляду гісторыі

**Усё далей ад нас адыходзіць той час, калі на зямлі Беларусі ішлі цяжкія баі за вызваленне ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Не забываюць пра іх і ў хатніх гутарках, і на старонках газет. Адным з праектаў, прысвечаных тэме ахвяр Вялікай Айчыннай, стала серыя публікацый у газеце «Звязда» пад агульнай назвай «Нашчадкі вогненных вёсак». Менавіта за яго рэдактар аддзела культуры газеты «Звязда» Таццяна Падаляк атрымала спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры і мастацтва ў намінацыі «Журналістыка» за 2007 год.**

— У студзені 2006 года рэдакцыя газеты «Звязда» і Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» пры дзейснай падтрымцы Мінскага аблвыканкама абвясцілі аб правядзенні сумеснай акцыі «Нашчадкі вогненных вёсак», — расказвае Таццяна Уладзіміраўна. — У нейкай ступені гэта працяг той значнай справы, якую распачалі вядомыя пісьменнікі Алесь Адамовіч, Янка Брыль і Уладзімір Калеснік у сваёй кнізе «Я з вогненнай вёскі»... Гэта — дакументальная хроніка, жывы голас людзей, што былі спалены, забіты разам з сям'ёй, разам са сваёй вёскай, і якія засталіся жыць.

«Паслухайце ж, што гаворыць, як памятае пра тое народ, — пішуць аўтары кнігі. — Дзесяткі кіламетраў магнітафонных запісаў — расказы больш як трохсот непасрэдных сведкаў хатынскіх трагедый — склалі змест гэтай кнігі. (...) На старонках яе сабраліся людзі, што выйшлі з агню, з-пад зямлі. І гэта — у самым рэальным, не пераносным сэнсе. Людзі з вогненных вёсак сабраліся тут, каб пытацца, судзіць, каб расказаць тое, пра што ведаць — страшна, а забыцца — небяспечна...».

Статыстыка сведчыць: больш як 9 200 беларускіх вёсак знішчылі акупанты — з іх 628 спалілі разам з жыхарамі. 186 вёсак так і не былі адноўлены пасля вайны...

На вялікі жаль, на пачатку XXI стагоддзя постсавецкае грамадства сутыкнулася з фактамі перагляду гісторыі. Мне сапраўды баліць, калі чую аб пераносе могілак савецкіх воінаў у Прыбалтыцы, прылічэнні менавіта нашых салдат, а не фашыстаў, да акупантаў. З гэтымі пераносамі ў мяне звязана і асабістае. Мой дзядуля Уладзімір Падаляк загінуў у Рыжскай вобласці. І сёння я з маім бацькам працягваем пошукі яго магілы, пішам запыты ў архівы...

Я папрасіла адгукнуцца тых, каму пашчасціла выжыць у вогненным пекле, чые раны памяці не загояцца ніколі, падрабязна расказаць пра ўсё на старонках найстарэйшай беларускай газеты «Звязда», якая, нагадаю, у час ваенных выпрабаванняў змагалася разам са сваім народам. Гэты зварот атрымаў шырокі рэзананс. У асноўным у газету пісалі і тэлефанавалі сваякі, але былі і лісты ад непасрэдных удзельнікаў трагічных падзей. Адзін з іх — Мікалай Гірыловіч. Ён нарадзіўся ў вёсцы Дальва, якую фашысты спалілі апошняй на нашай зямлі, літаральна за 10 дзён да вызвалення Беларусі.

Антон Коўцік з Салігорскага раёна 17-гадовым юнаком быў сведкам трагедыі вёсак Новыя Вялічкавічы і Старыя Вялічкавічы, дзе спалена адпаведна 222 і 127 жыхароў. Сам ён, паранены, цудам уцалеў. Пасля знішчэння вёскі быў у партызанскім атрадзе імя Пархоменкі на Салігоршчыне. У 1944 годзе дабіўся, каб накіравалі на фронт, на перадавую. Прайшоў праз Германію, Чэхаславакію, вайну скончыў недалёка ад Прагі. Самая дарагая ўзнагарода для яго — медаль «За адвагу»...

У Хатынь з розных раёнаў Беларусі прыязджалі не толькі ветэраны са сваімі сем'ямі, але і настаўнікі, школьнікі. Прыемна было пачуць, што вучні рэгулярна сустракаюцца з прадстаўнікамі сталага пакалення, запісваюць іх успаміны, а тэксты запісаў захоўваюць у школьных альбомах.

Паводле сумеснай акцыі газеты «Звязда» і мемарыяльнага комплексу «Хатынь» у дзень 64-й гадавіны Хатынскай трагедыі (сакавік 2007) адкрылася экспазіцыя «Нашчадкі вогненных вёсак», якая адлюстроўвае этапы сумеснай акцыі. Каля кожнага здымка (рэпартажнага, «сітуацыйнага», партрэтнага) — вытрымка з аповеда людзей «вогненнага лёсу». Напрыклад, у Мікалая Гірыловіча слёзы ў вачах, вось-вось пакоцяцца па твары — і побач яго словы: «Гасподзь пакінуў мне жыццё, каб было каму расказаць пра трагедыю маёй роднай Дальвы...». Тут і ліст у рэдакцыю Уладзіміра Жаваранка, а каля здымка — яго прызнанне: «Загінулі Літвічы... Такая прыгожая вёска была, нібы намаляваная на карцінцы...».

Пра гісторыю мінулай вайны я не толькі пішу ў «Звяздзе», але і расказваю ў лекцыях для студэнтаў факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, дзе выкладаю «Асновы прафесійнай этыкі журналіста». У фільме «Звычайны фашызм» Міхаіла Рома цытаваліся словы вялікага нямецкага філосафа Освальда Шпэнглера, які сказаў: «Другая сусветная вайна пачнецца тады, калі вырасце пакаленне, якое забудзе аб Першай сусветнай». Спадзяюся, пасля нашых гаворак будучыя майстры слова зробяць маральны выбар у бок праўды і не забудуць пра мінулае сваёй краіны, а Трэцяй суветнай не будзе...

Думаю, што не толькі такімі публікацыямі, урокамі гісторыі ў школах, але і прыцягненнем увагі моладзі да тэмы ахвяр вайны ў беларускай літаратуры можна захаваць памяць пра тыя падзеі. Добра, калі ў сачыненнях школьнікі праводзяць уласныя даследаванні радаводаў, узгадваюць пра ўспаміны сваіх блізкіх, якім лёс наканаваў перажыць вайну. Значыць, нашу справу ёсць каму працягнуць у будучым.

**Запісаў Сяргей ДУБОВІК**

***Фота аўтара***

**Заўзятыя аматары кнігі не маглі не заўважыць з'яўлення апошнім часам аб'ёмных, цёмна-зялёнага колеру тамоў, па сваім афармленні стылізаваных хутчэй за ўсё пад выданні, што выходзілі недзе, скажам, на стыку дзевятнаццатага-дваццатага стагоддзяў, ці ў першых дзесяцігоддзях апошняга. Прыгожая вокладка, стылізаваная пад скуру, цяснёны карашок пераплёту, на якім назва напісана залацістай фарбай. Гэткія ж выразныя літары на самой вокладцы. Адным словам, ва ўсім прысутнічае той сапраўдны акадэмізм, што ўласцівы кнігам, на якія звяртаецца асаблівая ўвага як з боку саміх выдаўцоў, так і чытачоў.**

# Брава, «Харвест»!

— А чаго тут здзіўляцца? — зазначыў сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар мясцовага літаратурнага фонду Георгій Марчук, які курыруе выдавецкія праекты. — Сур'ёзная серыя, таму да яе і адпаведны падыход.

— *Але ж новых серый з'яўляецца нямала і, трэба адзначыць, сярод іх ёсць грунтоўныя, як, для прыкладу, "Беларускі кнігазбор", ці шэраг тых, што выходзяць у выдавецтве "Мастацкая літаратура"...*

— Яно то так, але такой ніколі яшчэ не было. — Георгій Васільевіч бярэ адну з кніг у рукі. — Учытайцеся толькі ўважліва: "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі", а паколькі ў нас дзве дзяржаўныя мовы дый прымаючы пад увагу тое, што ў беларускай літаратуры актыўна працуюць і рускамоўныя пісьменнікі, дык назва серыі падаецца і ў рускім варыянце. У залежнасці ад таго, творчасць якога аўтара прадстаўляецца, яны будуць мяняцца месцамі. Калі пісьменнік у сваёй творчасці карыстаецца рускай мовай, дык спачатку будзе стаяць «Библиотека Союза писателей Беларуси".

— *І хто стаў ініцыятарам выпуску такой унікальнай серыі?*

— Найперш старшыня нашага творчага саюза Мікалай Чаргінец, якога падтрымала недзяржаўнае выдавецтва "Харвест".

— *Гэта тое самае, якое ў год выдае — падумаць толькі! — больш як тры тысячы найменняў кніг?*

— Яно.

— *Нават не верыцца. Будзем глядзець праўдзе ў вочы: падобныя выдавецтвы і іншыя адпаведныя структуры, як правіла, клапоцяцца толькі аб прыбытку, на першы план ставяць адзін камерцыйны інтарэс.*

— А вось кіраўніцтва "Харвеста" разумее, што нельга вымяраць усё толькі грашыма, што ёсць яшчэ такое паняцце, як хлеб духоўны. Пра яго і клапоцяцца ў "Харвесце", хоць, трэба адзначыць, яны не забываюцца і пра тое, што кнігі трэба рэалізоўваць. Таму цягам часу кнігі гэтай серыі з'явяцца і ў бібліятэках, а ў кнігарнях некаторыя з іх ужо можна набыць. На запатрабаванасць серыі, трэба спадзявацца, спрацуе і тое, што творы многіх аўтараў, якія мы выдаем, уключаны ў праграмы звычайнай сярэдняй школы ці школ з паглыбленым вывучэннем беларускай мовы і літаратуры, універсітэтаў і іншых вышэйшых навучальных устаноў.

— *З чыіх кніг вы пачалі выпуск серыі?*

— Класікаў нашай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Выхад гэтых тамоў для прыхільнікаў іхняй творчасці стаўся сапраўдным святам. Важна і тое, што сігнальныя экземпляры як выбранага Купалы, так і выбранага Коласа выйшлі якраз да ўрачыстасцяў, што ў сувязі са 125-годдзем з дня іхняга нараджэння праходзілі ў першым выпадку ў тэатры імя Янкі Купалы, а ў другім — у Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

— *Выданне класікі будзе прадоўжана?*

— А нягож! Паглядзіце... Атрымаліся такія аб'ёмныя тамы, што пад адной вокладкай сабрана не проста выбранае Купалы і Коласа, а па сутнасці ўсё самае-самае, што напісана імі. Апошняя акалічнасць асабліва важная для пісьменнікаў, творы якіх у апошнія гады не часта перавыдаваліся. Узяць, да прыкладу, незабыўнага Івана Чыгрынава. Якой псіхалагічнай глыбіні празаік! Наколькі праўдзіва ўзнавіў ён падзеі Вялікай Айчыннай вайны! Сталася ж так, што аб'яўлены выхад чарговага выпуску Збору ягоных твораў абмежаваўся з'яўленнем толькі першага тома.

— *Прыемна было б узяць у рукі том, у якім прадстаўлены ўсе пяць раманаў Івана Гаўрылавіча.*

— Такім шляхам мы і ідзём. Рыхтуем таксама том прозы Івана Шамякіна, у якім знойдзецца месца як ягоным творам, што патрапляюць пад вызначэнне хрэстаматыйных, так і тым, што пісаліся знакамітым празаікам апошнім часам.

— *А не збіраецеся практыкаваць выхад некалькіх тамоў пэўнага аўтара?*

— Не. Перавага будзе аддавацца грунтоўным аднатомнікам. Ужо рыхтуецца аднатомнік Максіма Танка. Вядзём таксама перамовы са спадчыннікамі Івана Мележа, каб у адным томе прадставіць усе тры раманы ягонай знакамітай "Палескай хронікі". Будзем выдаваць выбранае Петруся Броўкі.

— *А як, у такім разе, быць з сучаснымі літаратарамі?*

— Выдаваць! Нядаўна да чытача прыйшоў том прозы Уладзіміра Гніламёдава "Расія", у планах — кнігі Алеся Савіцкага, Валянціна Лукшы, Алы Чорнай, Міхася Пазнякова, Рыгора Сакалоўскага і іншых вядомых празаікаў і паэтаў. Адна ўмова: творы будуць значныя, высокамастацкія, якія вытрымалі, як кажуць, выпрабаванне часам.

— *Ці не атрымаецца, што і пры ажыццяўленні гэтага праекта будзе назірацца малюнак, што стаў ужо звыклым? Той, хто жыве ў Мінску, а асабліва, калі ён больш увішны, дык і хутчэй выдасца.*

— Вось вы пра што?! Няўжо мне напамінаць вам, што ў сапраўднай літаратуры няма правінцыі. А таму запланаваны выхад кніг Фелікса Мысліцкага, Юрыя Фатнева, Васіля Ткачова, Ніны Шкляравай — усе яны, як вядома, жывуць у Гомелі. Не забыліся, скажам да прыкладу, і пра Людмілу Кебіч з Гродна. У тым, наколькі яна цікавы паэт, многія змаглі ўпэўніцца ў час яе творчага вечара, што перад Новым годам ладзіўся ў сталіцы. Але ж яна ў Мінску па сутнасці не выдавалася. Таму і вырашана выпусціць кнігу, у якой як мага паўней будзе прадстаўлена яе творчасць. Прыемна і тое, што добрая слава пра нашу серыю выйшла за межы Беларусі. У прыватнасці, вядомы беларускі празаік Алесь Кажадуб, які даўно жыве ў Маскве (дарэчы, ён нядаўна ўступіў у Саюз пісьменнікаў Беларусі), таксама выказаў жаданне выдацца ў ёй.

— *Проза, паэзія — гэта, бясспрэчна, добра, але ці не атрымаецца так, што будуць абыдзены ўвагай ...*

— Можаце не працягваць. Здагадваюся, што маецца на ўвазе. Думаеце, што пакрыўдзім вашых калег — крытыкаў, краязнаўцаў? Дарэмна. Была б творчасць таго ці іншага аўтара цікавай, для яго заўсёды будуць шырока расчынены, калі можна так сказаць, дзверы нашага выдавецкага праекта.

— *І якая рэакцыя на першыя кнігі, што выйшлі ў серыі?*

— Самая станоўчая. Многія тэлефануюць, дзеляцца сваімі ўражаннямі і ў лістах. Дый ад сябе скажу. Ужо гадоў дваццаць мой раман пад назвай "Крык на хутары" (у дзвюх кнігах) не выдаваўся. А з'явіўся аднатомнік у серыі, дык пасыпаліся званкі з адзінай просьбай, каб завітаў ці ў бібліятэку, ці на Палессе, выступіў там. Бачыце, наколькі запатрабаваныя кнігі серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі", і хочацца сказаць выдавецтву, якое так цесна супрацоўнічае з намі: "Брава, "Харвест!".

— *Як бы цудоўна было, каб гэтак уважліва паставіліся да выпуску беларускай літаратуры і іншыя недзяржаўныя выдавецтвы...*

— Не магу з вамі не пагадзіцца. Каб нават толькі тыя з іх, якія ўжо трывала сталі на ногі ці становяцца, выпускалі ў год толькі дзве-тры кнігі беларускіх пісьменнікаў, дык шмат якія пытанні былі б вырашаны. Таму будзем памятаць вядомае выслоўе: надзея памірае апошняй і, узяўшы ў рукі чарговую кнігу з серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі", нязменна добрым словам успамінаць тых, хто праявіў такую важную ініцыятыву. І спадзявацца, што гэты выдавецкі праект будзе працягвацца.

**Гутарыў**
**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

**Маладзечанскі раён вядомы не толькі Вязынкай, сучасным Палацам культуры і Нацыянальным фестывалем беларускай песні і паэзіі "Маладзечна", але і людзьмі, неабыякавымі да творчага жыцця на сваёй зямлі. Добра, калі такія рупліўцы сустракаюцца ва ўладных структурах.**
**Пра культурныя традыцыі і таленты свайго краю, а таксама планы на будучае распавядае начальнік аддзела культуры Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр Рамановіч.**

# Пад васільковым небам Маладзечна

— ***Аляксандр Віктаравіч, калі ласка, колькі слоў для нашых чытачоў пра Маладзечаншчыну і яе культурныя традыцыі.***

— У 2005 годзе пасля аб'яднання раёна і горада ўзнікла адна тэрытарыяльная адзінка — Маладзечанскі раён, духоўнай сталіцай якога з'яўляецца Маладзечна. У нас дзейнічаюць Палац культуры, дзіцячая музычная школа, Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі "Маладзік", а таксама тры абласныя ўстановы: музычнае вучылішча імя М.Агінскага, абласны драматычны тэатр, абласны краязнаўчы музей.

Ёсць сваё эфірнае тэлебачанне "Наш час", якое рыхтуе перадачы пра жыццё раёна.

Маладзечаншчына, разам з Валожыншчынай і Ашмянскім раёнам, з'яўляецца пачынальнікам рэгіянальнага фестывалю-конкурсу "Адна зямля", што праводзіцца з 1999 года. За гэты час колькасць арганізатараў фестывалю ўзрасла да сямі, спраўдзіўшы спадзяванне заснавальнікаў аб'яднаць сем раёнаў, якія некалі ўваходзілі ў Маладзечанскую вобласць, у межах агульнага мерапрыемства.

Важным складнікам культурнага жыцця раёна з'яўляюцца народныя промыслы і рамёствы. Раённы Цэнтр рамёстваў, размешчаны ў вёсцы Турэц-Баяры, аб'ядноўвае аматараў керамікі, саломапляцення, мастацтва выцінанкі, разьбы па дрэве, кавальскай справы... У наяўнасці — выставачная зала, крама па продажы мастацкіх тавараў не толькі з Маладзечаншчыны, але і з іншых рэгіёнаў. Не заўсёды майстры здольныя займацца продажам сваіх твораў, таму спецыяльныя крамы дарэчы. Нядаўна ў абласным упраўленні культуры адбылася нарада, дзе было прапанавана адкрыць такія крамы ў Мінску. Акрамя таго, імкнемся развіваць прыдарожны сервіс, каб тыя, каму даводзіцца падарожнічаць па нашым краі, бачылі яго багатую культуру.

— ***Якія калектывы і якіх творцаў вы маглі б адзначыць?***

— На Маладзечаншчыне дзейнічаюць 44 калектывы, у тым ліку "заслужаныя", "народныя" і "ўзорныя". Як прыклад, магу назваць заслужаны аматарскі калектыў "Спадчына" пад кіраўніцтвам І.Сушко. Народнаму калектыву "Харашуха" хутка споўніцца 15 гадоў. Ён прадстаўляў Беларусь у Малдове, Польшчы, Расіі. Летам адзначыла свой 70-гадовы юбілей Лебедзеўская народная акадэмічная харавая капэла. Пачыналася капэла як царкоўны хор. За час, які мінуў, у калектыве паспела змяніцца некалькі пакаленняў спевакоў. Што датычыцца нашых таленавітых выканаўцаў, то хочацца ўзгадаць Алесю Кульшу, пераможцу фестывалю "Адна зямля", уладальніцу Гран-пры сёлетняга Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2007", Дзмітрыя Сяргеева, супрацоўніка Маладзёжнага тэатра эстрады, Дар'ю Урызчанку, кліпы з удзелам якой вы можаце бачыць па тэлебачанні. Насамрэч, пра таленавітыя калектывы і выканаўцаў нашай зямлі можна гаварыць вельмі доўга...

— ***Якія значныя падзеі адбыліся за гэты год у Маладзечанскім раёне?***

— Сёлета культурнае жыццё нашага краю было пазначана 125-гадовым юбілеем Янкі Купалы. Быў устаноўлены помнік пісьменніку ў г.п. Радашковічы. Праведзены работы па ўпарадкаванні тэрыторыі чацвёртага філіяла Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў Яхімоўшчыне. Там усталяваны камень з радкамі, якія напісаў пясняр, знаходзячыся ў вёсцы. Была зроблена пляцоўка на востраве аднаго з азёр, дзе адбылося святкаванне юбілею. Акрамя таго, адкрыццё вясною новага будынка сельскага клуба ў Яхімоўшчыне стала падарункам для мясцовай моладзі.

Другім важным кірункам працы гэтага года стала падрыхтоўка і правядзенне IX Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2007".

2008 год стане юбілейным для горада — Маладзечна споўніцца 620 гадоў. Цяпер ужо сфарміраваны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы свята і план па рэканструкцыі асноўных гарадскіх аб'ектаў. Плануецца рэканструкцыя чыгуначнага вакзала, асноўных вуліц горада. Ужо адноўлены будынак абласнога краязнаўчага музея. Кожнаму прадпрыемству будзе дадзена магчымасць далучыцца да падрыхтоўкі юбілею — аздобіць фасады сваіх будынкаў. У горадзе плануецца зрабіць некалькі святочных пляцовак, зладзіць урачыстае шэсце ад кожнага мікрараёна...

*Дарэчы, многія мерапрыемствы, якімі вядомы Маладзечанскі раён, адбываюцца ў Палацы культуры, што лічыцца "візітнай карткай" горада. У канцэртнай дзейнасці маладзечанскага Палаца прымаюць удзел 36 калектываў, адзін з якіх мае званне "заслужанага", а астатнія — "народных" і "ўзорных". Актыўна працуюць на культурнай ніве заслужаны аматарскі калектыў "Спадчына", узорная эстрадная студыя "Жывы гук", харэаграфічны ансамбль народнага танца "Белыя крылы" і г.д. Палац культуры дапамагае людзям рознага ўзросту рэалізаваць свае магчымасці ў музычным, харэаграфічным, тэатральным, выяўленчым, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Для гэтага заснаваны гурткі, клубы, студыі, дзе кожны можа падабраць сабе занятак даспадобы. Такім прыкладам з'яўляюцца клубнае аб'яднанне "Майстар", студыя бальнага танца "Каскад", клуб творчай моладзі "Шарм" і г.д.*

*Чарговым значным дасягненнем можна лічыць прэм'еру ў красавіку гэтага года оперы "Іяланта", пастаноўку якой ажыццявілі работнікі Палаца культуры і навучэнцы Маладзечанскага музычнага вучылішча.*

**Ганна КОТ**

# Спадчына

**Фонд Уладзіміра Караткевіча ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва папоўніўся новымі матэрыяламі. Імі сталі больш як сто рукапісаў (лістоў, вершаў, малюнкаў, дарчых надпісаў на кнігах "Матчына душа", 1958; "Вячэрнія ветразі", 1960; "Блакіт і золата дня", 1961), 11 фотаздымкаў, якія ў 1954 — 1963 гады пісьменнік даслаў ці падарыў свайму сябру Юрыю Канстанцінавічу Гальперыну (1930 — 1994). З расійскага горада Тулы іх прывезла і перадала архіву-музею Таццяна Юр'еўна Куляшова, дачка Ю. Гальперына.**

Ураджэнец Расіі, Ю. Гальперын у 1949 — 1954 гады вучыўся ў Мінску на будаўнічым факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута. З Уладзімірам Караткевічам, спачатку завочна, пазнаёміўся праз яго і сваіх сяброў Валянціна Краўца і Станіслава Карпенку, якія ў той час таксама вучыліся ў політэхнічным інстытуце.

У кароткай біяграфіі, прыкладзенай да гэтых матэрыялаў, Т. Куляшова паведаміла, што ў 1937 годзе бацькі Ю. Гальперына былі рэпрэсіраваны: спачатку арыштавалі і расстралялі бацьку, а потым арыштавалі і прысудзілі да васьмі гадоў пазбаўлення волі маці. У сямігадовым узросце хлопчык застаўся без бацькоў. Да 1945 года ён жыў у бацькавай маці ў Ерэване, а пасля вызвалення маці пераехаў

да яе ў пасёлак Інта (Комі АССР), дзе яна знаходзілася на пасяленні. Там закончыў сярэднюю школу.

Адносна паступлення Ю.Гальперына ў Беларускі політэхнічны інстытут Т. Куляшова піша: "Гэта быў вымушаны крок, бо збіраўся ён паступаць у МГУ на філалогію — яго любімымі прадметамі заўсёды былі руская мова і літаратура. Аднак "сыну ворагаў народа" ды яшчэ з яўрэйскім прозвішчам дарога ў сталічны універсітэт была зачынена, што яму далі зразумець у прыёмнай камісіі МГУ, дзе дарэчы, параілі паспрабаваць шчасця ў адной з саюзных рэспублік. Так Юрый Канстанцінавіч трапіў у Беларусь". І хоць рускай філалогіі ў Беларускім політэхнічным інстытуце не было, Ю. Гальперын, як слушна адзначае далей Т. Куляшова, "атрымаў магчымасць пазнаць, палюбіць і вывучыць беларускую мову, пазнаёміцца з беларускай літаратурай, архітэктурай, мастацтвам. Ён на ўсё жыццё палюбіў Мінск, сувязь з Беларуссю падсілкоўвала яго да апошніх дзён жыцця".

Перададзеныя ў архіў-музей лісты У. Караткевіча напісаны ў той час, калі ён уваходзіў у літаратуру і сталеў як пісьменнік. Спачатку, пасля заканчэння Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі, ён працаваў настаўнікам у вёсцы Лесавічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці (1954 — 1956), а потым у роднай Оршы (1956 — 1958). Ю. Гальперын пасля заканчэння Беларускага політэхнічнага інстытута працаваў у 1954 — 1958 гады спачатку інжынерам-будаўніком, а потым начальнікам будаўнічага ўпраўлення ў горадзе Коспаш Кізелаўскага раёна Молатаўскай (зараз Пермскай) вобласці. І калі летам 1957 года аршанская раённая газета "Ленінскі прызыў" арганізавала цкаванне У. Караткевіча за яго вершы, то Ю. Гальперын даслаў у Мінск, у часопіс "Полымя", артыкул "Заганныя вершы або заганная крытыка?", дзе бараніў свайго сябра (артыкул, напісаны, дарэчы, на беларускай мове, не быў надрукаваны).

У 1958 годзе Ю. Гальперын з сям'ёй пераехаў у пасёлак Ліпкі Тульскай вобласці, дзе пасля заканчэння тэрміну пасялення было дазволена жыць яго маці. З таго часу і да выхаду на пенсію па інваліднасці ў 1987 годзе працаваў у будаўнічых арганізацыях Тулы. Сям'я Ю. Гальперына перабралася ў Тулу, калі атрымала там жыллё.

У. Караткевіч, падчас вучобы ў Маскве на Вышэйшых літаратурных курсах, у кастрычніку 1958 года наведаў свайго сябра ў Туле. Ю. Гальперын таксама неўзабаве наведаў У. Караткевіча ў Маскве. Сустракаліся яны і вясной 1963 года ў Мінску.

Думаецца, што У. Караткевіча і Ю. Гальперына ядналі глыбокая духоўнасць, высокая маральнасць і энцыклапедычныя веды. Лісты У. Караткевіча, адрасаваныя свайму сябру, яскрава пра гэта сведчаць.

Ю. Гальперын любіў і высока цаніў творчасць У. Караткевіча. У сярэдзіне 80-х гадоў, пасля смерці У. Караткевіча, ён выказаў глыбокую зацікаўленасць да выдання творчай спадчыны пісьменніка. Я напісаў пра гэта яго сястры Наталлі Сямёнаўне Кучкоўскай. Яна дала мне адрас Ю. Гальперына. Я як укладальнік будучага першага тома Збору твораў У. Караткевіча ў васьмі тамах (1987 — 1991) атрымаў ад Ю. Гальперына не толькі лісты, напісаныя на цудоўнай беларускай мове, у якіх ён выказаў глыбокую дасведчанасць у паэзіі У. Караткевіча, але і рукапісы многіх яго паэтычных твораў, якія раней не друкаваліся. Дзякуючы Ю. Гальперыну ў першым томе Збору твораў у васьмі тамах У. Караткевіча былі ўпершыню апублікаваны 18 яго паэтычных твораў ("Калумбы зямлі нязнаемай", "Калі ў жамчужніцу пылінка трапіць", "Перакаці-поле", "Мастакам" і інш.). Я даслаў Ю. Гальперыну ўсе восем тамоў У. Караткевіча, а таксама некаторыя творы пісьменніка, якія былі ўпершыню апублікаваны ў другой палове 80 — пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Варта адзначыць, што ён пераклаў на рускую мову і надрукаваў вершы У. Караткевіча "І зашумяць асіны над ракою", а таксама "Дзіва на Нерлі".

Ю. Гальперын часткова апублікаваў лісты У. Караткевіча, дасланыя яму, у часопісе "Нёман" (1989, № 2; 1991, № 7). Збіраўся перадаць рукапісную спадчыну У. Караткевіча ў Беларусь. Але не паспеў.

Ю. Гальперын быў сапраўдным сябрам У. Караткевіча. Таму заклікаю ўсіх сяброў і знаёмых У.Караткевіча, у каго ёсць рукапісы твораў, малюнкі, фотаздымкі, дарчыя надпісы на кнігах ды іншыя матэрыялы пісьменніка, перадаць іх ці іх ксеракопіі ў архівы — Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, хатні архіў У. Караткевіча, Аршанскі музей У. Караткевіча.

Гэта паспрыяе не толькі іх надзейнаму захаванню, але і паўнейшай падачы спадчыны славутага пісьменніка ў яго будучым Зборы твораў, скажам, у 25 тамах. А пра такое выданне ўжо зараз трэба дбаць.

**Анатоль ВЕРАБЕЙ**

***На здымках: Г. Жукава, Т. Куляшова, Г. Запартыка і А. Верабей; Ю. Гальперын, Г. Кравец, У. Караткевіч. 1963 год.***

**Шчыра кажучы, рыхтуючы гэтую публікацыю, я пачувалася даволі няёмка. Найперш таму, што кнігу Людмілы Рублеўскай "Шыпшына для Пані" папрасіла асабіста ў аўтара... Выданне я ўбачыла выпадкова, у аднаго з калег па працы. Па-хуткаму перагартала, прачытала некалькі вершаў, якія мяне проста-такі заваражылі... Вырашыла, што гэта кніга не толькі заслугоўвае ўвагі, але і патрабуе розгаласу, шырокай прапаганды. І вось, урэшце, атрымала зборнік... Аднак уважлівае прачытанне паэтычных твораў выклікала нечаканыя эмоцыі, нават пэўны супраціў.**

# Смак шыпшыны

Квецень шыпшыны, якую ў прастамоўі яшчэ называюць дзікай ружай, цяжка абмінуць увагай... П'янкі водар вабіць, чаруе... Ды і ў пару спеласці, калі асыпаюцца духмяныя пялёсткі, шыпшына не страчвае свае ўрачыстае прыгажосці — убіраецца ў барвовыя каралі ягад.

Шыпшына, карэнная жыхарка беларускіх ландшафтаў — годная, гордая, незалежная прыгажуня, — у літаратуры традыцыйна сімвалізуе вобраз Бацькаўшчыны. У прозе гэты сімвал найперш увекавечыў Кузьма Чорны ("Пошукі будучыні"), у паэзіі — Уладзімір Дубоўка ("О Беларусь, мая шыпшына..."). Гэтым ганаровым сімвалам пазначаны і зборнік паэтычных твораў і эсэ Людмілы Рублеўскай "Шыпшына для Пані". Назва, безумоўна, прыгожая — рамантычная, узнёслая, гаваркая...

Кніга складаецца з дзесяці раздзелаў, кожны з якіх мае ў назве ключавое слова "сад": "Сад камянёў", "Сад скрыжавання", "Сад храма", "Сад агню" і г.д. Кожны раздзел пачынаецца з эсэ, якое па-свойму вызначае і вытлумачвае далейшыя паэтычныя рэфлексіі аўтара.

Паэзія Людмілы Рублеўскай пакідае супярэчлівыя ўражанні... З аднаго боку — не могуць не выклікаць прыхільнасці ўрачыстыя радкі, што ўслаўляюць слынных прадстаўнікоў нацыянальнай гісторыі. Ян Баршчэўскі, Валянцін Таўлай, Апанас Філіповіч, Францыск Скарына, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Зоська Верас, Вінцэнт Каратынскі, Максім Багдановіч і шмат іншых вядомых дзеячаў мінулага Айчыны атрымалі паэтычную прысягу сучаснай прадаўжальніцы іх высакароднай справы. Што ж, беларуская паэзія заўжды натхнялася гісторыяй, гераічным пафасам мінуўшчыны, незабыўнымі імёнамі продкаў. Бо гісторыя наша сапраўды ведае шмат прыкладаў ахвярнага служэння Айчыне, пакутніцкіх лёсаў, пакладзеных на алтар будучыні...

Аднак дзіўны душэўны дысананс узнікае ў час чытання вершаў Людмілы Рублеўскай... Танальныя рэгістры, пераважна мажорнае гучанне твораў — нагадваюць то вядомыя араторыі, то калядныя касцёльныя гімны, што выконваюцца ў суправаджэнні арганнай музыкі. У іх чуецца шматгалоссе папярэднікаў, што прысягалі на вернасць Радзіме, услаўлялі Бацькаўшчыну... Улюбёныя вобразы Людмілы Рублеўскай — рамантычныя пані і рыцары, высакародныя дамы і князі, біблейскія персанажы і годныя самаахвярныя асветнікі. Вершы аздабляе чароўны рамантычны антураж — крышталь, мармуровыя анёлы, кароны, вэлюмы, карункі, золата, срэбра, лампады, свечкі, люстры, дыяменты... Толькі вось настроі ў вершах пануюць пераважна змрочныя, скрушныя, глыбока песімістычныя, не "за здравие", а ўсё больш "за упокой"...

*Як да смерці блізка,*
*так да шчасця блізка.*
*Звадкаў і выпадкаў*
*дзе парвецца нізка?*
*Кожны крок — па дроце,*
*кожны ўздых — на вецер.*
*Хоць да шчасця блізка,*
*ды бліжэй — да смерці.*

На фоне барочных дэкарацый — смерць і боль, бясконцыя страты і ахвяры, журба і развітанне, расчараванні, здрады, крушэнне ілюзій, забойствы, хваробы... і кроў... кроў... кроў... Эсхаталагічныя матывы, інфернальная сімволіка, пахавальны пафас быццам бы рэфрэнам сцвярджаюць: "пакінь надзею...". Пачуццё, якое ўзнікае ў час чытання кнігі, у чымсьці прыпадабняецца да таго, якое адчуваеш на могілках, блукаючы сярод крыжоў і каменных помнікаў — душэўная вусцішнасць, разуменне незваротнасці быцця, бессэнсоўнасці існавання, зямнога тлену...

*І змяшаецца смерць назаўсёды*
*з блакітнай крывёй...*
*І ляцяць над мястэчкам*
*іскрыстыя Штрауса вальсы,*
*А званы на мясцовай званіцы*
*цяжкія, як лёс.*
*Не заўважаць вас нават,*
*бязродныя кветкі-прыкрасы,*
*У гнілой каляіне ад бедных*
*сялянскіх калёс.*

Бясконцая ідэалізацыя і паэтызацыя асоб блакітнай крыві... Складваецца ўражанне, што Беларусь — гэта рэзервацыя ці, дакладней, рэзідэнцыя каранаваных персон, носьбітаў усялякіх ганаровых тытулаў. Усе яны — каралі, князі, вяльможныя паны і рыцары — змагаліся выключна за Беларусь. Аднак аб'ектыўнага ўяўлення пра вобраз краіны, пра яе насельнікаў, за якіх ахвяравалі жыццямі слаўныя ваяры, па кнізе Людмілы Рублеўскай не атрымаеш. Ніводнага верша не сустрэлася ў зборніку, дзе б казка саступіла месца былі, дзе б адчулася стыхія народнага жыцця... Тут няма месца сапраўднай Беларусі, ні са свечкай, ні з лампадай яе не знойдзеш... Нават пейзажныя вобразы, уласцівыя краіне лясоў, рэк і азёр, сустракаюцца ў вершах вельмі рэдка, быццам выпадкова. Аўтарская канцэпцыя гісторыі пэўным чынам супярэчыць жывой рэальнасці, эпічныя малюнкі дэманструюць эпізоды, уласцівыя, хутчэй, заходнееўрапейскай гісторыі прыкладна XV — XVI стагоддзяў. Узнікае прыкрае адчуванне, што аўтарка нібыта саромеецца рэальнага мінулага, грэбліва адасабляецца ад вясковай нацыі...

*Трава не расце там,*
*Дзе крочыць прывыклі*
*натоўпы,*
*Таму я заўсёды ідy*
*па высокай траве.*
*Сабачая ружа*
*Квітнеецца ў цэнтры*
*Еўропы.*
*Пад пышным кустоўем*
*Паэт непрызнаны жыве.*

У рэшце рэшт у творах вымалёўваецца нейкая зусім не-беларуская, хутчэй, штучная хімерная этнакультура.

Не менш змрочная рэфлексія і адчувальны снабізм уласцівыя вершам Людмілы Рублеўскай, якія актуалізуюць праблему мастака і мастацтва.

*Калі пішуцца вершы,*
*то можна ўміраць паступова,*
*Смерць па кроплі смакуючы,*
*быццам бы мёд і цыкуту.*
*І вітацца з аднымі крыжамі,*
*і верыць у слова,*
*І забыцца на тое,*
*што кроў твая стала атрутай.*
*Калі пішуцца вершы,*
*то можна не лгаць пра адзінства*
*Між сабою і кожнай быдлячай*
*асобай на свеце.*

Відаць, сапраўды незваротна адыходзяць тыя часы, калі творцы найперш сцвярджалі, што "паэт — слуга слугі ўсякай...", а ўжо потым "паэт і цар усіх царэй". Сучасны паэт без ілжывай сціпласці бярэ на ўзбраенне адно другую частку фразы... Між іншым, у вядомага даследчыка паэзіі Рыгора Бярозкіна ёсць такая заўвага: "Аўтарытэт і значэнне паэзіі, яе месца ў агульным чалавечым сужыцці нельга ўзвысіць інакш, як толькі прызнаўшы, што ў свеце існуе незлічоная колькасць з'яў, вышэйшых за паэзію, і што яна — вытворнае ад гэтых з'яў, ад найпершага і найгалоўнейшага пытання: як жывуць людзі і што зрабіць, каб ім жылося лепш. Пазбаўце паэзію гэтага абавязку <...>, і ў ёй запануюць розныя эстэтычныя паліятывы: безадносная да ўсякага зместу самацэнная "навізна", кан'юнктурная надзённасць, шаманства"...

Не магу не падзяліцца яшчэ адной прыватнай асацыяцыяй, якую навейваюць вершы Людмілы Рублеўскай. Мажліва, гэта толькі маё суб'ектыўнае ўражанне, але даволі часта падаецца, што ў творах беларускай аўтаркі гучыць рэха паэзіі "сярэбранага веку", найперш, Марыны Цвятаевай. Чуецца сугучнасць матываў, вобразаў, ладу мыслення, самаасэнсавання... Калі Цвятаева прарочыла: "Моим стихам, как драгоценным винам, // Настанет свой черёд", то беларуская аўтарка гэтаксама пераканана: "Няхай маё імя забудуць звыкла, // Я буду жыць у тым, што запішу". Што датычыць славутых імёнаў продкаў, камянёў, срэбра і магіл, то па іх колькасці наша паэтка значна пераўзыходзіць рускую калегу па цэху. Ёсць, праўда, паміж імі істотная розніца... Сямён Букчын у прадмове да зборніка выбраных твораў Марыны Цвятаевай падкрэсліваў: "Есть стихотворцы, сочиняющие, старательно придумывающие себе биографию, играющие в неё, — их много. И есть те, у которых биография — постоянная напряжённая жизнь в поэзии, естественное продолжение и воплощение материального бытия". Уся біяграфія рускай паэтэсы — ганенні ўладаў, эміграцыя, паламанае асабістае жыццё — давала падставы для нараджэння пэўных паэтычных вобразаў і вызначала пафас творчасці.

У анатацыі да зборніка Людмілы Рублеўскай "Шыпшына для Пані" адзначаецца: "Вобраз Пані — улюбёны вобраз паэзіі Людмілы Рублеўскай, яе альтэр эга, рамантычная творчая жанчына, датклівая і чуллівая, здольная на самаахвяраванне ў імя кахання, яна адчувае сябе чужой у сваім часе і пакутліва шукае ўзаемаразумення". Справа ў тым, што любая абраная маска, гульня ці "ў пані", ці "ў ахвяру" заўжды будуць заставацца маскай і гульнёй — ненатуральным і штучным карнавальным уборам... Беларуская пяснярка — асоба публічная, вядомая, паспяховая. Паспяховая і ў творчасці (ці шмат хто з сучасных пісьменнікаў сёння можа пахваліцца ёмістым стосікам кніг на паліцах сталічных кнігарняў?), і ў асабістым жыцці, і ў прафесійна-грамадскім... Як па мне, то ў паэзіі пані Людмілы зашмат тэатральных эфектаў, пакутніцкіх інтанацый, надрыўнага пафасу, "крамольных" прызнанняў...

*Я свой крыж не ўсцягнула*
*і да палавіны дарогі.*
*Я лічыла аблокі,*
*лавіла абдоймамі вецер*
*І ні разу ў зямной баразне*
*не запэцкала ногі.*

Нягледзячы на старажытны антураж, спавядальныя маналогі, што гучаць у вершах Людмілы Рублеўскай, міжволі правакуюць ва ўяўленні малюнкі сучаснай рэчаіснасці... Сытыя, забяспечаныя, самадастатковыя палітыкі ўзлазяць на трыбуну ці выходзяць наўпрост да галоднага знерваванага натоўпу і прысягаюць на вернасць, клянуцца змагацца за яго, не шкадуючы жывата свайго...

Дарэчы, пра шыпшыну... Яркая, пунсовая, вабная ягадка... Аднак яна не наталяе смагі, больш таго... Спакусіўшыся вонкавым хараством, маеш магчымасць пакаштаваць шорсткага начыння...

**Лада АЛЕЙНІК**

# «Адмыслоўцы» і родныя слоўцы




Сказаць папраўдзе, слова "адмыслоўцы", як і ўтворныя ад яго — "адмысловы", "адмыслова" ды іншыя з гэтага шэрага, мне не асабліва падабаюцца. Тут, як кажуць, нікуды не падзенешся: такая вось у мяне "філязофія". Але прачытаў кніжку Васіля Рагаўцова, што так і называецца — "Адмыслоўцы" (выдавецтва "Кнігазбор"), і, таксама шчыра прызнаюся, стаўленне да гэтага слова ў мяне змянілася.

Не таму, што аўтар яе — знакаміты беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, да меркавання якога нельга не прыслухацца, хоць і гэтага немагчыма адмаўляць. Прычына ў тым, што мяне ўразіў верш "У музеі этнаграфіі", а слова "адмыслоўцы" акурат у ім і сустракаеш.

Пра што гаворка ў ім пойдзе, няцяжка здагадацца. Гэтаксама адразу ўпэўніваешся, што твор толькі выйграе ад удалага выкарыстання В. Рагаўцовым формы дыялога. Са зместу верша, праўда, цяжка здагадацца, хто з дарослых задае школьнікам пытанні, каб даведацца, наколькі яны ведаюць старыя рэчы. Хутчэй за ўсё настаўнік, ды ад гэтага сутнасць не мяняецца. Куды важней, што праз гэтыя пытанні даведваешся, наколькі некаторыя сучасныя дзеці, для якіх ужо і камп'ютэр не з'яўляецца чымсьці незвычайным, добра арыентуюцца ў традыцыйным укладзе жыцця беларусаў:

*— А ты, што, Зміцер, скажаш пра калёсы?*
*— На іх вяскоўцы год калёсяць:*
*Салому возяць, бульбачку, авёс...*
*— А што вось гэта?*
*— Колы, вось.*
*— А што яшчэ ў калёсах ёсць?*
*— Ці можна мне? — сказаў Антось.*
*— Ну, калі ласка!*
*— Кузаў для перавозкі грузаў.*
*Пятрок дадаў: — Яшчэ ў калёсах*
*Аглоблі ёсць і ёсць атосы.*

Не сумняваюся, што і іншыя хлопчыкі і дзяўчынкі, прачытаўшы гэты твор В.Рагаўцова, назаўсёды запомняць, як называюцца пэўныя часткі ў сялянскім возе. Тады застанецца толькі парадавацца іхняй дасведчанасці:

*...Ну й хлопцы!*
*Проста адмыслоўцы!..*
*Нібы сапраўдныя вяскоўцы.*

Зборнік "Адмыслоўцы" — невялікі памерам. Толькі хіба абавязкова прапаноўваць дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту штосьці аб'ёмнае? Дастаткова, каб у кніжцы можна было напаткаць творы, якія б запомніліся, пашырылі кругагляд малечы. На шчасце, такія творы ў В.Рагаўцова ёсць. І не столькі традыцыйныя вершы, колькі тыя, у якіх абыгрываюцца аднолькавыя ці блізкія па гучанні словы. Як вядома, у нашай дзіцячай паэзіі ў гэтым кірунку плённа працуюць Уладзімір Мазго, Уладзімір Мацвеенка, Міхась Пазнякоў...

Прачытаў "Адмыслоўцаў", і на душы пасвятлела. Адмыслова піша В. Рагаўцоў. Так, што адчуваеш усю чысціню і харство родных слоўцаў.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# «Вожык», №1/2008

**У часопісе адразу прадстаўлены творы чатырох слынных пісьменнікаў-юбіляраў. Навум Гальпяровіч і Васіль Ткачоў адзначаюць 60-годдзе, Мікола Чарняўскі — 65-годдзе, а Іван Аношкін — 80!**

Наогул жа нумар багаты на пісьменніцкія імёны: Юлія Зарэцкая, Міхась Сліва, Янка Галубовіч, Уладзімір Мацвеенка, Міхаіл Уласенка, а таксама пачынаючыя аўтары з розных рэгіёнаў рэспублікі і шматлікія чытачы друкуюць на старонках часопіса свае фельетоны, вершы, апавяданні ды творы для дзяцей на старонцы юных чытачоў "Вясёлы калючык".

Як заўсёды, нумар багата ілюстраваны. Побач са знакамітымі мастакамі-карыкатурыстамі Алегам Гуцолам, Аляксандрам Каршакевічам, Міколам Гіргелем, Алегам Паповым, Андрэем Слуцкім, Пятром Козічам, Аркадзем Гурскім і іншымі прадстаўляюць свае карыкатуры Раман Шык і Алег Курпік.

Часопіс запрашае чытачоў прыняць удзел у новых двух конкурсах. У якіх — вы даведаецеся, пазнаёміўшыся са свежым нумарам.

**Уладзімір ПЯТРОЎ**

# Па-за людзьмі і часам, альбо Крыху пра штучную фантастыку

Міхась ЮЖЫК

ГОРАД, ЯКІ ЯНЫ ЗАСЯЛІЛІ

Фантастычная аповесць

**З цікавасцю сачу за беларускай прозай у галіне фантастыкі. У гэтым плане ўвагу прыцягвае творчасць Міхася Южыка. Пісьменнік без перабольшвання сцвердзіў сябе як цікавы аўтар. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца яго аповесці і раманы, што рэгулярна змяшчаюцца на старонках часопісаў "Полымя" і "Маладосць". Проза М. Южыка прываблівае белетрызаваным зместам, тонкай псіхалогіяй, ідэйным пошукам — тым, што складае чытэльнасць любога мастацкага тэксту. Сярод твораў апошняга часу хацелася б спыніцца на фантастычнай аповесці пісьменніка "Горад, які яны засялілі", апублікаванай у № 10 часопіса "Маладосць" за 2007 год.**

Жанр твора можна ўспрымаць умоўна, паколькі сёння да яго адносяць усё, што не адпавядае рэальнасці ў звыклым (зямным) вымярэнні і адпаведным тлумачэнням з боку фізічных законаў матэрыяльнага свету. Агульнавядома: фантазія здольнага пісьменніка здольная завесці ў такія непралазныя гушчары паралельных вымярэнняў і філасофска-псіхалагічных росшукаў, аспрэчыць якія, як і пацвердзіць, немагчыма пры ўсім жаданні. У падобнай сітуацыі ад аўтара патрабуецца вялікая ўважлівасць, каб не заблытацца ва ўласных лабірынтах штучнага іншасвету, змадэляванага па асабістым сцэнарыі. Інакш ідэальны чытач будзе (у лепшым выпадку) усміхацца з прафесійнай некампетэнтнасці пісьменніка-фантаста. Ці атрымалася М. Южыку звесці канцы з канцамі ў сваёй выдуманай гісторыі? Паглядзім.

Аповед у творы вядзецца ад першай асобы, што падкупляе адчувальнай шчырасцю аўтара. Галоўны персанаж аповесці — настаўнік роднай мовы і літаратуры, жыхар стандартнага райцэнтра з дзесяцітысячным насельніцтвам і адпаведным правінцыйнамяшчанскім *кліматам*. Больш за тое — гэта тыповы мізантроп з паталагічнай саманезадаволенасцю, які верыць у месійнасць уласнай персоны сярод шэрага натоўпу безаблічных гома сапіенсаў. М. Южык не ідэалізуе свайго "паддоследнага". Псіхалагічны партрэт персанажа-чалавеканенавісніка атрымаўся досыць пераканаўчым, што сведчыць пра адпаведнае майстэрства аўтара.

Настаўнік здзейсніў антыпедагагічны ўчынак: трохі пакалашмаціў у школьным туалеце вучня, паводзіны якога раздражнялі непрыхаваным хамствам і маральнай разбэшчанасцю. Бывае. Сучасныя падлеткі падарвуць нават спрактыкаваную нервовую сістэму. Настаўніку не падабаецца не столькі тое, што вучань курыць і карыстаецца павышанай папулярнасцю ў дзяўчат, колькі яго непавага да роднай мовы. Пасля непрыгожага ўчынку ў персанажа прачынаецца сумленне і пачынаюцца "раскольнікаўскія" хваравітыя пакуты на тэму "каб ніхто не даведаўся".

Дваццацісямігадовы мужчына ненавідзіць цэлы свет: работу, якая не дазваляе сцвердзіцца-самарэалізавацца як геніяльнаму літаратару; сястру, здолеўшую выдатна ўладкаваць жыццё ў замежнай краіне; горад, дзе вымушаны жыць і трываць штодзённыя сустрэчы з абмежаваным правінцыйным людам... Псіхалагічныя перажыванні падобнага кшталту завядуць у быційны тупік любога чалавека. Не выратоўвае мужчыну нават дзяўчына, з якой ён прынцыпова падтрымлівае выключна пасцельныя зносіны, адкідваючы думкі пра стварэнне сям'і як мага далей. І сапраўды: навошта патэнцыяльнаму генію банальная *непатрэбшчына*? Ён вышэй за грэшную бытавуху, звыклую *шызабудзённасць*, спрадвечны ход неўміручага часу... Ён па-за людзьмі і па-за часам. Так урэшце і атрымалася.

Пасварыўшыся з-за ўласнага глупства з дзяўчынай ды заглушаючы антыпедагагічны ўчынак, персанаж напіваецца да бяспамяцтва. А ранкам прачынаецца і са здзіўленнем высвятляе, што застаецца ў ненавісным райцэнтры адзін. Астатнія жыхары бясследна знікаюць. Электрычнасць адсутнічае, вада таксама, тэлефон не працуе... На дварэ — вечна пахмурны лістападаўскі дзень з невыносным пахам прэлай лістоты... Словам, апакаліпсіс лакальнага маштабу.

Вырвацца з горада чалавеку не ўдаецца: стрымлівае нейкая сіла. У крамах і кафэ — пуста. Як жыць? Куды ўсе падзеліся? Сітуацыя займальная. Персанаж твора ў паніцы.

Неўзабаве аказваецца, што кожную ноч горад ажывае: запальваюцца вулічныя ліхтары, вокны суседніх дамоў, працуюць крамы, з'яўляюцца людзі-здані... На жаль, наладзіць з імі кантакт чалавеку не ўдаецца. Яго бясплатна кормяць у рэстаране, даюць харчовыя прадукты... Жыві — і радуйся! А хочацца плакаць... І так штодзень...

Паводле аўтарскай задумы, *"для кожнага прадугледжаны свой горад — той, які заслужыў"*. У нашым выпадку — гэта шараговы райцэнтр, дзе жыццё персанажа нагадвае ссылку (прычым вечную) за непрыгожыя ўчынкі. Але для такога жорсткага здзеку з чалавека, вымушанага блукаць па бясчассі, аўтару варта было б падабраць больш прадуманую і лагічную аргументацыю, якой яўна бракуе. Хіба мала ходзіць па зямлі мізантропаў, падобных да персанажа аповесці? У чым ягоная выключнасць? Ён не маньяк, не забойца, не аферыст і нават не чыноўнік-прайдзісвет, па якіх плача турма... Гэта чалавек з абвостраным адчуваннем людскога грэхападзення, душэўным разладам ды неспатольнай прагай нешта змяніць у сваім беспрасветна-манатонным існаванні, няхай і за кошт іншых. Персанаж не быў гатовы да непрадбачаных наступстваў, падрыхтаваных рокам, а верагодней — аўтарскай задумай, якая дзеля сцвярджэння маральна-дыдактычных банальнасцей адправіла яго ў іншасвет, дзе пануе тая ж трагічная раз'яднанасць паміж людзьмі, што і на зямлі.

М. Южык пайшоў па лініі найменшага супраціву: замест таго, каб нешта тлумачыць дапытліваму чытачу, пісьменнік штучна перамясціў персанажа з адной рэальнасці ў іншую. Узнікае заканамернае пытанне: якім чынам гэта адбылося? Механізм пераходу ў іншыя вымярэнні не выпісаны, ён проста адсутнічае. Сёння ты *тут*, а заўтра можаш быць ужо *там*. Для гэтага дастаткова *пасварыцца* з цэлым светам і ў бескампрамісным запале адправіцца ў безнадзейную вандроўку за прывіднай марай. Загадкавая ісціна патанае яшчэ ў большай загадкавасці. *"Мы не ў змозе памагчы адно аднаму ў гэтым горадзе, усё трэба было рабіць значна раней — на зямлі"*, — горка канстатуе пісьменнік-"пастыр" вуснамі персанажа. Што канкрэтна рабіць, застаецца толькі здагадвацца. Напэўна, любіць адзін аднаго... Карацей кажучы, жыць па біблейскіх запаветах. А калі не атрымліваецца, шыбуй, калі ласка, у горад зацятых мізантропаў і невылечных адзінотнікаў. Больш за тое, успрымай пакаранне адэкватна ўласнай грахоўнасці, г.зн. змірыся і не наракай на лёс. Ад заслужанага не ўцячэш. Падобная трактоўка ў духу дагматычна-кананічных пропаведзей спараджае адвечную палеміку наконт чалавечай прысутнасці і задачы на зямлі. Персанажа аповесці не варта асуджаць за яго "ўпадніцкую" жыццёвую філасофію без адрыву ад знешніх абставін, з якімі даволі часта вымушаны весці барацьбу, церпячы паразу за паразай.

Я спадзяваўся, што М. Южык закончыць твор больш нестандартна. Лягчэй за ўсё пакінуць чалавека ў выклятым горадзе, чым прыдумаць арыгінальную развязку, нават без налёту фантастычнага штукарства. Нязграбная канцоўка, дакладней яе адсутнасць, "змазвае" агулам увесь твор, нягледзячы на тое, што аўтар прапануе кожнаму прадоўжыць яго па-свойму. Персанаж застаецца ў халоднай кватэры сам-насам з пішучай машынкай, каб занатоўваць асабістае жыццё ў мастацкай форме, спадзеючыся *"быць прачытаным"*. Гэта адзіная надзея, якую пакінуў чалавеку аўтар. Хоць няма нічога страшнейшага, як бясконца пісаць у стол. Да чаго ўрэшце давядзе падобная сізіфава праца — невядома. Спісанне грахоў — працэдура пакуль нявытлумачаная і не пацверджаная дакументальна.

Тым не менш, не зважаючы на штучныя мастацкія прыёмы для перадачы задумы, М. Южык з'яўляецца даволі перспектыўным беларускім празаікам, ідучы ў шэрагу з Ю. Станкевічам, А. Казловым, Г. Аўласенкам, У. Сцяпанам etc., якія належаць да генерацыі таго літаратурнага пакалення, якому ўласцівы абвостранароздумны пошук у вырашэнні праблем сучаснага свету праз прызму традыцыі і наватарства, а таксама ўласнага жыццёвага вопыту эпохі непрадказальнай глабалізацыі. Найперш у духоўнай сферы, дзе пачынае дзейнічаць новая псіхалагічная мадэль чалавечых паводзін.

**Сяргей ГРЫШКЕВІЧ**

**Сіла зла, злога слова забівала, нявечыла заўсёды.
Страшная гэта тэма, цяжкая псіхалагічна, невыносная, бо даводзіцца ж чужое гора ўспрымаць, як сваё, асабістае, а з іншага боку — даследчык заўсёды знаходзіцца ў зоне "рызыкі". Аўтару кнігі "Праклятыя словам" (Бабруйск, 2006) доктару філалагічных навук, прафесару Аляксею Ненадаўцу давялося шмат пахадзіць па Беларусі, выслухаць сотні жахлівых гісторый, звязаных быццам бы з праклёнамі, сустрэцца з тымі, хто на сабе адчуў уздзеянне адмоўных сіл і слоў.**

# Па суседстве са злом

Са сцвярджэнняў даследчыка вынікае, што многія людзі (ягоныя рэспандэнты, інфарматары) знаходзіліся ў свой час у сітуацыі, калі для іх жыццё кожны міг магло змяніцца смерцю, а смерць... жыццём. Іхнія аповеды валодаюць настолькі вялікай энергетычнай сілай, што нават праз дзесяцігоддзі перададзеныя імі сцэны і апісанні падзей не даюць магчымасці спакойна заснуць. Як падкрэслівае Аляксей Міхайлавіч, многае залежыць і ад умення распавядаць пра такія здарэнні.

Вельмі цікава чытаюцца тыя старонкі кнігі, дзе даследчык разважае пра праклёны і іх уздзеянне. Часам высновы, якія робіць А. Ненадавец, падаюцца супярэчлівымі, але гэта толькі на першы погляд, бо, паглыбіўшыся ў чытанне, разумееш, што аўтар імкнуўся ісці следам за матэрыялам. Вучоны нібы назірае за тым, як разгортваліся падзеі, і дзе-нідзе проста ўзмацняе патрэбную яму пазіцыю, каб паказаць, што ж атрымалася ў выніку. Ён згадвае: "Многае з гэтых падзей мне даводзілася, паўтаруся, бачыць, чуць, прыслухоўвацца да таго, як іх характарызавалі іншыя людзі. І яшчэ адна акалічнасць: на злыя, бесчалавечныя паводзіны некаторых з вяскоўцаў указвалі астатнія сяляне — знаёмыя мне і незнаёмыя. Прыводзіліся канкрэтныя даты і факты, "пачатак адліку злога праклёну", у той ці іншай гісторыі, зноў-жа, згадваліся абавязковыя сведкі". Нам падаецца, што раздзел "Зло нараджае зло" з'яўляецца самым тэарэтычна абгрунтаваным. У ім аўтар паказвае сябе не толькі выдатным знаўцам народнай медыцыны, фальклору і міфалогіі, але і традыцыйнай псіхалогіі, сацыялогіі, міфалогіі і гісторыі. Свабоднае валоданне матэрыялам дазваляе А. Ненадаўцу трымаць свайго чытача ў пастаянным напружанні, перажываць і хвалявацца за лёсы герояў, а, з другога боку, — патрабаваць заканамернай і справядлівай адплаты для ўсіх носьбітаў зла без выключэння.

Для мяне асабліва найбольш цікавым і пераканаўчым па падборы матэрыялаў-сведчанняў у кнізе стаў раздзел "Праклінаючы родных", у якім гаворка вядзецца якраз пра кляцьбу бацькамі сваіх дзяцей і наадварот. Хвалюешся і перажываеш, думаеш: "Няўжо нельга было абысціся неяк па-іншаму, каб не гінулі няшчасныя людзі такой пакутлівай, страшнай смерцю?".

Раздзел "Хто чыніць зло" вылучаецца тым, што аўтар паспрабаваў, упершыню ў Беларусі, пералічыць тых, хто напрамую належыць да праяў і сілаў зла. Тым не менш, ён зазначае, што ўсё роўна не змог даць адназначнага адказу. І асноўная прычына ў тым, як жа вызначыць: хто ж такі "злы чалавек", каго адносіць да гэтай катэгорыі? Калі браць азначэнне зла ў філасафскім плане, багаслоўскім, то атрымаецца, што ўвогуле тых, хто не робіць зла, няма.

Заўважым, што даследчык асабліва старанна імкнуўся прасачыць і прааналізаваць гэтую праблему. Імпануе тое, што прафесар — не прафесійны псіхолаг ці філосаф, а міфолаг-фальклярыст, таму некаторыя трактоўкі праяў зла, яго ўзнікнення дае па-свойму. І гэта яшчэ больш захапляе, таму што высновы А. Ненадаўца становяцца зразумелымі не толькі "вузкім" спецыялістам, але і звычайным чытачам.

Заключны раздзел — "Помста злым людзям" — лагічнае завяршэнне гісторый, што ўвайшлі ў кнігу. Прысвечаны ён самым розным праявам людской нянавісці да злачынцаў. Але, як бы там ні было, пісьменнік упэўнена зазначае: "Зло будзе адолена дабром, як у лакальным, так і ў глабальным плане". Мы таксама спадзяёмся на гэта.

**Любоў НЯМКОВА**




# Настаўнікам прысвячаецца

**У 2007 годзе ў выдавецтве "Чатыры чвэрці" выйшла ў свет кніга Аркадзя Нафрановіча "Сейбіты дабра і мудрасці". Гэта зборнік нарысаў і вершаў, прысвечаных працы настаўнікаў.**

Галоўная ідэя кнігі выказана ў яе назве. Сімвалічна афармлена і вокладка: уверсе — выява Еўфрасінні Полацкай, святой "настаўніцы" свайго часу. Унізе — фотаздымак аўтара з вучнямі. Аркадзь Іосіфавіч сам настаўнік, і мне пашчасціла некалькі гадоў працаваць з ім у адной школе. Ён цудоўны педагог, мудры і вопытны, дасканала валодае словам, піша вершы і празаічныя творы.

Кніга своечасовая і патрэбная, аўтар вельмі добра ведае цану настаўніцкай працы і лічыць сваім абавязкам аддаць даніну павагі настаўніцтву, паказаць веліч іхняй справы. Гэта літаратурна-мастацкае выданне, у якім нарысы пра творча працуючых настаўнікаў перамяжоўваюцца цудоўнымі радкамі вершаў, кожны з якіх — гімн яго вялікасці настаўніку — сейбіту дабра і любові. У іх раскрываецца святло душы самога аўтара, яго любоў да жыцця і людзей.

Шмат цёплых і шчырых слоў сказана пра настаўнікаў Пастаўшчыны і Мядзельшчыны, раскрыты іх характары, захапленні, вопыт работы. Прыводзяцца планы, канспекты розных урокаў, прыклады распрацаваных методык. Любы настаўнік-прадметнік можа знайсці тут штосьці карыснае для сябе, падабраць матэрыял для краязнаўчай і выхаваўчай работы.

Кніга разлічана на шырокую аўдыторыю, чытаецца лёгка і прыемна. Аўтар прысвячае яе светлай памяці настаўніка многіх настаўнікаў, вядомаму на Беларусі кампазітару Мікалаю Макаравічу Пятрэнку.

І хочацца закончыць радкамі з верша А. Нафрановіча.

*Настаўнік, у роднай старонцы*
*З табой я пазнаць столькі змог!*
*Вышэй за цябе толькі сонца,*
*Мудрэй за цябе — толькі Бог.*

Дзякую аўтару і выдавецтву за цудоўную кнігу.

**Генавефа ДУБІЛОВІЧ**



## Сяргей ДАВІДОВІЧ

### Над Гайнай-рэчкай

*Над Гайнай-рэчкай цішыня*
*Нябачная лунае.*
*Гадоў мінулых мітусня*
*Мяне тут не кранае.*

*Над Гайнай-рэчкай вечар змоўк,*
*Нібы сумуе ўпотай.*
*А неба — вольнай плыні шоўк*
*Фарбуе пазалотай.*

*Спакой і ціша без краёў —*
*Душы зачараванне.*
*І толькі спевы салаўёў*
*Не сціхнуць да світання.*

### Родны кут

*Колькі бачу вакол я дзівосаў зямных*
*На Лагойшчыне, лепшай ў свеце!*
*І ідзеш, як плывеш,*
*па лугах сакаўных,*
*Дзе кіпяць і буяюць суквецці.*

*Пачакайце, касцы, хоць дзянёк,*
*хоць другі,*
*Адпачніце ад спёкі ў цянёчку.*
*Хай пяшчоцяцца ў сонечных*
*промнях лугі —*
*Канюшына, рамонкі, званочкі.*

*Вунь і пчолкі над імі рупліва гудуць,*
*І чмялі носяць мёд у скарбонкі.*
*Палысеюць лугі —*
*і тады не пачуць*
*Ані пчолак, ні птушачак звонкіх.*

*Як удзячны табе,*
*асяродак душы,*
*Родны кут, блізкі мне,*
*шматгалосы,*
*Ды шкада,*
*што сярод мілагучнай цішы*
*Справяць баль свой бязлітасны косы.*

### Ён і яна

*Ноч. Цішыня. Пакой. Не спіць паэт.*
*Агеньчык свечкі, нібы пульс нервовы.*
*Не спіць паэт, шукае думак след,*
*Складае рыфмы, падбірае словы.*

*Не ладзіцца. Не думкі, а капрыз!*
*Нібы вада праз рэшата, збягаюць.*
*Дый сон "не спіць" —*
*павейкі цісне ўніз,*
*І вочы плюснуцца і не міргаюць.*

*І раптам ён нібы спаткаў вясну,*
*Затрапятала і душа, і цела.*
*Ажыў паэт, паэту не да сну —*
*Яна ўвайшла ў пакойчык, уляцела.*

*Ён і яна — загадкавы інтым,*
*Яна і ён — адзінае дыханне.*
*Да раніцы не наталіцца ім*
*Вясной пачуццяў,*
*водарам кахання.*

*Для іх малы пакойчык — цэлы свет,*
*І прыцемак, і сціпласць — не абуза...*
*Ноч. Цішыня. Таемства.*
*Ён — паэт,*
*Яна — яго выратаванне — муза.*

### Сон зямлі

*Зямля да новага зачацця,*
*Што спланавала на вясну,*
*Пад гурбамі, нібыта ў ваце,*
*Прыціхла — аддалася сну.*

*Прынёс зямельцы сон глыбокі*
*Сцюдзёнае зімы наркоз.*
*З-за лесу вырас — рукі ў бокі,*
*Плячысты і ружовашчокі*
*Світанак, быццам Дзед Мароз.*

*Для сонца ў небе мала шоўка —*
*Што вытчэш за кароткі дзень?*
*Зімовы дзень — як стометроўка,*
*Разгон і фініш — ночы цень.*

*Ды ў галаве ў зімы ёсць "мухі" —*
*Між звонкіх і марозных дзён*
*Гудуць завеі-завірухі*
*Такія, што ні носу вон.*

*То безгалоўем неба ліжа,*
*То белай бурай дрэвы гне,*
*А то раптоўна заадліжа,*
*Знянацку туманом дыхне.*

*То, як майстрыца-чараўніца,*
*Карункі зноў пляце яна.*
*І ў гэты час, напэўна, сніцца*
*Зямлі пяшчотная вясна.*

### У матухны-прыроды

*О, колькі цудаў матухны-прыроды!*
*Яны вакол, яны —*
*на ўсе бакі.*
*Ялін, бяроз, рабінаў карагоды,*
*Асін пужлівых танец трапяткі.*

*Лазовы куст, як баба у ватоўцы,*
*Рассеўся ля дарогі, а за ім*
*Дубы, нібы "крутыя" на тусоўцы,*
*Фасоняцца адзін перад адным.*

*З бярозай вецер абышоўся*
*жорстка,*
*Зламаў яе да самага камля.*
*Яна цяпер, як кінутая костка,*
*Упала ніцма —*
*пухам ёй зямля.*

*Вунь, гаю гай*
*шле прывітанне гулка,*
*Махаюць голлем,*
*быццам сваякі.*
*А паміж імі ціхая рачулка*
*Схапіла неба аж за дзве шчакі.*

*І сонейка дало ныра ў рэчку,*
*Нясе яго празрыстая вада.*
*А воддаль клён заладзіў*
*з ветрам спрэчку*
*Гнявіцца клён —*
*бярозы той шкада.*

*Лугі разбагацелі сенакосна,*
*Палі рыхтуюць восеньскі пасаг.*
*А парасткам глядзець*
*уверх зайздросна*
*На дрэвы з аблачынай на плячах.*

*Так, тут свае трагедыі і святы —*
*Як не любіць,*
*не шанаваць зямлю!*
*І постаць дуба,*
*і бацян цыбаты,*
*Лугоў суквецце, рэчку,*
*лес кашлаты —*
*І ўсё жывое на зямлі люблю!*

### Адлегласць

*Пачатак і канец...*
*А што між імі?*
*Чым ён запоўнены,*
*жыцця Сусвет?*
*Адзін пятляў дарожкамі крывымі,*
*Таптаў зямлю —*
*і не пакінуў след.*

*А хтосьці пеў сярод зімы і лета,*
*Пеў салаўём, зязюляй кукаваў.*
*Ды тут, як кажуць,*
*песня яго спета,*
*Бо ён не пеў,*
*а іншым падпяваў.*

*Ды і ў мяне не складвалася гладка —*
*Раскідваўся гадамі малады.*
*Жыццё, на жаль,*
*не распачнеш спачатку.*
*Цяпер спрабую даганяць гады.*

*Народзіны і смерць...*
*Адлегласць гэту*
*Не вёрсты вымяраюць і не час.*
*Магчыма й за імгненне*
*здзейсніць мэту,*
*А век жыццёвы змарнаваць за раз.*

### Скажы, чытач...

*Скажы, чытач, ці тое я пішу?*
*Будзь мне замест суддзі,*
*замест Галгофы.*
*Ці здолеў я крануць тваю душу*
*Сваёй душой,*
*укладзенай у строфы?*

*Я ведаю —*
*тут розны падыход,*
*У кожнага свой густ,*
*патрабаванні,*
*Паэзія —*
*той незвычайны брод,*
*Дзе найглыбей шукаюць пераход.*

*Усходаў паэтычных каласы —*
*Галоўны скарб,*
*галоўны мой пажытак,*
*Паэзія жыве ва ўсе часы,*
*Бо ёй жыве чытач —*
*галоўны крытык.*

*Ці ёсць ён дзе, загадкавы Парнас?*
*Другое мне вядома дасканала:*
*Без чытачоў стрыножыўся б Пегас —*
*І гэта, як ні што, яднае нас.*

*Фота Віктара Кавалёва*

## Лявон ВОЎК

**Лявон Воўк нарадзіўся ў 1988 годзе ў Мінску. Скончыў Раманавіцкую сярэднюю школу і дарожна-будаўнічае аддзяленне Гомельскага дзяржаўнага дарожна-будаўнічага тэхнікума імя Ленінскага камсамола Беларусі. Працуе па спецыяльнасці. Сур'ёзна займаецца паэзіяй з 16 гадоў. Любімыя паэты Лявона — Янка Купала, Анатоль Сыс, Аляксандр Блок.**

### Вера

*Вера —*
*Адсутнасць страху,*
*Калі я адчыняю дзверы.*
*Вера —*
*Рашучы крок таго,*
*Хто зусім нясмелы.*
*Вера —*
*Чатыры літары,*
*Што не растворацца на паперы.*
*Вера —*
*Усё, што ёсць*
*У параненага звера.*
*Вера —*
*Надзейнае плячо таго,*
*Каму магу я ўсё даверыць.*
*Вера —*
*Святло душы,*
*Што ззяе зоркай у небе.*
*Вера —*
*Уласны крыж,*
*Які нясу і буду несці.*
*Веру*
*Я вельмі пешчу*
*І даглядаю, нібыта дрэва.*

* * *

*Несанлівы, іду і не пазяхаю,*
*Але пачуваюся — нібыта ў сне...*
*Хтосьці кагосьці чакае,*
*Але, на жаль, не мяне.*

*Ідучы, па баках пазіраю,*
*Мажліва, убачу я вочы Яе...*
*Хтосьці кагосьці чакае,*
*Але, на жаль, не мяне.*

*Па горадзе доўга блукаю,*
*Куды мяне сэрца вядзе?!*
*Хтосьці кагосьці чакае,*
*Але, на жаль, не мяне.*

*Я сцяг высока ўздымаю —*
*Божа, няхай Яна не абміне!*
*Хтосьці кагосьці чакае,*
*Але, на жаль, не мяне.*

* * *

*Ты для мяне адзіная тая,*
*Якую кахаю.*
*Якую кахаю!*

*Ты для мяне адзіная мара!*
*Смерць і жыццё*
*для мяне ты таксама!*

*Ты для мяне адзінае неба!*
*Ты сонца і глеба!*
*Сонца і глеба.*

*Ты для мяне адзіная зорка —*
*З табой не баюся ніякага змроку!*

*Ты для мяне адзінае свята!*
*Жыццё без цябе падобна на краты!*

*Ты для мяне ўсё на свеце!*
*Ты для мяне — мора і вецер!*

* * *

*Адзінота,*
*Хто ты?*
*Цябе я адчуваю, але не бачу,*
*не заўважаю!*
*Мабыць,*
*Вабіць*
*Цябе ўсё болей да мяне?!*
*Але чаму?*
*Магчыма, я знаходжуся ў сне?*
*Хопіць!*
*Гоніць*
*Мяне яна ў вугал, нібыта звера.*
*Ды не загоніць! Веру.*
*Я ў гэта веру!*

# Рыбалка

Мікола ДУБОЎСКІ

## Старонкі з аповесці

Як заняўся і завітаў у такой ранак, Віця не адчуў і не пабачыў. Калі ён прачнуўся, сонца ўжо расплывалася зіхоткай плямай на падлозе. Ягоная густая чырвань так нагадвала чалавечую кроў, што ён спалохана закрычаў. Маці, якая спала ў суседнім пакоі, прахапілася, саскочыла з ложка і кінулася да сына:

— Што? Зноў, сыночку?

— Яно, яно... — дрыжачаю рукою Віця паказваў на падлогу, — яно — Сцёпкава кроў... Ён вылазіў з БМП, а куля, гадзіна, яму ў грудзі. Кроў — фантанам, на вечка люка, плямай, во гэткай, на борт, у гарачы пясок. Мама! Не магу, не магу больш бачыць яе, схавай мяне, выратуй...

— Сыночку! Міленькі, даражэнькі... супакойся, гэта ж сонца. Ты дома, ты жывы... Усё забудзецца і больш гэтага ніколі, ніколі не будзе...

— Не, мама, не забудзецца — яно на ўсе жыццё... — Віця туліўся да матчынага пляча, плакаў, як малы хлопчык. — Я штоночы іх бачу — і Сцёпку, і Віцьку Сыравара, і Толіка Ласчыка. На маіх вачах яны згарэлі, не паспелі выскачыць з палаючай бляшанкі. Адзін я паспеў. Побач быў са Сцёпкам, паспеў саскочыць на пясок і адкаціцца. Адчуваю: боты мае гараць, я іх у пясок, а яны шчэ больш загараюцца, пяты пячэ, нібы іх восы пакусалі. А тут ужо духі побач, крычаць радасна, як хлапчукі, што ганяюць па вясне футбол. Каб наш верталёт не накрыў іх, то... — Віця моцна, да сіняву, сціснуў кулакі і зноў задрыжаў, як ў ліхаманцы.

— Ты жывы, ты дома, — маці гладзіла сынавы плечы, як магла, супакойвала яго.

Прайшло ўжо больш чым тры месяцы, як Віця вярнуўся з Афганістана, а прыступы незразумелай для маці хваробы не міналі. Калі першы раз Ганна Максімаўна ўбачыла, што робіцца з сынам, разгубілася: падумала, што ў яго падчая, выклікала "хуткую дапамогу". Доктар зрабіў два ўколы, доўга сядзеў ля Віці, супакойваў, а на развітанне сказаў:

— Мацуйся, браце, трэба і гэта перажыць. Табе неабходна добра адпачыць, і не ў санаторыі, а дзе-небудзь у цішыні ля ракі або каля возера, дзе і людзей менш, і згадваць пра тое пекла будзеш радзей.

Ганна Максімаўна не паверыла тады да канца лекару, бо была ўпэўнена, што нішто так не дапаможа сыну, як родны прытулак, дзе ён рос і сталеў. Аднак з цягам часу, гледзячы, як пакутуе сын, пачала думаць пра параду доктара. Віця шмат разоў хадзіў у паліклініку, яго ўсебакова ўважліва абследавалі высокія спецыялісты-медыкі і нічога не знаходзілі.

— Нервы, малады чалавек, нервы, — заключалі яны. — Бяры, салдат, сябе ў рукі — і хваробу забудзеш.

Аднак хвароба не мінала, як ні імкнуўся Віця адчапіцца ад яе.

...Тым днём, а гэта была якраз нядзеля, Віця спаў амаль да паўдня. Падняўся вясёлым, свежым, як быццам нічога не здарылася.

— Дзембеля час карміць, — зазірнуў ён на кухню і глыбока праз нос уцянуў паветра:

— А... мае любімыя дранічкі. Ура, пяхота!

— І з маладой бульбачкі, — шчасліва заўсміхалася Ганна Максімаўна.

За абедам маці нечакана нешта ўспомніла, выйшла ў суседні пакой і вярнулася адтуль з канвертам:

— Табе з Ленінграда. Колька Рудневу заве да сябе, прапануе разам паехаць на рыбалку аж пад Ржэў. На, чытай.

Віця, не выпускаючы з рук відэлец з аладкай, пачаў чытаць, і вочы яго павесялелі, заіскрыліся. Ганна Максімаўна адразу заўважыла гэта, але выгляду не падала. Віця адклаў ліст і задумаўся.

— Не паедзеш? — занепакоілася Ганна Максімаўна. Ёй здалося, што ў сына вось-вось зноў пачнецца прыступ. Віцькаў сябра таксама служыў у Афганістане, толькі ў Кабуле, а Віця — пад Кандагарам. Пасябравалі яны яшчэ ў Саюзе — былі ў адной вучэбцы.

— Паеду! — нарэшце вырашыў Віця. — Вось толькі грошай у мяне амаль не засталося. Увесь, мамачка, афганскі заробак патраціў.

— Не бядуй, я заўтра павінна адпускныя атрымаць, — паспяшалася сказаць маці, каб сын не раздумаў ехаць да сябра, бо лічыла, што гэтая паездка абавязкова яму пойдзе на карысць.

— А ты як? — адклаў відэлец Віця.

— Еш, еш, за мяне не хвалюйся. Колькі мне трэба? Жыла ж дагэтуль, круцілася, хоць заробак быў і на адну мяне. Едзь да Колькі, разам добра адпачнеце.

— Тады лады — еду. Рыбу буду сушыць, а потым тут ля піўнухі па рублю за штуку вазьму... Вось і вярну табе даўжок.

У Ленінград Віця прыляцеў праз тры дні. На таксі даехаў да Ліцейнага праспекта, знайшоў Колькін дом, падняўся на трэці паверх і пазваніў у кватэру Рудневых.

Спачатку за дзвярамі нічога не было чуваць. Але потым пачулася нейкае шорганне, шчоўкнуў ключ, і ў дзвярах паказалася старэнькая бабулька:

— Табе, мілок, каво?

— Кольку трэба, Руднева, разам служылі.

— А... Ты Віця? Казаў ён пра цябе, казаў. Праходзь, мілок, распранайся. — Бабулька прапусціла Віцю праз парог, і ён апынуўся ў доўгім, з высокай столлю, калідоры. Бабулька правяла Віцю ў вялікі пакой.

— А дзе сам Колька? — запытаў Віця. Бабулька ледзь не подбегам кінулася да шафы і дастала адтуль складзены аркуш паперы:

— Тут табе, мілок, ён усё напісаў, бо сам з бацькам паехаў у Пскоў — там родны дзядзька ягоны памёр, царства яму нябеснае...

Колька ў пісьме прасіў прабачэння, што не можа паехаць, раіў узяць ягоную палатку, рыбацкія прылады і самастойна кіравацца на возера Сцюдзёнае, якое знаходзіцца пад Ржэвам. Сябра падрабязна напісаў, як да яго дабрацца — спачатку цягніком, што ідзе на Ржэў, потым сорак кіламетраў аўтобусам, затым пешшу, арыентуючыся па карце, якую таксама паклаў у свой наладкаваны да верху паходны мяшок. У канцы запіскі Колька абяцаў, что як толькі вернецца, адразу ж пакіруецца на возера, дзе спадзяецца знайсці сябра.

Віця не ведаў, што яму рабіць — адпраўляцца на рыбалку або чакаць сябра тут.

За акном жвава пераклікаліся вераб'і, ціха шапацела старая таполя, зазіраючы галінкамі ў Колькіну кватэру.

— Пажыві ў нас, горад паглядзі, пакуль яны вернуцца, — заўважыла Віцькаву нерашучасць, прапанавала бабулька. — Пэўна, мілок, упершыню тут, у Петраградзе? Ой, мілок, — спахапілася раптам яна, — ты ж з дарогі і галодны, зараз я хуценька....

Віця не паспеў адказаць, як яна жвава выслізнула з пакоя. Застаўшыся зноў адзін, Віця пачаў уважліва аглядаць жытло. На сцяне, насупраць акна з шырокім, як стол, падаконнем, у зграбных рамках віселі фотакарткі. Віця наблізіўся да іх і на адной убачыў сябе.

— Чакай, калі ж гэта было? — Віцька глядзеў на знаёмы здымак і ніяк не мог успомніць, дзе і калі яны фатаграфаваліся з Колькам. На фотакартцы за іх спінамі бачылася атынкаваная сцяна. І тут Віцька ўспомніў: здымак гэты быў зроблены якраз перад іх сыходам з вучэбкі. Тады ім, маладым "салагам" не сказалі, што адпраўляюць у Афганістан. Іхні старшына Усачоў бясконца пераконваў: "Ляцім, салагі, пад Ташкент для канчатковай адпрацоўкі кіравання БМП". Але ўсе ў роце не сумняваліся, што ён хлусіць, і ведалі дакладна — іх кінуць у Афган. Вось тады і сфатаграфаваліся на развітанне. Віцька не забраў сваю фотку, бо яго аддзяленне паляцела першым.

— Давай, мілок, — перапыніла Віцькаў успамін бабулька. Яна стаяла ў дзвярах з вялікім падносам.

Да вечара Віця блукаў па горадзе і ніяк не мог вызначыцца, што яму ўсё ж рабіць: ехаць ці не ехаць на невядомае возера. Толькі на змярканні, прыпыніўшыся каля гранітнага парапету, што аблямоўваў шырокую Няву, і, пабачыўшы, як непадалёку раз-пораз закідвалі вуды і выцягвалі плотак рыбакі, цвёрда вырашыў ехаць.

На наступны дзень, прыхапіўшы наладкаваны Колькам рэчавы мяшок, палатку і развітаўшыся з добрай бабуляй, ён накіраваўся на вакзал. Ехаў цягніком цэлы дзень і ноч і толькі на світанку апынуўся на станцыі Раз'язная.

Невялічкі перон, дашчатае памяшканне станцыі і трохі воддаль — дзесяткі два дамкоў з высокімі агароджамі і лісцевымі прысадамі. Убаку ад перона ў ранішняй нерухомасці драмаў высокі бярозавы лес. Віця сюды-туды прайшоўся па пероне ў надзеі ўбачыць каго з мясцовых жыхароў і распытаць: дзе тут той аўтобус, пра які пісаў Колька. Але нікога пакуль не было.

"Які можа тут, у гэтай глухамані, хадзіць аўтобус? Мо я не на той станцыі сышоў? — занепакоіўся Віця. Каб упэўніцца, што не памыліўся, дастаў з кішэні Колькіна пісьмо і перачытаў яго.

— Не, станцыя Раз'язная, і во на шыльдзе напісана, — Віцька зноў паглядзеў на іржавую бляшаную шыльду, на якой вялікімі літарамі была выведзена тая ж назва.

Пакуль Віця ўдакладняў, ці туды ён прыехаў, куды трэба, на ўскраек лесу выйшаў мужчына з доўгай сівой барадой, у квяцістай кашулі, шапцы-вушанцы. На яго плячы ляжаў кіёк, на канцы якога вісела невялічкая торбачка. Мужчына адразу прыкмеціў Віцю, спрытна перайшоў высокае чыгуначнае палатно і ступіў на перон.

— Здорово, служивый! Курнуть не дашь?

Віця, нічога не адказваючы, працягнуў яму пачак цыгарэт "Арбіта".

— Не нашенске?.. — незнаёмец разглядаў цыгарэты, нюхаў, затым ўзяў адну, прыкурыў і, вяртаючы пачак, паклaніўся:

— Благодарствую!

— Ці не падкажаце, як адсюль на возера Сцюдёнае дабрацца? — затрымаў Віця мужчыну, які рушыў з перона.

— Вёрст с полсотни отсюдова. А чево тебе там? — зацікаўлена паглядзеў на Віцю незнаёмец.

— Парыбаліць хачу.

— А вона чево, — мужчына памаўчаў, пра нешта думаючы, а затым сказаў:

— За поселком — большак. Автобус со Ржева пойдет, садись на нево и до Голубых Камней кати. Потом верст с дзесяток пехтурой отмахаешь — и Студзёное увидишь, чай, ноги крепкие. В Афгането, должно, ходил помного, — мужык зноў агледзеў Віцю з ног да галавы, загадкава ўсміхнуўся, пакланіўся яшчэ раз і няспешна пайшоў ад станцыі ўзбоч чыгуначнага палатна.

Віця нейкі час глядзеў яму ўслед, затым закінуў за плечы рэчавы мяшок, палатку і рушыў у падказаным напрамку. Калі ён праміну пасёлак, то ўпэўніўся, што мужчына не схлусіў, бо адразу ўбачыў шырокую гравійку, якая, нібыта страла, роўненька распілоўвала лес. Непадалёку ад пасёлка Віця пабачыў аўтобусны прыпынак. Да ствала чорнай таўшчэзнай бярозы была прыбіта драўляная шыльда. На якой ледзь-ледзь чыталася: "Разъездное".

У аўтобусе, на які Віця сеў толькі ў дзесяць гадзін раніцы, ехалі чатыры пасажыры — бабулькі ды барадатыя дзяды. Кожны з іх трымаў у руках плеценыя з лазы кошыкі. Віця здагадаўся, што едуць яны збіраць ягады. І сапраўды, праз некаторы час аўтобус спыніўся і ўсе пасажыры сышлі. Далей Віця ехаў адзін.

Вадзіцель раз-пораз паглядаў у люстэрка перад сабою, каб бачыць свайго пасажыра. Праз кожныя тры — пяць кіламетраў аўтобус спыняўся і некалькі хвілін чакаў, мо хто падыдзе. Але нікога не было, і аўтобус рухаўся далей. На адным з прыпынкаў вадзіцель пацікавіўся, куды Віця едзе. Даведаўшыся, ён нічога не сказаў, толькі загадкава хітнуў кранутай сівізною галавой. Напрыканцы шляху Віця задрамаў і прачнуўся ад раптоўнага выкрыку вадзіцеля: "Голубые Камні". Віця спрасонку аберуч ухапіў свае рэчы і пакінуў нагрэты спякотным сонцам салон. Вадзіцель зычліва памахаў яму рукой.

Віця стаяў на бальшаку, не ведаючы, куды ісці. Вакол у летняй спякоце драмаў сасновы бор, моцна пахла жывіцай, чаборам і панавала такая цішыня, што аж закладвала вушы. Дарогі на возера нідзе не было відаць. Бязлюднасць гэтага глухога месца яго не турбавала. Пасля Афганістана для Віці ніякіх страхаў, акрамя прыступаў набытай там хваробы не існавала.

— Трэба глянуць на Колькіну карту, — вырашыў ён. Карта была даволі падрабязнай, Віця лёгка знайшоў месца, дзе знаходзіўся, і як ісці адсюль да возера.

Ад прыпынку Віця па бальшаку прайшоў яшчэ кіламетры два, затым збочыў на вузкую, ненаезджаную дарогу. Адгалінаваўшыся ад бальшака ў бор, яна адразу запятляла, закружыла між высокіх соснаў, карані якіх перапаўзалі яе, як тоўстыя вужы, і знікалі ў насыпах шматгадовай ігліцы.

Віця рухаўся няспешна, часам прыпыняўся, каб набраць чарніц. Кідаў на зямлю палатку і рэчавы мяшок, які ўжо муляў плечы, сядаў побач і жменяю чэрпаў з чарнічніку буйныя, пераспелыя ягады. Яны наталялі смагу, узнімалі настрой. Усёй душою адчуваў ён харство прыроды.

На адным з такіх прыпынкаў Віцька прыпаў, як засмяглы падарожнік да вады, да куста маліны. Буйныя, пахучыя, сакавітыя ягады растаялі ў роце.

Ён не пачуў, як падышоў Руднеў, і, нацэліўшы на яго нямецкі аўтамат "шмайсер", гукнуў на ўвесь бор:

— Хэндэ хох!

Віцька ад нечаканасці тыцнуўся тварам у калючую ігліцу.

— Ты што? Звар'яцеў... У вайну са мною вырашыў тут гуляць?! Я табе зараз... — усхапіўся на ногі Віцька і кінуўся на сябра з кулакамі. Руднеў, апусціўшы аўтамат, памкнуўся назад.

— Стой, стой! Я пажартаваў! На вось, глыні французскага каньяку. Знайшоў... Там, ля возера, — некрануты, пад вадою — камандны пункт, нямецкі. Кансервы, галеты, каньяк, зброя, радыёстанцыі, акумулятары. Усё — як толькі завезенае.

— Мне пляваць на гэта! Ты што, за лоха мяне прымаеш? Выклікаеш, ілжэш, просіш прабачэння: "Маўляў, дзядзька памёр". Я пруся ў гэтую дзікую, Богам і людзьмі забытую глухамань, а ты: "Стой, стой, пажартаваў". Забірай сваё барахло, а я дамоў, да мамы. Са сваімі, Коля, так нельга. Я пайшоў!

— Віця! Хопіць характар паказваць, — ўсур'ёз захваляваўся Руднеў. — Я табе не зманіў. Я дапамогі прашу... Мая Ленка, вяртаючыся ўначы са свайго кафэ (яна там — адміністратар), стала нявольнай сведкай жорсткай разборкі ленінградскіх крымінальнікаў: сем трупаў — страшны вынік перастрэлкі. Бандыты ўгледзелі Ленку, калі садзіліся ў таксоўку.

— Ну і што?

— Што?! Яны пачалі ўжо на яе паляванне. Распытваюць, шукаюць.

— У міліцыю заяві, — параіў Віцька.

— Гіблая справа. Вылічаць і застрэляць. Яна збегла сюды. Паведаміла мне. Ратунак адзін — знішчыць кілераў. Таму цябе і выклікаў. Згодзен?

— Па руках, Коля. — Віцька працягнуў руку сябру.

## Арт-пацеркі

Афіцыйнае свята, прымеркаванае да 70-годдзя Беларускай дзяржаўнай філармоніі, адбылося, як вядома, яшчэ летась. Але юбілейны сезон старэйшай канцэртнай установы краіны — у разгары і працягвае радаваць публіку разнастайнасцю праграм. На першы лютаўскі вечар абвешчана сустрэча з мастацтвам народнай артысткі Беларусі, салісткі нашага Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Наталлі Рудневай (мецца-сапрана). У суправаджэнні дыпламанта міжнародных конкурсаў піяніста Сяргея Тургеля яна выканае творы Д. Пергалезі, Б. Марчэлы, Л. Керубіні, П. Чайкоўскага, С. Рахманінава. Канцэрт адбудзецца ў Малой зале імя Р. Шырмы. А 4 лютага тут будзе гучаць музыка для флейты і фартэпіяна: лаўрэат міжнароднага конкурсу Сяргей Картэс і дыпламант міжнародных конкурсаў Вадзім Сідараў прадставяць малавядомыя мінскай публіцы творы Г. Бломера, Ф. Шуберта, Р. Штрауса ды інш.

Многім чытачам "ЛіМа" знаёмы абраз, фрагмент якога тут змешчаны. Гэта "Нараджэнне Маці Божай": выява, зробленая на дошцы яечнай тэмперай, датуецца 1649 годам, належыць да беларускай іканапіснай школы. Захоўваецца рарытэт у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Яго, як і іншыя ўзоры з культавых калекцый, не так і даўно залічвалі ў "старажытнабеларускі жывапіс", "тэмперны жывапіс XII — XVIII стст." і да т.п. Але мінуў час насцярожлівага стаўлення да царкоўнай тэрміналогіі. І вось шматгадовая даследчая праца доктара мастацтвазнаўства, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Надзеі Высоцкай увасобілася ў чарговую прыгожую кнігу, але з назвай, адрознай ад ранейшых аналагічных выданняў. Маляўнічы альбом "Сакральны жывапіс Беларусі XV — XVIII стагоддзяў", аўтар-складальнік якога Н. Высоцкая, быў нядаўна прадстаўлены ў нашай Нацыянальнай бібліятэцы — на вернісажы лепшых кніг, выпушчаных апошнім часам выдавецтвам "Беларусь". Гартаючы альбом, нельга не падзівіцца на унікальныя помнікі з музейных калекцый, узоры культавага жывапісу, што знаходзяцца ў храмах. Прычым, змешчана багата твораў, не вядомых з ранейшых кніг Н. Высоцкай. Выданне "Сакральнага жывапісу..." прыводзіць да зусім лагічнай высновы: нашай краіне даўно патрэбны музей старажытнага мастацтва. Апроч кнігі Н.Высоцкай, на выстаўцы ў Нацыянальнай бібліятэцы прэзентаваліся двухтомная "Гісторыя беларускага мастацтва" Б. Лазукі, "Жаночы касцюм на Беларусі" і "Мужчынскі касцюм на Беларусі" В. Бялявінай і Л.Ракавай, серыя выданняў, падрыхтаваных А. Ярашэвічам, В. Бажэнавай, Т. Габрусь і прысвечаных помнікам айчыннай архітэктуры і культуры.

**С. ВЕТКА**

# «Кухня» талентаў

**60 гадоў — гэта значны ўзрост для людзей, але не для творчых школ. Так што свой юбілей Мінскае дзяржаўнае мастацкае вучылішча імя А. Глебава сустрэла ў росквіце сіл. Абноўлены будынак, юныя твары навучэнцаў. Атмасфера, напоўненая свежасцю — і нястомнай працай па падрыхтоўцы новых талентаў, якім наканавана шчыраваць на глебе беларускага мастацтва. Пра тое, як гадуюцца тут мастацкія таленты, мы размаўляем з Васілём Ясюком, дырэктарам МДМВ імя А. Глебава.**

**— Васіль Іларыёнавіч, што адбываецца на вашай "кухні талентаў", як праходзіць навучанне?**

— Як правіла, да нас на першы курс прыходзяць ужо больш-менш падрыхтаваныя дзеці. Яны або займаліся ў мастацкіх школах, або навучаліся самастойна, у сваіх бацькоў, у іншых мастакоў. Галоўнае, яны ведаюць, на што ідуць, бо конкурс на паступленне да нас даволі высокі, даходзіць да 11 чалавек на месца. Без нейкай спецыяльнай падрыхтоўкі вытрымаць уступныя іспыты складана, маючы нават выяўлены талент. Гэта рэдкае выключэнне, калі вельмі таленавіты, але абсалютна не падрыхтаваны чалавек паступае ў наша вучылішча. Але такія выпадкі ёсць, і, дзякуй Богу, што яны ёсць. Часам здараецца так: прыязджаюць таленавітыя дзеці з вёсак, якія нідзе мастацтву не навучаліся, бо самой такой магчымасці не мелі. Але, як правіла, нашы выкладчыкі бачаць іх патэнцыял. Думаю, і ў наш час так было: выкладчыкі прыкмячалі такіх самародкаў, і дзякуючы гэтаму краіна атрымала многіх вядомых цяпер мастакоў.

**— Навучанне юных творцаў — гэта працэс статычны, устаялы ці да кожнага пакалення трэба выбіраць свой падыход?**

— Працэс навучання займае 4 гады, на базе скончаных абітурыентам дзевяці і дзесяці класаў сярэдняй школы. З цяперашняга года ў нас адбыліся невялічкія змены: на базе дзесяці класаў будзем рыхтаваць студэнтаў тры гады паводле індывідуальнай праграмы. Нагул, ужо склалася развітая беларуская школа выяўленчага мастацтва. Яе вытокі — ад віцебскай школы, ад Шагала, ад творчасці многіх іншых вядомых беларускіх мастакоў першага пакалення. Дый само Мінскае дзяржаўнае мастацкае вучылішча было заснаванае пасля вайны на базе Віцебскага тэхнікума, таму ўсе традыцыі, захаваныя там, перайшлі сюды. Гэта традыцыі класічнай рускай, беларускай рэалістычнай школ. На іх базе развіваліся новыя плыні, напрамкі. Для таго, каб нешта пабудаваць, патрэбны надзейны падмурак, на які можна ставіць усялякія новыя формы і варыяцыі. Безумоўна, такім падмуркам з'яўляецца класічная рэалістычная школа, і менавіта на ёй заснаваная праграма навучальнага працэсу.

**— Моладзь з гэтым не канфліктуе? Мяркуючы паводле работ, можна сказаць, што вашы студэнты працуюць у розных напрамках.**

— Так падаецца на першы погляд. У прынцыпе ўсе іх работы выкананыя ў традыцыйнай рэалістычнай манеры. Вядома, у моладзі ёсць свой сучасны падыход, ледзь змененая форма выканання, але задачы застаюцца тыя ж, у рэчышчы рэалістычнага напрамку. Асабліва гэта адчуваецца ў работах аддзялення дызайну, якое існуе толькі 7 гадоў. Добра, што яно з'явілася, актыўна развіваецца і сёння лічыцца адным з самых папулярных у вучылішчы, "модных". Бадай, тут і самы высокі конкурс. Але ўсё ж традыцыі Мінскага мастацкага вучылішча — гэта жывапіс, графіка, скульптура: асноватворныя напрамкі, у якіх і ўвесь "цвет" беларускага мастацтва.

**— Як самастойная з'ява ў выяўленчым мастацтве імкліва распаўсюджваецца камп'ютэрная графіка. Вучыце такому?**

— Гэтым у нас займаецца аддзяленне дызайну. Напрамак сапраўды развіваецца, і студэнты актыўна ў гэтым развіцці ўдзельнічаюць, працуюць, выкладчыкі ў адпаведных пытаннях дасведчаныя. Многія дзеці паступаюць на аддзяленне фотаграфікі, тэлерэкламы, што, думаю, з'яўляецца важным паказчыкам развіцця адпаведнай галіны навучання. База ёсць, і мы выкладаем асновы. Ну, а студэнты, даходзячы да дыпломнай работы, самі выбіраюць, які напрамак ім бліжэй, і потым ужо, калі паступаюць у акадэмію мастацтваў, развіваюць яго больш дасканала.

**— Ці здзіўляе чым-небудзь новае пакаленне?**

— А што такое — новае пакаленне? Новае пакаленне было і ў 1960-х, калі ў перыяд т. зв. адлігі мастакі актывізаваліся, спазналі, што такое імпрэсіянізм. Гэта таксама ў нейкай меры рэалізм, а сёння ўжо і класіка. Ну, а для таго, каб здзіўляць, найперш трэба закласці асновы. Не заклаўшы асноў, нельга нічога пабудаваць.

**— А "новыя Далі" не выраслі з вашых студэнтаў?**

— Успомнім аднаго з выдатных мастакоў, якога, на жаль, ужо няма на гэтым свеце, — Міколу Селяшчука. Ён скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, і ў яго палотнах можна ўбачыць элементы сюррэалізму, якія камусьці могуць нагадаць і творчасць Сальвадора Далі, але ж гэта па сутнасці свой напрамак, сваё пераасэнсаванне і бачанне. І не трэба, каб былі "новыя Далі", патрэбныя новыя беларускія мастакі, па-свойму адметныя, як Шагал, Малевіч, Савіцкі, Грамыка і многія іншыя.

Цяпер вельмі шмат маладых таленавітых мастакоў. Вядома, не ўсе здабудуць шырокую вядомасць, але яны ўсе стануць выдатнымі выкладчыкамі выяўленчага мастацтва. Гэта дасць ім магчымасць выхоўваць у людзях эстэтычны густ не толькі ўласнай творчасцю, але і навучаючы дзяцей — ужо з першых класаў школы. У гэтым вялізнае дасягненне нашага вучылішча.

**— Ці часта вашы студэнты з'язджаюць працаваць за мяжу?**

— Нават калі і з'язджаюць, у гэтым няма нічога кепскага. Калі мастак працуе за мяжой, але ён патрыёт, ён усё адно застаецца беларускім мастаком. Таму, працуючы ў іншых краінах, творца прыносіць карысць Беларусі тым, што пра нашу краіну дазнаюцца, бачаць яе творчы ўзровень, культуру, нашы магчымасці. Я і сам працаваў у замежжы, рабіў персанальныя выставы, удзельнічаў у міжнародных праектах — гэта заўсёды толькі плюс дзяржаве, якую мы прадстаўляем.

**— Дзе беларусы, неабыякавыя да выяўленчага мастацтва, могуць пазнаёміцца з работамі вашых навучэнцаў?**

— Мы ладзім вялізную колькасць уласных выстаў, штогод адбываюцца вернісажы стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. Студэнцкія экспазіцыі ў нас перыядычна мяняюцца ў сценах самога вучылішча, і кожны цікаўны можа зазірнуць да нас, паглядзець. Удзельнічаем ва ўсіх рэспубліканскіх акцыях, прысвечаных праблемам культуры. У нас багата творчых перамог, як на радзіме, так і за мяжой.

**— Які лёс студэнцкіх работ? Ці ёсць у вучылішчы, акрамя насценнай галерэі, музей для іх?**

— Так, ёсць і музей, але, на жаль, плошча яго абмежаваная. Аднак ужо існуе праект рэканструкцыі і пашырэння Мінскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча, падтрыманы дзяржавай. Фактычна мы атрымаем новы будынак, дзе будуць знаходзіцца ўсе майстэрні, адпаведныя патрабаванням, якіх вымагае творчая праца, адмысловыя скульптурныя майстэрні, актавая і спартыўная залы, фае, свой інтэрнат, зала для выставак. Гэта дасць нам магчымасць паказваць вялікую колькасць дыпломных работ. Цяпер жа рыхтуем юбілейны альбом, куды ўвойдзе каля 600 аркушаў, і гэта толькі малая, ды лепшая частка таго, што можам паказаць.

**— Васіль Іларыёнавіч, скажыце "бацькоўскае" слова сваім студэнтам. Чаго б вы ім пажадалі?**

— Пажадаю ім любіць не сябе ў мастацтве, а мастацтва ў сабе. Дзякуючы гэтай любові кожны з іх зможа дамагчыся многага ў творчым жыцці. Чалавеку без пачуцця любові няма месца ў мастацтве. Трэба любіць сваю прафесію, але акрамя гэтага неабходна вельмі і вельмі шмат працаваць. Толькі выяўлены талент, самаахвярнасць у працы і вучобе дадуць плён. Прыкладаў — вялізная колькасць: усе нашы найвядомыя мастакі не перастаюць працаваць кожны дзень ля станка або мальберта. Таму жадаю любові да працы і шчодрай душы, укладзенай у тое, што яны робяць.

**Гутарыў**
**Захар ШЧАРБАКОЎ**

***На здымках: дырэктар МДМВ імя А. Глебава Васіль Ясюк; на выстаўцы ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, прысвечанай 60-годдзю Міколы Селяшчука — аднаго з выбітных выпускнікоў вучылішча.***

***Фота аўтара і Святланы Берасцень***

# У чым жыццёвае апірышча?

**Гэты канцэрт не толькі выклікаў захапленне цудоўным граннем музыкаў, але і пакінуў яркі ўспамін: слухачы дагэтуль абмяркоўваюць цікавую праграму, манеру ігры, гукавыя знаходкі, суладдзе і цэласнасць у выкананні.**

Ансамбль баяністаў "Трыо — Мінск" падчас гастроляў па Магілёўскай вобласці паказаў сваё мастацтва ў Магілёве і Шклове. І паўсюль — поўныя залы, зацікаўленая публіка. Калектыў вядомы, заслужаны, шмат выступаў у Беларусі, Расіі, Германіі, у Прыбалтыцы — усяго і не пералічыць, — мае прэстыжныя ўзнагароды конкурсаў і фестываляў.

Чвэрць стагоддзя "Трыо — Мінск" прапагандуе яе вялікасць Музыку, заварожваючы ўсё новых слухачоў. З дня стварэння ў ім іграе Валянціна Пісарчык, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, з 1993 года — мастацкі кіраўнік калектыву. У яго складзе — вельмі таленавітыя баяністы, колішнія вучні Валянціны Пятроўны: Уладзімір Гудзей і Сяргей Бандаровіч.

Магілёўскі канцэрт прайшоў на адным подыху. Гэта ўжо толькі потым усведамляеш, што музыкантам удалося ахапіць неабдымнае: розныя эпохі, стылі, краіны і кантыненты, паказаць найшырачэйшую і размаітую гукавую палітру, ужо не кажучы пра вытанчаную перадачу настрояў, станаў душы, яркіх усплёскаў эмоцый.

Беларуская класіка — Я. Глебаў і класіка сусветная — А. Вівальдзі, Я. С. Бах, Т. Альбіноні, І. Альбеніс, Ф. Шуберт, Ф. Ліст суседнічалі з румынскім "Жаўранкам", венгерскім чардашам, кубінскімі мелодыямі, варонежскімі найгрышамі... Выкананне было віртуознае, захапляла дасканаласцю і адточанасцю дэталяў, імкненнем перадаць індывідуальнасць прадстаўленых кампазітараў.

Пры канцы канцэрта Валянціна Пісарчык падзякавала публіцы за цёплы прыём і глыбокае разуменне. Яе слова, звернутае да прысутных, было гэткае ж насычанае, яскравае, эмацыйнае, пранікнёнае, як і выступленне ансамбля, і выказвала велізарную любоў да музыкі ды заклік знаходзіць у ёй жыццёвае апірышча і падтрымку.

**Ларыса МАКАРАВА,**
**выкладчык музычнага вучылішча**
г. Магілёў

# Дзівосны лубок

**Лубок, народная карцінка, дрэварыт — усё гэта назвы цікавай культурна-мастацкай з'явы, якая займала адметнае месца ў жыцці беларускага грамадства з XVI ст. да пачатку XX ст. Стварэнне гравюры на дрэве з далейшым адбіткам выявы на паперу з'явілася той моцнай мастацкай плынню ў пашырэнні культурна-інфармацыйнай прасторы, што грунтавалася на традыцыйнай глебе народнага светаўспрымання. Адлюстраванне гэтага феномена можна пабачыць у выданнях Ф. Скарыны, П. Мсціслаўца, В. Кораня, В. Вашчынка, у рэлігійнай літаратуры са шматлікіх беларускіх друкарняў.**

Аўтарства лубачных гравюр, на жаль, звычайна невядомае, ды яны амаль не захаваліся да сённяшняга часу ў Беларусі. Першыя спробы збірання і вывучэння гэтага феномена былі зроблены дзеячам беларускага адраджэння Іванам Луцкевічам у Беларускім музеі ў Вільні (1910-я гады). Цікавасць да лубка асабліва адчувалася ў Расіі, большасць такіх выяў друкавалася ў Маскве і Пецярбургу, дзе на кірмашах, асабліва у XVIII — XIX стст., іх можна было набыць. На пачатку XX ст. асобныя лубачныя кнігі друкаваліся мільённымі накладамі. Але іх ужо стваралі прафесійныя мастакі.

Гісторыя лубка бярэ пачатак ад рукапіснай кнігі. Яго малюнак спачатку гравіраваўся на дрэве (дрэварыт) ці на меднай пласціне (медзіярыт), затым малюнак з дапамогай прэса пераносіўся на паперу, а далей ужо паліграфічная машына ці пэндзаль народнага вясковага мастака размалёўвалі падрыхтаваныя адбіткі анілінавымі фарбамі. Кажуць, што за адзін дзень народны мастак мог размаляваць да тысячы лубкоў! Але вядомыя і рукапісныя лубкі, якія звычайна рабіліся пры манастырах.

У чым прыцягальнасць такой народнай карцінкі? Лубок існаваў у дзвюх прасторах: паміж светам рэальным і фальклорным, які складаўся з народных паданняў, песень, гістарычных эпасаў. Гэта дазваляла мастаку вольна адлюстроўваць традыцыйныя сюжэты і ствараць захапляльныя сюжэты на лубе (ліпавая дошка, якую гравіраваў мастак).

Найбольш адметнымі рысамі лубка былі гратэск і наяўнасць тэксту на малюнку, які ўключалі ў прыгожую выяву выразнай кампазіцыі лубка. Чалавек, які разглядаў лубок, мог быць актыўным гледачом, каментатарам, суддзёю. Народная карцінка дазваляла кожнаму выказваць тое, што ён адчуваў, калі разглядаў лубок на кірмашы ці абмяркоўваў пабачаны сюжэт з аднавяскоўцамі. Гэтую магчымасць — вольна выказваць і перадаваць свае меркаванні, уражанні пра тое, што чалавек бачыў ці чуў, што імкнуўся знайсці ў ідэале, — можна лічыць прадвеснікам сучаснай тэлекамунікацыі і незалежнасці прэсы. Нездарма ў сярэдзіне XIX ст. быў выдадзены царскі загад пра неабходнасць цэнзуры лубка...

Першая выстаўка лубка адбылася ў Маскве у 1913 г. Яго самабытнасць, яго народныя вытокі, безумоўна, паўплывалі на творчасць такіх вядомых мастакоў, як М. Ларыёнаў, Н. Гончарова, К. Малевіч, М. Шагал. У 1918-м — пачатку 1930-х гг. у БССР на вокладках і старонках першых беларускіх газет, кніг, часопісаў (і тых, што выходзілі ў беларускіх выдавецтвах на тэрыторыі Заходняй Беларусі), у выданнях "Беларускага календара" прысутнічаюць лубачныя матывы. Яны знаходзяць увасабленне ў творчасці такіх беларускіх мастакоў і пісьменнікаў, як Я. Драздовіч, Я. Маразовіч, Ф. Аляхновіч, В. Сідаровіч, Язэп Горыд ды іншых.

Найбольш удалымі я лічу работы мастака Язэпа Драздовіча, які не толькі добра ведаў навуковы гістарычны матэрыял, але падчас сваіх вандровак па Беларусі бясконца рабіў замалёўкі, вывучаў народныя крыніцы. Можа, таму, што яму ніхто не перашкаджаў у мастацкіх пошуках у 1920-я гады, яго графічныя, выразна лубачныя работы атрымаліся вельмі ўдалымі. Яны насычаныя нацыянальнымі, народнымі вытокамі, беларускімі песнямі, міфамі, паданнямі. Не верыце? Тады пагартайце старонкі часопісаў "Вольны сцяг", "Рунь", — выданняў 1920 — 1922 гадоў, дзе працаваў мастаком Я. Драздовіч, ды задумайцеся над тытульнымі старонкамі гэтых першых беларускіх СМІ. Нам сапраўды ёсць чым ганарыцца, што падняць з забыцця, шукаючы занядбаную спадчыну беларускай культуры.

Падчас "пабудовы сацыялізму" лубок паступова ператвараўся з народнай карцінкі ў карыкатуру ці палітычны плакат. "Лубачнае" светаўспрыманне паспрыяла развіццю новых форм мастацкага выяўлення, асабліва ў кніжнай графіцы. Пры канцы XX ст. да мастацтва лубка давялося спрычыніцца і аўтару гэтых радкоў, навуковаму супрацоўніку Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе". Кніга "Дзівосны лубок", якая захоўваецца сёння ў аддзелах рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Урадавай бібліятэкі Беларусі, рабілася як аповед пра гістарычнае мінулае роднага краю. У сваіх лубачных работах я імкнуўся гарманічна спалучыць тэксты беларускіх паданняў, песень, летапісаў, вершаў з чырвоным арнаментам беларускай вышыўкі, з нацыянальнымі касцюмамі, партрэтамі гістарычных дзеячаў і з беларускімі краявідамі, на якіх можна пабачыць культурна-гістарычныя, этнаграфічныя помнікі Беларусі. Прыемна, што ў 2007 г. РВУ "Літаратура і Мастацтва" выдала маю кнігу "Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі", пра якую ўжо нямала напісана ў друку.

Мастацтва беларускага лубка — перспектыўнае. Яго гісторыя нікога не прымушае адмовіцца ад акадэмічных канонаў. Яна толькі запрашае мастакоў і тых, хто хоча пазнаваць і ствараць прыгожае для свайго народа, У дзівосны лубачны рай, якога так не хапае нам сёння.

**Юрась МАЛАШ**

# Беларускія вечары ў Варшаве

**Штогод у Варшаве, дарэчы, як і ў многіх іншых гарадах і рэгіёнах Польшчы, па ініцыятыве або пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Польшчы праводзяцца самыя разнастайныя беларускія мерапрыемствы, якія выклікаюць вялікую зацікаўленасць у польскіх гледачоў і слухачоў, пазітыўны рэзананс у краіне.**

Прэзентацыі беларускай культуры і мастацтва часта становяцца першым і важным крокам для ўсталявання і развіцця стасункаў паміж палякамі і беларусамі ў розных галінах, як у гуманітарных, так і ў эканамічных. Як адзначаў у сваім выступленні на пасяджэнні Цэнтральнага праўлення Таварыства супрацоўніцтва "Польшча — Усход" старшыня таварыства "Польшча — Беларусь" Баляслаў Хмялінскі, у апошнія гады "адбываецца сапраўдная экспансія беларускай культуры ў Польшчу, што стварае добрыя падставы і прыязную атмасферу для развіцця адносін і ў іншых галінах супрацоўніцтва".

Толькі ў мінулым 2007 годзе ў Варшаве, Гданьску, Гайнаўцы, Беластоку, Бяла Падлясцы, Бельску Падляскім і іншых гарадах і мястэчках Польшчы адбыліся персанальныя выстаўкі народнага мастака Беларусі, прафесара Васіля Шаранговіча, прафесара Віктара Альшэўскага, Уладзіміра і Тамары Васюкоў, іншых беларускіх мастакоў. На большасці фестываляў і конкурсаў, якія праводзяцца ў Польшчы, заўсёды годна прадстаўляюць мастацтва Беларусі прафесійныя і лепшыя аматарскія калектывы. Напрыклад, ужо 6 гадоў запар званні лаўрэатаў і гран-пры на вядомым і прэстыжным міжнародным фестывалі "Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" (у ім штогод удзельнічаюць калектывы з самых розных краін) атрымліваюць харавыя калектывы з Беларусі. Дадамо, што летась у Польшчы толькі пры падтрымцы беларускіх дыпламатычных устаноў было праведзена больш як 80 розных мерапрыемстваў, выступіла больш як 100 творчых калектываў з Беларусі, у тым ліку 15 прафесійных.

11 студзеня 2008 года ў Беларускай зале Пасольства адбыўся беларускі вечар "Сяброўская сустрэча пад Стары Новы год", на якім прысутнічалі паслы Арменіі, Малдовы, Казахстана, Украіны, прадстаўнікі іншых дыпламатычных устаноў у Варшаве, польскіх міністэрстваў і ведамстваў, дэпутаты Сейма Польшчы, кіраўнікі арганізацый і прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Варшаве, польскіх грамадскіх арганізацый, прадстаўнікі Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, супрацоўнікі Пасольства, прадстаўнікі СМІ Польшчы.

Перад пачаткам вечара Пасол Павел Латушка ўручыў старшыні Таварыства "Польшча — Беларусь" Баляславу Хмялінскаму Ганаровую грамату Міністэрства замежных спраў Беларусі — за шматгадовую плённую дзейнасць і значны асабісты ўклад у развіццё беларуска-польскіх сувязяў.

Падчас імпрэзы адкрылася выстаўка вядомага польскага мастака, выхадца з Беларусі, Сергіюша Грудкоўскага. Многа цёплых слоў было сказана пра гэтага незвычайнага чалавека і выдатнага мастака, які праз усё жыццё захаваў любоў да Слонімшчыны, дзе прайшлі яго дзіцячыя і юнацкія гады, і які падараваў у 2006 годзе Слонімскаму краязнаўчаму музею калекцыю сваіх акварэляў. У гэты вечар С. Грудкоўскі падараваў некалькі мастацкіх работ і Пасольству. У знак удзячнасці за плённае супрацоўніцтва з Пасольствам і непарыўную сувязь з Беларуссю С. Грудкоўскаму былі ўручаны памятны дыплом і падарунак Пасольства.

З цікавай сольнай праграмай на вечары выступіў заслужаны артыст Беларусі спявак Якаў Навуменка. На вечары таксама спявала шматразовы лаўрэат агульнапольскіх фестываляў "Беларуская песня" ўраджэнка Гродзеншчыны Крысціна Сульжыцкая.

Прысутныя ўбачылі відэафільмы пра Беларусь, фрагменты выстаўкі "Беларуская экзотыка" нашага фотамастака Сяргея Плыткевіча, змаглі пачаставацца беларускімі стравамі, паўдзельнічаць у навагодняй латарэі і выйграць беларускія сувеніры і прызы.

Беларускі вечар выклікаў вялікую цікавасць у яго гасцей, прайшоў у вельмі прыязнай атмасферы. Многія з прысутных, прадстаўнікі беларускай дыяспары выказалі ўдзячнасць Пасольству за магчымасць удзелу ў традыцыйных беларускіх мерапрыемствах, пазнаёміцца з сучасным мастацтвам нашай краіны.

А 12 — 13 студзеня ў Варшаве адбыўся традыцыйны Беларускі навагодні баль, які праводзіцца ўжо больш як 30 гадоў варшаўскім аддзелам Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы і Цэнтрам славянскай культуры ў Варшаве. Апошнім часам актыўнае садзейнічанне ў падрыхтоўцы і патранат над балем ажыццяўляе Пасольства Беларусі ў Польшчы. Сёлета на гэтай імпрэзе прысутнічалі этнічныя беларусы як з Варшавы, так і з некаторых іншых гарадоў Польшчы, беларускія дыпламаты — усяго каля 200 чалавек. Многія наведваюць балі ад пачатку іх арганізацыі.

Гэтым разам тут з вялікім поспехам прайшла канцэртная праграма Якава Навуменкі, запрошанага Пасольствам у Варшаву. Традыцыйна было прадстаўлена мастацтва беларускай меншасці Беласточчыны, сёлета — эстрадным ансамблем "Лідэр" з Беластока.

З навагоднімі віншаваннямі да прысутных звярнуўся Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка. Ён падкрэсліў важную ролю правядзення беларускіх баляў у Варшаве, якія спрыяюць захаванню этнічнай адметнасці беларусаў Польшчы, умацаванню сяброўства і добрасуседскіх адносін паміж беларускім і польскім народамі.

Падчас балю прайшла навагодняя латарэя з каштоўнымі прызамі, падрыхтаванымі Пасольствам (беларускія сувеніры, альбомы, календары і інш.).

**Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ,**
**саветнік Пасольства Беларусі ў Польшчы**

***На здымку: выступленне Я. Навуменкі ў час беларускага вечара ў Пасольстве.***

# Мёртвыя не крыўдуюць

## Суб'ектыўныя развагі пра сучасную літаратурную крытыку

САПРАЎДЫ
(РАЗВАГІ ПРА КРЫТЫКУ)

Сёння на кожным кроку толькі і чуеш роспачна-трывожнае: "Чаму няма вострай, прынцыповай крытыкі? Куды падзеліся аўтары злабадзённых рэцэнзій і артыкулаў? Што будзе з літаратурай без яе крытычнага асэнсавання?". Шчыра кажучы, слухаць бясконцую гаварыльню пра крызіс жанру не тое, што надакучыла, а ўжо проста абрыдла. Замест таго каб займацца сваёй непасрэднай работай, большасць патэнцыяльных крытыкаў скардзіцца на адсутнасць высокамастацкіх тэкстаў, крыўдлівасць аўтараў, з-за чаго, маўляў, цалкам знікае ахвота займацца няўдзячным рамяством. Падобныя размовы *вакол ды каля* не прыносяць нічога, апроч уласнай дыскрэдытацыі. З чарговым *крыкам душы* пазнаёміўся ў № 12 часопіса "Маладосць" за 2007 год. Ігар Запрудскі ў развагах пра крытыку "Сапраўды" распісаўся ў асабістай бездапаможнасці, чым выявіў незайздросны стан сучаснага літаратурнага працэсу.

Аўтар здзіўляе непаслядоўнасцю прафесійнай пазіцыі. З аднаго боку, Ігар Запрудскі шчыра заклапочаны адсутнасцю некампліментарнай крытыкі, а з другога — абачліва прызнаецца, што наўмысна корпаецца ў літаратурных тэкстах XIX стагоддзя, пакідаючы сучаснасць сваім калегам: маўляў, мёртвыя не крыўдуюць, а жывыя могуць і *ў вуха заехаць*. Чыста беларуская пазіцыя — талерантная да непрыстойнасці. Не, каб без лішняга *шуму і пылу* ўзяць новы паэтычны ці празаічны зборнік, часопісную публікацыю ды пачаць скрупулёзнае літаратурна-мастацкае даследаванне, але аўтар у эмацыянальным экстазе *нашпігоўвае* развагі дэкларацыйнымі маніфестамі ды рэвалюцыйнай лозунгавасцю: "Толькі наперад, таварышы крытыкі! Нічога не бойцеся! Я з вамі!".

Ад бясконцых аўтарскіх пытанняў кшталту "чаму?", "як?", "дзе?" робіцца ніякавата. Дарослы чалавек, а не разбярэцца ў простых рэчах! Сапраўднай крытыкі няма таму, што ў ёй ніхто не зацікаўлены, не зважаючы на ўяўны дэфіцыт. Яна — штука небяспечная. Ніколі не здагадаешся, чым абернецца крыўдлівае (няхай і ў адносінах да твора) слова бескампрамісснага крытыка. Усім хочацца жыць дружна. Па біблейскіх запаветах. А на адшчапенца навешваецца ярлык шкодніка і паклёпніка. Вось і жыві з ім да канца жыцця. Весела...

У сённяшніх умовах прафесійная крытыка павінна мець прагматычнае апраўданне ў выглядзе годных грашовых дывідэндаў з боку заказчыка, якім можа выступаць газета ці часопіс (гаворка не ідзе аб прапла-чаным піяры). Пагадзіцеся, які сэнс мне, чалавеку дужа начытанаму і амбіцыйнаму, траціць час на пісаніну чарговага графамана? Ад пасрэдных тэкстаў пакрысе становішся неадэкватным у паводзінах. Голы ж энтузіязм няхай застаецца ў калекцыі чалавечых заваёў савецкай эпохі. Мне патрэбна нешта больш адчувальнае і рэальнае. Крытык павінен быць сацыяльна абаронены ад магчымых наступстваў сваёй *падрыўной* дзейнасці. Няхай мяне ненавідзяць паэты, няхай са мной не вітаюцца празаікі, няхай я застануся сам-насам у гэтым адзінотна-непрыкаяным жыцці, але я не буду ні ад кога залежным у любімай рабоце, за якую добра плацяць. Разумею, марыць не шкодна. Тым не менш недасяжны пакуль ідэал з цягам часу дакажа сваю запатрабаванасць і жыццяздольнасць. Пры ўмове, што знойдуцца насамрэч здольныя аўтары-крытыкі. Бо сённяшняя псеўдакрытычная самадзейнасць на старонках айчынных газет і часопісаў не мае нічога агульнага з сапраўдным аналізам мастацкіх тэкстаў. Няўжо аўтарам трафарэтна-шаблонных рэцэнзій у духу школьных сачыненняў-водгукаў не сорамна за сваю халтуру? Як ставіцца да падобнай *крытыкі*? Як да звычайнага анансіравання — і не больш.

Неадназначныя думкі выклікае і недастаткова вызначаная *кулуарная* пазіцыя Леаніда Галубовіча ў вядомай лімаўскай рубрыцы, пасля прачытання якой застаецца дваістае ўражанне: нібыта крытык і крытыкуе *падследнага* аўтара, а нібыта і захапляецца ім. Часам і не зразумееш, дзеля чаго крытык распісвае творчасць чарговай *ахвяры* ў лірычна нязмушанай, іншы раз і проста побытавай манеры. Атрымліваецца, на першы погляд, сінтэз несумяшчальнага, але пазнаваўчага чытва з забаўным ухілам. Напэўна, гэта адзін з альтэрнатыўных варыянтаў сучаснай крытычнай думкі...

Павярхоўнасць, расплывістасць ацэнак, адсутнасць належнай глыбіні, жыццёвага і кніжнага досведу ў *крытыкаў-аматараў* прыводзяць да таго, што тэксты іх рэцэнзій з'яўляюцца сяброўскім пацалункам сумніўнай якасці. Лічу: калі хваліш, то хвалі грунтоўна і прафесійна, а не моўнымі клішэ ды абстрактнымі ізмамі, за якімі цудоўна хаваецца ўласная некампетэнтнасць і шэрасць мыслення.

Паважаныя крытыкі, у тым ліку і згаданы Ігар Запрудскі, давайце ў далейшым не займацца моташнымі нараканнямі на лёс прафесіі ў выглядзе трывожных *разваг на тэму*, а пісаць канкрэтныя цікавыя рэцэнзіі і артыкулы, за якія не будзе нікому сорамна. Ад гэтага рэальна больш карысці і аўтарам, і ўсёй літаратуры. У гэтым сутнасць мастацкай творчасці і яе сэнс. Калі яна будзе напоўненая *жывым* зместам, то пытанні аб лёсе крытыкі знікнуць самі сабой.

**Сяргей ГРЫШКЕВІЧ**

# Паляванне на драбнату

**Цяжка не пагадзіцца з выказваннем Джона Фаўлза: "Любы суддзя і сам рана ці позна становіцца падсудным. І прысуд яму выносяць вынесеныя ім жа прысуды". Я гэта да таго, што мне трошкі дзіўнавата было пачуць рытарычнае пытанне "Якой мусіць быць мадэрная крытыка?" ад самога крытыка. Для мяне пачутае раўнаважна таму, калі б, напрыклад, дантыст стаў бы нахабна хлусіць, што вырве зуб без анестэзіі і без болю. Але адкінем эмоцыі і паспрабуем паразважаць над некаторымі і сапраўды надзённымі пытаннямі, якія ставіць перад намі Ігар Запрудскі ў артыкуле "Сапраўды" ("Маладосць", № 12, 2007 год), а датычаць яны менавіта нашай сучаснай крытыкі.**

Неяк у часопісе я прачытаў крытычны артыкул Данілы Жукоўскага "Вылоўліванне ідэй з паветра". Вядома, гаворка ў ім ішла зусім пра іншае, але артыкул запомніўся не столькі зместам, колькі сваёй неардынарнай назвай. І нездарма, як паказвае час. Бо гэтае словалучэнне і магло б стаць эпіграфам для гэтых палемічных разважанняў. Асабіста для мяне большасць нашых айчынных крытыкаў і літаратараў якраз і з'яўляюцца гэтымі "духаловамі", часта з адбойнымі малаткамі, чым з ружовымі дзіцячымі падхватнікамі для лоўлі бяскрыўдных матылькоў. Разумею, што адно і другое — крайнасці, але яны якраз і характэрныя для айчыннай крытыкі.

Алесь Адамовіч сцвярджаў: "Няма такога абсурду, які не можа стаць рэальнасцю". Мне здаецца, што на пытанні, якія ўздымаюцца перад чытацкай аўдыторыяй спадаром Запрудскім, здольны даць адказы любы больш-менш эрудзіраваны вучань сярэдняй школы. Не сумняваюся, што ведае на іх адказы і аўтар артыкула. Тады для чаго ўсе гэтыя "тралі-валі"? Не думаю, што для таго, каб пачуць у адказ: "Якая літаратура, такая і крытыка!". Бо каму невядома, што яблык ад яблыні далёка не падае. Гэта ж ісціна. Скажу больш: бачыць аўтар і тое, што на старонках айчынных СМІ ідзе занудлівае мусоленне твораў адных і тых жа пісьменнікаў, бо дзе, маўляў, лепшых возьмеш. Але і тыя "перлы", неабходна ўдакладніць, маюць штучную навуковую афарбоўку, нафаршыраваную "казённымі" тэрмінамі, ад якіх можна хіба што вывіхнуць мазгі. Таму хочацца верыць, што аўтар агаляе праблему з надзеяй памяняць нешта з дапамогай шырокай аўдыторыі. Вось толькі ці атрымаецца ў яго гэта? Адказы на пастаўленыя пытанні ляжаць, здаецца, на паверхні, але, нават адказаўшы на іх, нічога не зменіцца. У нас адсутнічае школа крытыкі, і яе трэба ствараць. Тупа браць Гарэцкага і чытаць...

Пішу гэта, а самому ўзгадваюцца школьныя гады, як мы па падручніку таго ж Бялінскага, не чытаючы твораў, маглі пісаць сачыненні на розныя тэмы. І рабіць гэта было не цяжка, бо, прачытаўшы той ці іншы артыкул майстра, можна было пераканаць настаўніка, што ты прачытаў сам твор. Назавіце мне сучасных крытыкаў, якіх можна было б прывесці ў прыклад? Вядома, пры жаданні можна ўзгадаць некалькі таленавітых аўтараў. Але іх можна пералічыць на пальцах адной рукі.

Наша крытыка хворая на дзве крайнасці: празмерна кампліментарная альбо "жалезабетонная", "куленепрабівальная". Праўда, апошнім часам у друку з'яўляюцца артыкулы ў стылі "два ў адным". Гэта значыць — і нашым, і вашым. Сапраўдны сэнс у іх настолькі майстэрскі схаваны і заблытаны, што з першага прачытання нават і не зразумееш, што хацеў сказаць чытачу аўтар. З аднаго боку, ён нібыта аналізуе прачытаны твор, расстаўляе на свае месцы акцэнты, выяўляе недахопы і ў той жа час, не саромеючыся, апраўдвае наяўную шэрасць і бяздарнасць. Што тут скажаш? Маем тое, што маем. Як гаворыцца: дзякуй і за гэта! Бо паспрабуйце яшчэ знайсці дурня, які б прачытаў дурноту іншага і ў дадатак яшчэ б напісаў пра гэта... Адсюль, напэўна, і страх нажыць сабе ворагаў, паколькі літаратура наша *недасканалая*. Бо што можна напісаць пра *недасканалае*?..

А крытыка — гэта таксама мастацтва. І ёю, як і літаратурай, павінны займацца творчыя людзі. Крытычныя артыкулы стануць цікавымі чытачам толькі тады, калі яны будуць напісаныя таленавіта, з густам, жывой, зразумелай шырокай чытацкай аўдыторыі мовай, а не сухімі навуковымі штампамі. Я нічога не маю супраць навукоўцаў, зразумейце мяне правільна, я толькі супраць творчай абмежаванасці. Бо думку нельга ўтрымаць. Бо, як сцвярджае той жа Алесь Разанаў: "Думка — пераход: са стану ў стан, з плана на план. Яе нельга затрымаць і прысвоіць: затрыманая яна абрываецца, прысвоеная — дранцвее, ператвараецца, як у народных паданнях пра нячыстае золата, у попел і смецце". Нельга ж успрыняць верш, як твор, калі ён напісаны сухімі навуковымі штампамі. Чаму ж тады падыход да крытыкі павінен быць іншым? Крытыка такі ж твор, а значыць ён павінен быць дасканалым.

З сучасных аўтараў, якія займаюцца крытыкай, мне больш блізкі рускамоўны Аляксандр Геніс. Яго творы заўсёды чытаеш з цікавасцю і задавальненнем, як апавяданне, як аповесць... А колькі ў іх паэзіі?! Гэта, як мне здаецца, і ёсць той крытэрый, якога павінны прытрымлівацца творцы. Ну, а калі пісаць толькі пра сябе і дзеля свайго таннага самасцвярджэння, як гэта робіць большасць нашых крытыкаў, тады і не трэба здзіўляцца, што так атрымліваецца. Такая крытыка патрэбная толькі самім крытыкам. Не думаю, што знойдуцца пісьменнікі, якія пагодзяцца, каб нехта самасцвярджаўся за іх кошт. Але гутарка нават і не пра пісьменнікаў, бо крытыка пішацца не для таго, каб задаволіць іх самалюбства, яна пішацца, як нейкі дапаможнік для тых жа вучняў, студэнтаў... Чытаючы сучасную крытыку, неаднойчы лаўлю сябе на думцы, што лягчэй і карысней пачытаць таленавіты твор, чым чытаць чужую амбіцыйную дурноту пра паляванне на клапоў ды іншую драбнату...

**Алесь ПАПЛАЎСКІ**

*Так, у 12-м нумары часопіса "Маладосць" за мінулы год быў выдрукаваны палемічны артыкул* ***"Сапраўды".***

*Але з чаго пачаў Запрудскі? З адваротнага — што няма ні крытыкаў, ні крытыкі. А былі ж (млосна ўспамінае-пацягваецца ён)! Ды што крытыкі, тады нават пісьменнікі ў гэтай іпастасі выступалі так, што сучасным крытыкам і не снілася. Да прыкладу, Янка Брыль. І спадар Ігар прыводзіць ажно дзве цытаты з народнага пісьменніка, дзе крытыкуюцца* ***нейкія*** *творы* ***нейкіх*** *літаратараў. "Не будучы брылязнаўцам, — піша Запрудскі, — нават я магу высветліць з малой доляй пагрэшнасці, пра каго і пра якія творы так няветліва адгукнуўся народны". Але ж, во дзівак, насуперак заяўленаму, следам за Брылём, чамусьці не высвятляе і не называе...*

*Так і хочацца сказаць, мілыя мае беларускія "пісаравы-бялінскія", пустаслоўя, фіміяму і дыфірамбаў хапала ў літаратурнай крытыцы ва ўсе часы. І вялікія, здаралася, памыляліся ў сваіх ацэнках, як Талстой з Шэкспірам... Але ж заяўлялі пра тое адкрыта, як і належыць вялікім. Спадар Паплаўскі мройліва даводзіць, што раней можна было нават не чытаць саміх твораў пісьменнікаў, а толькі крытыку на іх, і пасля таго смела здаваць залік ці экзамен. Але ж, дарагі дружа, ці заўважыў ты, што сучасны выбітны раман сёння мае куды меншы аб'ём, чым некаторыя класічныя артыкулы Бялінскага? Дык што чытаць і дзе на тое ўзяць часу сённяшняму чалавеку па-за ўсімі іншымі сучаснымі запатрабаваннямі душы і розуму?*

*На мой погляд, у сённяшняй крытыкі трохі іншыя, скажам, мадэрнізіраваныя, задачы і функцыі. Пакінуўшы некалі асноўныя з іх літаратуразнаўству, крытыка цяпер сталася прапагандыстам і, па-сучаснаму кажучы, прамоутэрам на вачах згасаючай "літаратурнай продукцыі", як калісьці называў творы пісьменнікаў М. Гарэцкі. Хоць, вядома, крытыка паранейшаму застаецца ўладальніцай той лакмусавай паперкі, якой літаратура і літаратар вывяраюцца на мастацкую якасць, талент і запатрабаванасць.*

*Ды, пагадзіцеся, і сама сучасная літаратура ўжо не так вучыць і маралізуе, як узбуджае розум і ўсцешвае душу. Канаючы і пры гэтым змяняючы свае формы, яна, як адзін з відаў мастацтва, усё яшчэ не дае згасаць чалавечаму духу... Сыходзячы са сказанага, я думаю, прызнанне* ***Крытыка*** *заваёўваецца паслядоўным сумленным жыццём у літаратуры, адметным літаратурным талентам і несумненнай чалавечай годнасцю.*

*Што да чытача, то ён сёння, у пераважнай большасці, даволі дасведчаны, адукаваны чалавек, нярэдка інтэлектуал, сам крытык па сваёй сутнасці і, паверце мне, без чужой падказкі добра разумее кошт мастацкага літаратурнага плёну. Яму, калі сказаць шчыра, найперш цікава само знаёмства з літаратарам, як са звычайным чалавекам і часовым субяседнікам, з якім можна з задавальненнем правесці вольны ці самотны час (як ні дзіўна пры такой тэхнічнай камунікабельнасці сучасны чалавек пераважна душэўна адзінокі)...*

*Прафесійная ж крытыка, перадусім, патрэбна для аб'ектыўнага адбору хрэстаматыйных твораў для школьных праграм ды для выкладчыкаў і студэнтаў гуманітарных дысцыплін ВНУ, асабліва журфакаў і філфакаў.*

*І наастатку. Няўжо напраўду вы лічыце, што "ЛіМ" — гэта менавіта тое выданне, дзе бракуе крытыкі на розны густ, у тым ліку і грунтоўнай? Успомніце артыкулы і рэцэнзіі Ю. Сапажкова, Л. Алейнік, Г. Кісліцынай, Я. Гарадніцкага, І. Шаўляковай, Н. Капы, Ц. Чарнякевіча, А. Цяўлоўскага, А. Андрэева, М. Южыка, А. Бязлепкінай, Ж. Капусты ды тых жа самых С. Грышкевіча і А. Паплаўскага... Дарэчы, у тыднёвіку "ЛіМ" хапае іскрамётнай і бунтоўнай крытычнай думкі! Таму хацелася б пачуць у распачатай палеміцы і словы тых, у каго, можа, менш амбіцый, але значна больш фактуры...*

*А што да нашых палемістаў, то, улічваючы іх уласныя паэтычныя і празаічныя набыткі, хацелася б запытацца (выбачаюся, можа, залішне фрывольна): хлопцы, на каго бочкі коціце?!*

*Але — ціха, слухаем грукат...*

***Аддзел крытыкі "ЛіМа"***

**У Літаратурным музеі Петруся Броўкі адкрылася выстава мініяцюрнай кнігі з асабістай калекцыі Яўгена Ксяневіча. У калекцыі прадстаўлены мініяцюрныя кніжачкі, пачынаючы з канца XIX стагоддзя да нашых дзён.**








# Малыя кніжкі вялікіх аўтараў

Сярод іх выданні на грузінскай, армянскай, азербайджанскай, узбекскай, туркменскай, літоўскай, латышскай і эстонскай мовах. Асобнае месца займаюць даваенныя кніжкі-малюткі твораў Гёте, набраныя гатычным шрыфтам. Але што такое "мініяцюрныя выданні"? У сучаснай беларускай літаратуры трывала ўсталяваўся гэты тэрмін, які прыйшоў да нас яшчэ з савецкіх часоў. У замежнай літаратуры, асабліва англійскай і нямецкай, найбольш часта ўжываецца тэрмін "мікраскапічныя выданні", ці яго лацінізаваная форма "мікрабіблон". Мала хто ведае, што мініяцюрныя выданні ў сваю чаргу падзяляюць на малафарматныя і мініяцюрныя. Максімальны памер малафарматных выданняў не павінен перавышаць 100х125 мм, а мініяцюрных — 50х62 мм. Самая маленькая кніжка, якая экспануецца ў музеі, мае памер 45х50 мм. Гэта цудоўнае выданне ўрыўкаў з твораў М. Шолахава.

Мініяцюрныя кнігі існавалі яшчэ ў антычным свеце — задоўга да ўзнікнення кнігадрукавання. Пліній Старшы (каля 24—79 гг. н.э.) нагадвае аб мікраскапічным экземпляры "Іліяды" Гамера, які быў напісаны на такім малым світку пергамента, што яго можна было змясціць у арэхавую шкарлупку. На працягу стагоддзяў інтарэс да мініяцюрнай кнігі не аслаб. Шмат рукапісных кніг-ліліпутаў пакінула нам сярэдневечча. Майстэрства мініяцюрнай каліграфіі дажыло і да нашых дзён. Самай маленькай кнігай у свеце з'яўляецца мініяцюрны рукапісны "Кобзар" Тараса Шаўчэнкі, памерам 0,6х0,6 мм. У кнізе 12 старонак на якіх партрэт паэта і 6 яго вершаў. Памер літар, якімі напісаны тэкст, складае 0,0035 мм. Прачытаць такі тэкст не дапаможа нават моцная лупа.

Старэйшым з вядомых мініяцюрных старадрукаў з'яўляецца "Майнцскі Дыурналій", надрукаваны вучнем Яна Гутэнберга Петэрам Шэферам у 1468 годзе. Але ў тыя часы мініяцюрныя выданні былі адзінкавымі і іх выданне залежала ад прыхамаці кнігавыдаўца. Толькі ў канцы XVIII — першай палове XIX стагоддзя мініяцюрныя выданні атрымліваюць шырокае распаўсюджванне, у першую чаргу яны былі адрасаваны дзецям. У другой палове XIX стагоддзя мода на маленькія кніжкі праходзіць, але яны атрымліваюць новы сацыяльны кірунак — гэта рэвалюцыйная і забароненая літаратура, прызначаная для таемнага ўвозу ў Расійскую імперыю. Першая дакладна вядомая кніжка-малютка, надрукаваная на тэрыторыі Беларусі, была выдадзена ў Мінскай друкарні Стэфановіча ў 1833 годзе і называлася "Подарок благонравным ученикам и ученицам на новый 1834 год или Нравоучительные детские повести, служащие к образованию ума и сердца" А. Паўлава. Цяпер гэта кніга захоўваецца ў Дзяржаўнай Публічнай бібліятэцы імя М. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу.

У часы савецкай улады выпуск мініяцюрных выданняў не быў спынены. Прыкладам можа служыць "Конституция РСФСР», надрукаваная ў 1921 годзе, тыражом 1000 адзінак. 30-я гады гісторыі савецкай мініяцюры былі часам росквіту палітычнай, вытворчай і навукова-папулярнай літаратуры. Пашыраецца агітацыйная і прапагандысцкая літаратура. Амаль усе значныя партыйныя і дзяржаўныя дакументы ў тыя гады паралельна выдаваліся і ў малым фармаце. Так, у 1953 годзе ў Мінску выходзіць "Устав Коммунистической партии Советского Союза".

У 1967 годзе да 50-годдзя Кастрычніка выдавецтва "Беларусь" і Мінскі паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа сумесна падрыхтавалі і выдалі мініяцюрныя томікі вершаў Якуба Коласа і Янкі Купалы. Выданне было падрыхтавана і выпушчана на грамадскіх пачатках. З той пары выданне мініяцюрных кніжак не спыняецца. На выставе асобны раздзел, прысвечаны беларускай мініяцюрнай кніжцы. Там прадстаўлены творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Петруся Броўкі і іншыя.

У нашыя дні мініяцюрная кніга лічыцца вышынёй паліграфічнага майстэрства.

**Ганна ЛОБУЗАВА**

# Перыферыя? Не, глыбінка

**Аляксандр Анісковіч, як і мільёны сучасных гараджан, дзіцё вёскі, у даўнасці гаспадарнай, заможнай, з адметнымі нацыянальнымі традыцыямі. Сялібы расцярушваліся ўжо на нашай памяці пры меліярацыі, зносіліся як "неперспектыўныя". Раскіданыя гнёзды пазбаўляліся радаводных каранёў, нівеліраваліся фарбы ментальнасці, пылюка трасянкі на гумне пераносілася ў трасянку маўлення. Высяленне сэрцаў з прадаўніх радовішчаў прыглушала душы...**
**Усё гэта магло прывесці нас да безназоўнасці. Але гадуецца, як кажуць на Міёршчыне, отмаладзь.**



Бацькі Аляксандра Анісковіча мелі прытул у Барсуках, вёсцы паблізу старажытнага мястэчка Лявонпаль, былой графскай рэзідэнцыі Лапацінскіх. Чым жа прыхарошвалася зямля на падкове Дзвіны? Якой чыннасцю тамтэйшага люду хочацца пахваліцца? Ці можна паўглядацца ў чароўнае люстэрка Памяці?

Атлантыду жыццядзейнасці землякоў прыўздымае Аляксандр Анісковіч — выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута. Цяпер ён жыве ў Віцебску і працуе па спецыяльнасці вонкавай рэкламы. Але натхненне пры кожнай магчымасці кліча яго на Шлях з Грэкаў у Варагі: Дзвіна-Рубон дапамагае яму ўздымаць Лявонпаль на курган помнасці. Прайшоў там пленэр маладых мастакоў "У пошуках Атлантыды", і ён праз год выдае сваім коштам цудоўна афармлены буклет "Лявонпаль і маладыя мастакі" — "у знак падзякі Радзіме маіх продкаў". Ён сам разам з жонкай Наталляй быў удзельнікам пленэру і крыху пазней (пасля ўсіх выставак), прывёз у лявонпальскі "Музей Радзімазнаўства" падарункі ад мастакоў і свой творчы наробак, у тым ліку выкшталцоныя шыльды для музея і яго філіяла "Хата бабкі Ядзвінні". На шыльдзе, якая вісіць цяпер на Ядзвіннінай хаце, пазначана, што гэта "народны" музей. Такое званне яму яшчэ не нададзена, але за 8 гадоў існавання музей-скарбец займеў прывабу ў турыстаў.

Сёлета А. Анісковіч напісаў удумнае эсэ "Помнік гісторыі НАШАЙ Радзімы" — з ілюстрацыямі-ўзнаўленнямі Бацькаўшчыны. Гаворка ідзе пра наша-айчыннае асэнсаванне галоўнага лявонпальскага помніка — Калону ў гонар Канстытуцыі 3 мая 1791 г., першага на еўрапейскім кантыненце прававога закону. Аўтар нагадвае, што мы, нашчадкі Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай (многіх народаў), не павінны магутныя пласты гісторыі аддаваць на прыўлашчванне суседзям, асушваць-меліярызаваць яе, а наадварот — выносіць на пасад, выстаўляць на свет цэлы духоўныя здабыткі НАШЫХ продкаў. Тады сучаснікі, спадкаемцы іх векапомнай чыннасці, будуць ганарыцца імі, мацаваць свой стваральны дух.

Адметным мастацкім (і рэкламна-турыстычным) выданнем мог бы быць і падрыхтаваны А. Анісковічам буклет "Лявонпаль — былое і сучаснае" (жывапіс, графіка, камп'ютэрныя рэканструкцыі). Мне, як заснавальніку "Музея Радзімазнаўства", былому вучню мясцовай школы, цікава паўглядацца ў трапяткія выявы палаца, былой уніяцкай царквы, у якой быў ахрышчаны, у брамы, у сядзібныя абрысы, у вочы местачкоўцаў на даўніх здымках... Знікае горыч ад знябожанага выгляду сучасных пабудоў, якія ў сваёй велічы паўстаюць на старонках буклета А. Анісковіча. І мая глыбачка-глыбінка просіць заступіцца, не выводзіць яе ў правінцыйныя сховы, просіць пашкадаваць яе, адрадзіць і далучыць у пашанотныя абрысы Айчыны. Вось толькі б асмеленасці і рашучасці ўсім нам. А лявонпальскі Аляксандр амаль што ўскаціў на прыдзвінскае ўзгор'е свой цяжкі валун!

**Сяргей ПАНІЗНІК**

***На здымках: работы А. Анісковіча***

# Ажываюць старонкі мінулага

**Зусім нядаўна пакінуў нас Пятро Прыходзька. Знаёмы з ім я быў яшчэ ў далёкія 40-я (пасляваенныя) гады, калі я з'яўляўся студэнтам філалагічнага факультэта БДУ. Пятро Прыходзька падтрымліваў з намі кантакты ды і на нашым курсе знайшоў сабе жонку — Зою Разумаву. На здымку яна — з правага боку ад Пятра. А жыла яна на Камсамольскай вуліцы, № 1. Тут часта збіраліся сябры, каб прыемна правесці час у гутарках, жартах, успамінах. У вясёлай кампаніі мы сустрэлі калісьці і новы 1948 год. З таго часу прайшло цэлых 6 дзесяцігоддзяў.**

Сёння надарылася асаблівая аказія ўшанаваць яго памяць. Незадоўга перад смерцю ён прыслаў мне вялікую (89 чатырохрадковых строф) паэму "У свеце міжнародных адкрыццяў. Балада паводле здабыткаў нацыянальных літаратур, у прыватнасці, беларускай". Адначасова паведаміў, што паслаў яе ў часопіс "Роднае слова". Я адказаў яму, што для "Роднага слова" паэма не падыходзіць і што яе яшчэ трэба сур'ёзна дапрацаваць. Але гэта абавязкова трэба зрабіць. Я паслаў свой ліст па адрасе, які быў запісаны на яго канверце, але мой ліст у рукі Пятра Прыходзькі не трапіў і вярнуўся да мяне. А дапрацаваць твор аўтар ужо не паспеў.

Паэма па задуме арыгінальная. У ёй разглядаецца наша літаратурнае развіццё на працягу стагоддзяў на фоне багатых гістарычных падзей. І калі б хтосьці з паэтаў узяўся яе сёння дапрацаваць, то ўзбагаціў бы беларускую літаратуру. І аўтарамі маглі б лічыцца абодва паэты — Пятро Прыходзька і той, хто яе ўзяўся б дапрацаваць.

Вось якую задачу сам аўтар ставіў перад сабою:

*Дарэмнымі не стануць словы,*
*Якія рвуцца на прастор.*
*Хай у любві да роднай мовы*
*Дадуць святла ёй больш ад зор.*

*Не толькі я пра росы ў доле*
*Завязваю з слоў вузел свой.*
*Гэта павінны дзеці ў школе*
*Лічыць навукаю жывой.*

І ўсяму зместу твора адпавядае яго заключэнне:

*Прыгожай, шчыраю і мілай,*
*Як лекі для балючых ран,*
*Сваім цудоўным "Дзівасілам"*
*Жыць будзе Вера Палтаран.*

*У родным Беларусі краі*
*Пісьменніцы знайшлі свой шлях:*
*Ён — у Баравіковай Раі,*
*Ніны Мацяш і Соф'і Шах.*

*Аповесці Бондар Таісы*
*Пра родны край, яго жыццё,*
*Людзей малюючы абрысы,*
*Сваё рабілі адкрыццё.*
*.....*

*Прабачце, ўсе майстрыцы слова,*
*Якіх я тут назваць не мог.*
*Усе мы будзем адмыслова*
*Новых шукаць творчых дарог,*

*Каб дружна ў пошуку няспынным*
*Мець сувязь цесную з жыццём,*
*І ў творчай працы для краіны*
*Заўжды быць новым адкрыццём!*

**9 ліпеня 2006 г.**

**Уладзімір КАЗБЯРУК**

## Аб'ява

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрашае на творчую вечарыну "Голас і рэха", прысвечаную выдатнаму дзеячу беларускай літаратуры, журналісту Навуму Гальпяровічу.

*Вечарына адбудзецца 5 лютага 2008 года.*
*Пачатак а 17-й гадзіне.*
*Чакаем па адрасе: вул. Янкі Купалы, 4.*

№ 5 1 лютага 2008 г. ЛіМ

# «Песня задуменная Палесся»

**Творчасць Галіны Дашкевіч, якая засведчана ў яе паэтычных зборніках "Верасніца", "Паўлік кніжачку чытае", шматлікіх публікацыях у калектыўных зборніках, часопісах "Маладосць", "Полымя", штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" ды інш., бярэ пачатак у далёкія ўжо 60-я гады XX ст., калі яна была студэнткай філалагічнага факультэта Мазырскага педінстытута. Тады ўжо на адным з семінараў будучы прафесар літаратуры Міхаіл Апанасавіч Палкін прапанаваў першакурснікам прачытаць свае вершы, ставіўшы, відаць, задачай выявіць тых, хто не абдзелены паэтычным талентам.**

У ліку такіх найперш была і бялявая сціплая дзяўчынка з-пад Турава Галя Клімовіч, якая, крыху саромеючыся, прачытала зацікаўленай і прыціхлай аўдыторыі некалькі сваіх вершаў, напісаных ёю яшчэ ў школьныя гады. М. Палкін пачаў каменціраваць толькі вершы Галі Клімовіч, выяўляючы ў іх паэтычныя знаходкі, а потым і недахопы — пераважна паэтычныя лозунгі і штампы або празмерную сентыментальнасць, ідылічнасць, уласцівыя, мабыць, амаль кожнаму пачаткоўцу.

У наступныя гады маладая паэтэса далучылася да мастацтва слова: студэнткай, а потым настаўніцай роднай мовы і літаратуры, яна стала выдатнай чытальніцай мастацкіх твораў, выступаючы ў школах і працоўных калектывах Мазыра, а потым — вядучай актрысай у Мазырскім народным тэатры, дзе ў поўную меру раскрыўся яе дар драматычнай актрысы. Яна бліскуча і пераканальна выконвала ролі *Паўлінкі* ў аднайменнай камедыі Янкі Купалы, *Зосі* ў драме "Раскіданае гняздо" гэтага ж класіка, ролю *Зіны*, а затым *Надзеі* ў макаёнкаўскім "Трыбунале" ды інш.. Пра гэта паэтэса скажа потым вершаванымі радкамі: *"Я іграла Паўлінку, як ніколі раней не іграла, мне здалося, што з залы на мяне пазірае Купала"*. "Эмацыянальная, вельмі непасрэдная, з велізарным абаянням, яна прынесла з сабой на сцэну паэзію зялёных лясоў і ціхіх рэк. Свет купалаўскіх герояў стаў незвычайна блізкім для Галіны. Роля Зоські яе літаральна захапіла". Так характарызаваў Галіну як актрысу заслужаны дзеяч культуры Беларусі Міхаіл Яўхімавіч Колас у артыкуле "Знайсці сваю дарогу" ("Савецкая Беларусь", 22 кастрычніка 1968 года).

Варта адзначыць, што Галіна Мікалаеўна стаяла ля вытокаў Мазырскага драматычнага тэатра імя Івана Мележа. Пры яе ўдзеле былі ажыццёўлены на мазырскай сцэне выдатныя пастаноўкі драматычных твораў з рэпертуару Янкі Купалы, Кандрата Крапівы, Андрэя Макаёнка, Івана Мележа, Георгія Марчука ды іншых, а з пастаноўкай п'есы Янкі Купалы "Раскіданае гняздо" тэатр нават трапіў у Крамлёўскі Палац, дзе заваяваў 7 залатых медалёў. Калектыў тэатра, дзе галоўныя ролі з 1967 г. амаль нязменна выконвала Галіна Дашкевіч, з вялікім поспехам удзельнічаў ва ўсесаюзных фестывалях тэатральнага мастацтва, пасля чаго набыў статус прафесійнага і стаў асноўным культурным асяродкам на Палессі.

Паэтычны дар Галіны Дашкевіч быў заўважаны крытыкай. Яе вершы, зборнікі былі прыхільна сустрэты чытачамі, літаратуразнаўцамі. У рэцэнзіях, водгуках адзначалася, што прываблівае ў вершах паэтэсы прастата мастацкіх вобразаў, яе адкрытасць, "будзённая чалавечая непасрэднасць". "Родны край — Палессе, Айчына, Беларусь. Колькі ўсхваляваналіірычных і разважліва-мужных радкоў прысвечана ім паэтамі ўсіх пакаленняў! Паўтараць іх і наследаваць? Г. Дашкевіч і паўтарае, і наследуе, аднак зноў-такі робіць гэта адкрыта, непрыхавана. Дзесьці праглядваецца Якуб Колас, Яўгенія Янішчыц. Асабліва Яўгенія Янішчыц, якая таксама родам з Палесся", — пісаў пра яе першую кнігу паэзіі "Верасніца" акадэмік Акадэміі навук Беларусі Віктар Каваленка.

Паэтычныя набыткі Галіны Дашкевіч аналізавалі дактары філалагічных навук С. Лаўшук і А. Ненадавец, кандыдаты філалагічных навук У. Замкавец і А. Мельнікава, пісьменнікі У. Верамейчык, В. Жуковіч, М. Мятліцкі, М. Зарэмба, В.Ярац, А. Бароўскі, маладыя навукоўцы С. Грышкевіч і Я. Есіс.

Анамастычная прастора яе паэтычных дыскурсаў вельмі натуральная, зямная, пра што сведчаць пераканальна арыгінальныя загалоўкі яе першых кніг: "Верасніца" — гэта аднайменная вёска пад Туравам. У Тураве яна нарадзілася, там прайшлі першыя гады яе маленства. Побач — роднае паселішча бацькі Галіны вёска Малешаў, дзе яна вырасла, пайшла ў школу, пачула родныя песні, усвядоміла мацярынскую ласку, павагу і захапленне таты-настаўніка яе рана выяўленым талентам спяваць і слухаць, пісаць вершы.

*"Паўлік кніжачку чытае"* — гэта таксама не проста назва зборніка паэзіі для дзяцей, а ў першую чаргу эмацыйнае праяўленне — захапленне, любаванне, замілаванне і прысвячэнне любімаму ўнуку Паўліку, які таксама вельмі рана, як і бабуля, пачаў выяўляць жаданне і памкненне самастойна здабываць веды пра навакольны свет.

У вершах Г. Дашкевіч паэтызуюцца, адухаўляюцца, персаніфікуюцца шматлікія мясцовыя айконімы, гідронімы, мікратапонімы, уласцівыя Тураўшчыне, дзе яна правяла дзяцінства, Мазыршчыне, дзе вучылася, працавала ў школе, універсітэце, тэатры, дзе спаткала любоў, стварыла сям'ю, нарадзіла дзяцей, знайшла верных сяброў, стала вядучай артысткай мясцовага тэатра, прызнаным педагогам, кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам.

Галіна Дашкевіч — здольны навуковец, даследчык творчасці народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, сучаснай прозы, паэзіі, сцэнічнага мастацтва. Яе пяру належыць дысертацыя "Праблемы раманнай творчасці Івана Шамякіна", прысвечаная аналізу сюжэтаў і стылю класіка беларускай літаратуры, за што ёй прысвоена вучоная ступень кандыдата філалагічных навук. Галіну паважаў пісьменнік, ён высока цаніў яе навуковыя працы і паэтычны дар, асабліва падабаліся яму беларускія народныя песні ў яе выкананні.

Значная частка вершаў Галіны Дашкевіч прысвечана канкрэтным асобам — яе таварышам-калегам, настаўнікам, урачам, артыстам, вучоным, з якімі яна сябруе, у каго вучылася мудрасці жыцця, кім захаплялася і ганарылася. Гэта прафесар Іван Уладзіміравіч Дуда, пісьменнік Іван Мележ, Жэня Янішчыц, артысты мазырскага тэатра Андрэй Іванавіч Лазароўскі, Міхаіл Яўхімавіч Колас, народная артыстка СССР Галіна Макарава.

У вершах для дзяцей Галіна Дашкевіч шырока выкарыстоўвае традыцыйны для беларусаў набор уласных імёнаў, які цяпер пад уздзеяннем пераважна экстралінгвістычных фактараў у значнай меры архаізаваўся і выкарыстоўваецца, на жаль, не ўсімі. Паэтэса, ужываючы самыя розныя варыянты беларускіх дзіцячых імёнаў, звяртае ўвагу на іх мілагучнасць, адметнасць, нацыянальную непаўторнасць і самабытнасць. Дзейнічаюць у яе вершаваных творах запамінальныя для дзяцей і традыцыйныя ў беларускім фальклоры *дзед Мароз, Завіруха, яснавокая Вясна, Вясна-красуня, дзед Пярун, Чарадзей, Воўк, Мядзведзь, цёця Ліска, Зайка, коцік Кузя, Чыпірадла-задзірадла, Дуралей* і інш. (с. 49).

Пісаць для дзяцей значна цяжэй, чым для дарослых, адзначала ў адным з інтэрв'ю Галіна Дашкевіч, аднак яна знаходзіць спосабы зацікавіць маленькага чытача, па-народнаму пераканальна і проста тлумачыць Паўліку і яго маленькім сябрам незразумелыя словы: *"Прыляцелі буслы... // Буслянятак дзюбкамі буськаюць, // Нездарма называюць іх буськамі"*.

Знаходзіць яна і спосаб растлумачыць займальна маленькім жыхарам пераважна празрыстыя народныя назвы беларускіх месяцаў: *"Заспявала восень зычна, // Запаліў кастры кастрычнік, // Падарыў ім лістапад // Лісця ціхі зарапад. // Грудзень стукае ў грудзі: // — Дакапайце ж бульбу, людзі"*.

Пра сваю паэтычную творчасць паэтэса ў адным з вершаў сказала: *"Цярплівa ўзрыхляю поле Дабрыні, // Засяваю яго зярняткамі Спагады, // Аздабляю яго вяночкамі Надзеі, // Няхай каласіцца пад небам Кахання"*. Пажадаем і ёй Цярплівасці, Дабрыні, Спагады, Надзеі, Кахання, каб гэтыя вечныя словы былі спадарожнікамі яе сямейнага шчасця, працы, паэтычнага дару.

**Васіль ШУР**

***На здымку: Г. Дашкевіч і І. Шамякін.***

# Жанчыны жывуць доўга

## *Жонка Ізі Харыка*

Неяк на вока трапіла сціплая абвестка пра смерць жонкі Ізі Харыка, беларускага яўрэйскага паэта, загубленага ў страшныя 30-я гады. Перажыла ягоную смерць, смерць двух маленькіх сыночкаў, ссылку. І ўсё жыла. Адна. Без яго. Застаючыся жонкай Ізі Харыка.

## *Апошняя з нашаніўцаў*

"Мы з Вамі засталіся дзве апошнія нашаніўкі", — прачытала неяк у ліставанні Зоські Верас і Канстанцыі Буйло. Тады іх і насамрэч было дзве. А пасля засталася адна Зоська Верас у сваёй лясной хатцы ў Вільні, каб тонкай, але вельмі трывалай ніткай звязваць сучаснае з тою нашаніўскаю парой, якая дала Беларусі вялікіх творцаў, але якой гэтак жа патрэбныя былі і чорнарабочыя, што ціха і сціпла рабілі сваю справу. Такой была Зоська Верас. Наробак яе ў літаратуры хоць і сціплы, але адметны. А танюсенькая кніжыца з вялікай назвай "Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік" вартая вялікіх тамоў. Сам Караткевіч прасіў яе ў Людвікі Антонаўны.

Апошнія дні яе, зацемненыя не толькі слепатой, але і поўным забыццём, былі асвечаныя імем чалавека, які пайшоў з жыцця на семдзесят гадоў раней. Гэтак многа пражыўшы без яго, меўшы іншы шлюб, з глыбіняў памяці вярнула імя свайго каханага, бацькі першынца — Фабіяна Шантыра. Як сведчыла дачка Галіна, прад сконам шаптала гэтае імя.

## *Зорка Венера*

Далікатна схаваўшы сваё шчырае пачуццё за словамі эпіграфа "Яна — выдумка маёй галавы" і прыгожым імем гераіні вершаванай аповесці — Вераніка, наш заўсёды малады і такі далікатны Максім Багдановіч не хацеў адкрыць яе сапраўднага імя. І яно стала таямніцай на доўгія гады. Але час і жаданне людское ведаць — хто ж яна, гэтую таямніцу раскрылі. Чарнавокая пані, Аня Какуева — вялікае каханне Паэта, тая, ростань з якою вылілася ў дзівосныя радкі раманса "Зорка Венера".

Як гэта добра, што з фотаздымкаў, змешчаных у многіх кнігах пра Максіма Багдановіча, глядзіць Яна — юная прыгажуня. Бо калісьці даўно, хіба ў сямідзесятых гадах, давялося пабачыць у тадышнім жаночым часопісе "Работніца і сялянка" іншы фотаздымак, зроблены праз многа гадоў. З яго пазірала кабета сталага-сталага веку... Зусім не яна.

## *А яна!..*

Неяк у "Нашай Ніве" ўбачыла фотаздымак Ларысы Геніюш, якая заставалася прыгожай і ў паважным веку. А поруч з ёю хтосьці старэнькі з рэдкім пушком на галаве. Чамусьці не прачытала подпіс да таго фотаздымка, не падумала, што гэта можа быць Яна — найпрыгажэйшая між кабет нашаніўскай пары, якая была ўпэўненай, што сам Купала кахаў яе (дыму ж без агню не бывае, а ў гэтым выпадку: такога верша, як "А яна!.." не закаханы напісаць бы не змог). Пазней ізноў сустрэла гэты ж здымак і жахнулася: Паўліна Мядзёлка! Тая прыгажуня, што задумліва глядзіць на нас з вядомага яшчэ са школьнага часу фотаздымка, далікатна дакрануўшыся да падбародка.

## *Стасютэ*

Які ж неміласэрны час да прыгожых кабет! Мужчыны неяк не надта тым часам змяняюцца. Параўноўваю два фотаздымкі: з Вацлавам Юстынавічам у 1920-х гадах і з Язэпам Дылам у 1950-х. Хіба гэта тая Стасютэ, што зачаравала калісьці самога Вацлава Ластоўскага? Ну няхай: зморшчыны, няхай дзесьці падзелася тая хваля валасоў, што так хораша абрамляла ейны дасканала прыгожы твар, няхай высахлі вусны, змяніўся чароўны авал... Але дзе ж падзеліся вочы?! Вялізныя, на паўтвару, блакітныя вочы-азёры, у глыбіні якіх — загадка вечнай жаноцкасці... Заміж іх — дзве малыя шчыліны, што праз апухлыя павекі ўсё яшчэ глядзяць на свет, у якім ужо столькі гадоў няма яго. Пэўна, таму і патухлі тыя вочы-зоры.

## *Цярплівая Ласка*

Яе нельга было не пакахаць. Глыбокія сінія вочы, доўгая каса... Ласкавы пагляд, што цешыў нават у самую змрочную хвіліну. А голас!.. Спевамі сваімі зачароўвала. І такой разумніцай была: пісала апавяданні, падрыхтавала падручнік для малодшых класаў, які праз многа гадоў з удзячнасцю згадваўся Янкам Брылём.

Леаніла Усцінаўна Чарняўская-Гарэцкая — адна з нашых мужных дзекабрыстак, што раздзялiла з мужам пакуты выгнання. Так і не дачакалася праўды пра каханага мужа, не даведалася нават праўдзівае даты ягонае смерці.

**Ала ПЕТРУШКЕВІЧ**

**Ён належыць нашай сучаснасці. У 2008 годзе Анатолю Грачанікаву (1938 — 1991) споўнілася б 70 гадоў. Гэтай публікацыяй хацелася б нагадаць пра таленавітага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі.**



# Партрэт паэта ў інтэр'еры жанру

Асабліва яскравае ўяўленне пра беларускую паэзію, яе разнастайнасць даюць жанры і віды верша. Шматграннай і цікавай з'явай у жанравых адносінах з'яўляецца паэзія Анатоля Грачанікава.

Паэт зрабіў мастацка-эстэтычны пошук сваім творчым правілам. Можна сказаць, паэтычныя жанры сталі ў яго паэзіі "вядучымі героямі" (М. Бахцін). А. Грачанікаў арыентаваўся на традыцыйныя тыпы паэтычнай творчасці, апрабаваныя на працягу шматвяковай мастацкай практыкі (балада, элегія, песня). Надзвычай упадабаў так званыя цвёрдыя формы верша: санет, актаву, тэрцыну і інш. Але гэта не значыць, што паэт ішоў шляхам пераймання гатовых узораў, наадварот, "жанравы вопыт" ён засвойваў творча, імкнуўся вобраз рэчаіснасці ўвасобіць у адэкватнай, найбольш прыдатнай мастацкай форме, укладваючы ў яе адметны і непаўторны суб'ектыўны змест. Слова-думка, слова-пачуццё абуджалі, нават абвастралі "жанравы зрок" (М. Бахцін). Крытык Р. Бярозкін, рэцэнзуючы зборнік А. Грачанікава "Начная змена" (1975), вылучыў "прытчападобныя вершы-"сігналы", а таксама заўважыў схільнасць аўтара да вынаходніцтва "парадаксальнага вершамадэлі".

Шматлікія разнавіднасці верша ў творчасці А. Грачанікава ўмацоўваюць перакананне, што ён імкнуўся ўнікнуць аднабаковасці, аднастайнасці ў паэтычным увасабленні жыцця, з'яў рэчаіснасці. А. Грачанікаў — таленавіты лірык прыроды, які тонка маляваў навакольны свет. Асабліва часта ён ствараў выявы ранняй восені, любіў гэтую пару года. Напэўна, ці не галоўную ролю ў прыхільнасці паэта да восеньскага жывапісання адыграла тое, што ён нарадзіўся ў верасні. Мае рацыю Т. Чабан, калі піша пра яго лірыку: "Асенняя палітра фарбаў, сцішана-элегічная мелодыя гукаў найбольш адпавядаюць і індывідуальна-творчай манеры, і светаадчуванню А. Грачанікава...". Верш-замалёўка "Упершыню..." мае выразную прадметна-вобразную аснову, вылучаецца пільнай увагай аўтара да знешніх прыкмет навакольля:

*Паветра —*
*студзяністае, густое.*
*Шарэлым ранкам,*
*нібы сыты ліс,*
*Спіць вецер недзе ў норах*
*за ракою.*
*Схуднеў за вёскай*
*Хмызнякоў паўкруг.*
*І знікла са штыкетніка*
*даёнка.*

"Як ападае ліст..." — восеньская элегія, у якой чуецца матыў развітання з цяплом, сонцам, летам. Але гэтая развітальная песня — больш чым апісанне прыроды, у ёй увасабляецца філасофская думка пра завяданне жыцця і нараджэнне "маладога дня". Паэт здолеў стварыць кранальны настраёвы "пейзаж душы":

*Як ападае ліст, як ападае...*
*Нібы дазволу*
*ў восені пытае.*

*Бывай, галінка гнуткая,*
*бывай!*
*Няхай цяпер цябе*
*галубіць вецер,*
*Салодка закалыхвае*
*пад вечар*
*І будзіць на зары няхай.*
*.....*
*Бывайце, сонца,*
*поле і таполя!*
*Мне час заснуць у восені*
*ў прыполе...*

А. Грачанікаў — дзіця вайны, і таму яе трагедыя хвалявала паэта праз усе гады жыцця і творчасці. Ён пастаянна жыў думкай пра ўвасабленне тых незабыўных падзей, пакутнага лёсу дзяцей, іх драматычнага, незвычайна напружанага існавання ва ўмовах смяротнай небяспекі. Пры выбары жанру для паказу вайны паэт шматразова спыняўся на баладзе, плённа скарыстоўваў яе мастацка-выяўленчыя магчымасці для раскрыцця суровай і жорсткай праўды часу. Асэнсаванню абпаленага і адабранага дзяцінства, ваеннай рэчаіснасці прысвечаны "Балада вятроў", "Неба і камень", "Крывавая балада", "Балада пра пяць вазоў", "Вяртанне з бежанцаў", "Вячэра".

"Крывавая балада" раскрывае трагізм становішча і светаадчування дзяцей, у якіх гітлераўскія вылюдкі для сваіх патрэб бралі кроў. Твор мае прысвячэнне: "Светлай памяці аднагодкаў". Дзяцей часта параўноўваюць з кветкамі жыцця, аднак гэтыя кветкі ў гады вайны вялі, чэзлі, гінулі. Фашыстамі кіруе нешта нялюдскае і змрочнае, іх не супыняе ні матчын енк, ні дзіцячыя слёзы.

Адметнай мастацкай з'явай стала ў творчасці А. Грачанікава актава. Паэт стварыў цэлыя цыклы вершаў гэтай формы: "Грыбная пара", "Начная змена", "Актавы кахання". Яркай вобразнасці і афарыстычнасці паэт дасягае ў васьмірадковых творах пра каханне: "Каханне — найцяжэйшая з пакут. // Мая добраахвотная пакута"; "Каханне не разветрыцца, як дым. // Хто закаханы, у жыцці той смелы"; "...На свеце без кахання // Жыцця няма — ёсць толькі існаванне"; "Агні кахання — вечныя агні. // Без іх — у чалавецтва лёс сірочы".

З цвёрдых вершаваных формаў у паэзіі А. Грачанікава вылучаецца тэрцына "Нам свецяць", якая напісана трохрадкоўямі з ланцуговай кампазіцыяй. Плынь радкоў у вершы — свабодная і натуральная, без відавочнай зададзенасці. Хоць фармальны "код", безумоўна, закладзены і прачытваецца выразна. Архітэктоніка адпавядае ўсім асноўным параметрам тэрцыны. У строфах увасоблены адухоўлены змест, аўтарскі роздум пазначаны філасафічнасцю:

*Ляціць трывог-надзей*
*калыска*
*На захад дзён маіх усходу.*
*Дзе вечнага супынку рыска?*

*Аскомістая асалода:*
*Хварэць, ачуньваць, —*
*зноўку жыць!*
*Мінуўшчыне няма звароту.*

*А сэрца ўсё —*
*баліць, баліць...*

Інтэлектуальнасць індывідуальнага стылю А. Грачанікава выяўляецца ў такіх паэтычных творах, як верш-рэфлексія, медытацыя, прытча. Лірычны герой паэта знаходзіцца ў цэнтры свету-жыцця, таму, натуральна, яго хвалююць маральныя і філасофскія пытанні, якія ў сваю чаргу запатрабавалі ад аўтара сродкаў аналітычнага пісьма. Кірунак разважанняў у вершах паэта, дзе ён высвятляе ўнутрана істотнае і значнае, можна пазначыць так: чалавек — быццё — час — прастора ("Час роздуму", "Ёсць у жыцці...", "Спяшацца рэкам няма куды...", "Адноснасць руху", "Людзі глядзелі ў неба", "Далёкае сузор'е", "Зоры спяваюць"). Здзіўляе рытміка-інтанацыйная шырыня і разнастайнасць аўтарскіх выказванняў, і адпаведна — стылёвая шматпланавасць вершаваных тэкстаў. Лірызм з'яўляецца вызначальным пачаткам у творчасці паэта, прычым не толькі ў балады і вершах-разважаннях, але і паэмах "Бясконцыя рэйкі", "Палескі трохкутнік".

Жанравая ўстаноўка А. Грачанікава на прытчавасць выявілася ў такіх творах, як "Першы ўзыход сонца", "Кароль і вяльможы", "Аварыя", "Белы голуб", "Харытон і закон", "Мудрэц і хлапец", "Латарэйны білет", нізцы вершаваных мініяцюр "Усходняя мазаіка". Нельга сказаць, каб беларускія паэты пастаянна ці даволі часта звярталіся да формаў мастацкай умоўнасці. Савецкая крытыка патрабавала яснасці і празрыстасці зместу верша, алегарычнасць ці падтэкст успрымаліся з насцярожанасцю. Асобныя паэты выдатна ўсведамлялі ідэйна-канцэптуальныя магчымасці прытчы, экспрэсіі слова ў ёй (Максім Танк, Анатоль Вярцінскі, Пятрусь Макаль). Прытча трымаецца на іншасказальнасці, для яе характэрна паглыбленае асэнсаванне з'яў і падзей, сэнсава-змястоўная ёмістасць думкі, філасофска-этычная павучальнасць. Усё гэта ёсць у вершаваных прытчах А. Грачанікава, які сваімі творамі надаў напаўзабытаму жанру новае дыханне.

Верш "Аварыя" мае аўтарскае вызначэнне: "Сучасная казка". Паэт змадэляваў неверагодную, нават фантастычную сітуацыю: сустрэліся два робаты, адзін з якіх паскардзіўся другому, што ў яго "селі батарэйкі", і папрасіў: "Адкруці на шыі крышку, // Падкруці кантакты крышку...". Здавалася б, той павінен дапамагчы свайму напарніку, паколькі "і ў робатаў... пачуццё сяброўства ёсць". Аднак высветлілася, што дружбак быў зайздроснікам і лайдаком, таму ён наўмысна ўчыніў шкоду: "Блок бяспекі пакалечыў // Электроннаю рукой". Адбылася паломка ў механізме — па сутнасці здарылася аварыя сумлення. Гэты збой прымушае задумацца пра ненадзейнасць свету разумных машын, бяспеку грамадства, якое часам спадзяецца на тэхнічны працэс і дзейнічае без уліку маральнага фактару.

Мудрым жыццёвым зместам, афарыстычнасцю напоўнена "Усходняя мазаіка" А. Грачанікава. Гэты вершаваны цыкл пераконвае, што зварот беларускага аўтара да прытчы быў падказаны не толькі фальклорнымі крыніцамі, але і мастацкім вопытам паэзіі старажытнага Усходу. Прытчавыя творы заключаюць у сабе мудрыя ўрокі жыцця, маральна-дыдактычны пафас, скіраваны на сцвярджэнне агульначалавечых каштоўнасцяў: "Там, дзе ў сям'і знікаюць мір і згода, // Псуецца, мабыць, будучыня роду. // Як між сабой народы варагуюць, — // Псуецца чалавечая прырода" ("Там, дзе ў сям'і знікаюць мір і згода...").

Асабліва шмат у лірыцы А. Грачанікава песенных інтанацый. Можна сказаць, паэт арыентаваны на песню як форму паэтычнага мыслення. Ужо назвы шэрага вершаў ці іх падзагалоўкі красамоўна сведчаць пра гэта: "Сентыментальны раманс", "Кацярына. (Песня-жарт)", "Палессе (Песня)", "Цыганскія песні", "Развітальны вальс", "Слухаючы песні пра каханне", "Адвечная песня". Паэт валодае тонкім і чуйным слыхам. Усё ў яго паэтычным свеце набывае гучанне. Чароўны голас мае прырода, і дзіўным голасам спявае закаханае сэрца. Меладычнасць, лірычная спеўнасць радка — вызначальная рыса многіх вершаў А. Грачанікава: "Усё часова на зямлі, часова...", "Асенняя музыка траў", "Там ёсць паляна, на якой...", "Блакіт прадонны вераснёвы..." і інш.

Многія вершы паэта з'яўляюцца ўзорамі песеннага жанру ці адчувальна набліжаныя да яго. Словы А. Грачанікава натхнілі на напісанне музыкі кампазітараў Г. Вагнера, У. Будніка, І. Лучанка, В. Іванова, К. Паплаўскага і інш. Існуюць тры музычныя версіі ўвасаблення верша "Над Белай Руссю", якія належаць У. Дамарацкаму, М. Літвіну, С. Хвашчынскаму. Ужо адзін гэты факт пераконвае, што паэзія Грачанікава мела поспех у беларускіх кампазітараў. Можна беспамылкова меркаваць, што іх прыцягвала выразнасць і глыбіня выяўленага пачуцця, дасканалая рытмічная зладжанасць паэтычнага тэксту.

Песенныя вершы А. Грачанікава розныя па сваёй кампазіцыйна-гукавой будове і стылёва-выяўленчым ладзе. Узнёсла-патрыятычным пафасам прасякнуты строфы "Палесся", гумарыстычны настрой, досціп, іронія выяўляюцца ў гарэзлівых "Дударыках", а ў творы "Засні..." гучыць прачулая мелодыя калыханкі... А ёсць яшчэ раманс, развітальныя словы вальса, імпэтная, з вар'іраваннем рытму "Школа танцаў" і іншыя творы, якія сведчаць пра багацце інтанацый у паэзіі А. Грачанікава. Яго творы песеннага складу вызначаюцца суладнасцю гукавой інструментоўкі і вобразнага, жывапіснага слова.

Пра разнастайнасць творчага выяўлення А. Грачанікава сведчаць формы верша-дыялога ("Блукаючая камета"), звароту ("Ад Хатыні да Шыпкі"), ліста ("Чуеш, Ляксандравіч, прыязджай..."), надпісу ("Надпіс"). Фігуральна кажучы, ён умеў гаварыць рознымі паэтычнымі жанрамі з улікам іх спецыфікі і патэнцыяльных магчымасцей.

**Алесь БЕЛЬСКІ**

# Аляхно чакаюць у Сербіі

**Нядаўна многія тэлегледачы маглі пабачыць на Першым канале прамую трансляцыю фінальнага шоу праекта "ЕўраФэст". Яго пераможцам стаў Руслан Аляхно, вядомы многім як "народны артыст". Менавіта ён прадставіць нашу краіну на "Еўрабачанні-2008", якое пройдзе ў сербскім Белградзе. Пакуль журы і гледачы выносілі свой вердыкт, карэспандэнт "ЛіМа" назіраў за падзеямі непасрэдна з канцэртнай пляцоўкі...**

Напэўна, столькі гледачоў (пераважна моладзі) даўно не збіралася ў сценах Палаца спорту. І партэр, і так званы танцпол былі поўныя.

На прэс-канферэнцыі пасля шоу ўдзельнікі канцэрта дзяліліся ўражаннямі. Гасцям — пераможцам мінулагодніх "Еўрабачанняў" Руслане і гурту Лордзі (тыя самыя фіны, што хаваюцца за латэкснымі маскамі монстраў. — **Удакл. аўт.**) вельмі спадабаўся прыём у Мінску. Яны ахвотна ішлі на кантакт і нават знайшлі хвілінку сфатаграфавацца пасля шоу з некаторымі шчасліўцамі.

Калі гасцям усё спадабалася, то некаторыя фіналісты былі насамрэч расчараваныя перамогай Аляхно. У Гюнэш Абасавай сёлетняя спроба — ужо другая. І зноўку без станоўчага выніку. Па словах спявачкі, яна не збіраецца складваць рукі. Дарэчы, выступленне ў Гюнэш было сапраўды адметным. Не пашанцавала сёлета і гуртам Litesound і "По глазам".

У бліжэйшы час Руслан Аляхно і яго каманда будуць занятыя падрыхтоўкай нумара, дапрацоўкай песні. Дарэчы, кампазіцыю "Hasta la vista", якую спявак выконваў на фінале "ЕўраФэсту", напісаў вядомы расійскі кампазітар Кім Брэйтбург. Застаецца пажадаць нашым плённай працы і добрага выніку ў Сербіі!

**Уладзімір ШУГАВЕЕЎ**

# Па старонках «Ведаў»

Чытача апошняга нумара газеты "Веды", заснавальнікам якой з'яўляецца Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, зацікавіць разгорнутая рэцэнзія на чатырохтомнае выданне прафесара Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны Сяргея Шчарбакова "Шлях у навуку". Гэта — сапраўдная энцыклапедыя навукі Гомельшчыны, гісторыі яе развіцця, пачынаючы з 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Зрэшты, сугучны развагам рэцэнзента і артыкул газеты пад назвай "Беларуская навука ў асобах". Тут — біяграфічныя і бібліяграфічныя звесткі пра айчынных навукоўцаў і землякоў-вучоных іншых краін свету. Згадаем, што з 1996 года, калі пачаўся збор гэтых звестак, назапасілася 13 тысяч дакументаў, што адлюстроўваюць самыя розныя факты з жыцця і навуковай дзейнасці 6 тысяч вучоных. Дарэчы, пра аднаго з нашых вучоных — загадчыка аддзела плазменных аэракасмічных тэхналогій Інстытута цяпла- і масаабмену імя Лыкава Уладзіміра Ермачэнку чытачы даведаюцца з артыкула "Шлях да Марса пачынаецца ў Мінску".

**Андрэй МАКСІМАЎ**

Сумная вестка прыйшла з Віцебска. Трагічна абарвалася жыццё 58-гадовай паэткі **Яўгеніі МАЛЬЧЭЎСКАЙ**, аўтаркі некалькіх калектыўных зборнікаў і ўласнай арыгінальнай кніжкі паэзіі "Залежнасць". Пракуратурай Першамайскага раёна Віцебска распачата крымінальная справа. Глыбока перажываючы страту таленавітай паэткі, мы выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім Яўгеніі Еўдакімаўны.

**РВУ "Літаратура і Мастацтва"**

**Ізяслаў КАТЛЯРОЎ. Нарадзіўся ў горадзе Чавусы ў 1938 годзе. Пасля вучобы ў мясцовай няпоўнай сярэдняй школе працаваў на абутковай фабрыцы (1955 — 1960). Адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. З 1960 года працаваў рабочым у геадэзічнай канторы Мінгарвыканкама. Скончыў вячэрняе аддзяленне факультэта журналістыкі БДУ (1966). Працаваў літсупрацоўнікам у рэдакцыі газеты "Западная трасса", а пасля ў светлагорскай раённай газеце "Агні камунізму" (з 1966 года да нядаўняга часу). Піша на рускай мове. Выдаў кніжкі: "Мой ровесник", "Конфетное дерево", "Друзья мои — свидетели мои", "Здесь, на трепетной земле" і многія іншыя. Не так даўно выйшла з друку яго новая кніжка "СНАЧАЛА ЖИЗНЬ — ПОТОМ СУДЬБА" (Мінск, выд-ва "Кнігазбор", 500 экз., 230 стар.)**

*"Как я хочу, чтоб строчки эти*
*Забыли, что они слова,*
*А стали: небо, крыши, ветер,*
*Сырых бульваров дерева!*
*Чтоб из распахнутой страницы,*
*Как из открытого окна,*
*Раздался свет, запели птицы,*
*Дохнула жизни глубина."*

У. Сакалоў

На працягу чытання кніжкі І. Катлярова мяне не пакідала адчуванне, што не так даўно адышоўшы ў іншы свет вядомы рускі лірык У. Сакалоў з'яўляецца яго літаратурным "хросным бацькам". Настолькі блізкае і роднаснае гучанне іх унутраных галасоў, што падчас ствараецца ўражанне, быццам яны прамаўляюць ва унісон. Ёсць такі выраз "жыць душа ў душу". У нашым выпадку можна сказаць "тварыць душа ў душу"... хоць мне хацелася б сказаць інакш — "тварыць душой душу". Ці не праўда, тут больш паэзіі?

Ну, да прыкладу, гэтыя радкі І. Катлярова хіба не пераклікаюцца з узятымі мной для эпіграфа?

*Боже, дай мне чисто, звонко,*
*дай такую власть,*
*чтоб в моих стихах позёмка*
*за строкой вилась.*

Альбо нават такое аўтарскае тлумачэнне заўважнага наследавання:

*Я ненавижу ремесло —*
*его всегда мне мало,*
*чтоб слово тоже стать могло*
*тем, что обозначало.*

І, прызнаем, што выбар такога "настаўніка" ўзвышае ў вачах чытача самога "вучня". У адным з вершаў У. Сакалова ёсць такая фармуліроўка сутнасці яго паэзіі: *"О, расскажи о том, что происходит, // когда не происходит ничего."* Нешта падобнае ўзнікае ў галаве, калі я хачу выказваць паэтычнае "крэда" І. Катлярова (*"Я знал: поэзия — лишь в том, // что быть не хочет словом"*)... Напраўду, у большасці яго вершаў сюжэт як бы адсутнічае, ёсць нейкая няўвідная лінія чалавечых сэнсаадчуванняў, нешта падобнае да сардэчнай кардыяграмы, якую прачытвае толькі спецыяліст, а вызнае толькі хворы... Унутраная праца, са сваімі псіхалагічнымі ўсплёскамі і надрывамі... Аналіз пражытага: падзей, учынкаў, памылак, здзіўленняў, непаразуменняў, — але не адмаўлення ад "аўтарства" свайго жыцця. Як у Пушкіна:

*"И с отвращением*
*читая жизнь мою,*
*Я трепещу и проклинаю,*
*И горько жалуюсь,*
*и горько слёзы лью,*
*Но строк печальных не смываю".*

Мне думаецца, што да свайго асабістага жыцця ў І. Катлярова не было такога "отвращения", хоць самотных радкоў у яго творчасці не менш, чым у Пушкіна... Аднак не заўсёды і не ва ўсіх самота самоце роўная.

*Прости мне прегрешенья,*
*нелепые пути, —*
*в мои стихотворенья*
*пусти меня, пусти.*

Трэба думаць, што там, за **решеткой** чатырохрадкоўя, як на споведзі, адпускаюцца паэту яго зямныя чалавечыя грахі...

Парадаксальна, што руская мова, якая цяпер праз збег розных акалічнасцей, з'яўляецца ў Беларусі першаснай і асноўнай мовай зносін у грамадстве, да гэтай пары так і застаецца другаснай мовай у беларускай літаратуры... Усё-ткі нацыянальны код у падсвядомасці пераважнай большасці народа захоўваецца, нягай нават і на ўзроўні падсвядомай (архіўна-музейнай) спадчыннай каштоўнасці. Таму нацыянальная літаратура (традыцыя, культура, творчасць агулам) **мела**, **мае** і **будзе мець** прыярытэт у народзе. Інстынкт нацыянальнага самазахавання перасіліць рэфлексіі самавынішчэння. І як вы, спадар Андрэеў, не назавіцеся — беларускім рускамоўным літаратарам ці рускім літаратарам Беларусі — вы ўсё адно будзеце ў гэтай дзяржаве і ў гэтага чытача *другасным* літаратарам. Не таму, што вы пішаце з мастацкага погляду горш ці лепш, і нават не таму, што вы пішаце на тэму беларушчыны, Браншчыны ці славянафільшчыны, а ўсяго толькі таму, што ў **Беларусі** вы пішаце *па-руску*. Па-руску беларускі чалавек можа без праблем пачытаць і сапраўдных этнічных расійскіх літаратараў. Так склалася. Прырода сама рэгулюе працэс чалавечага, у тым ліку і нацыянальнага развіцця. Назавіце вы мне беларускіх літаратараў, што жылі тут і пісалі па-руску, якія сталі знакавымі ў нашай літаратуры, а тым больш па-за межамі Беларусі, хай сабе толькі ў Расіі? Хіба адно тых, хто ўразумеў падобны вырак, і пераехаў на пастаяннае жыхарства ў краіну абранай ім мовы творчасці, ды і тое — гэта адзінкі, асабіста я, апроч таленавітага паэта з Прапойска Ігара Шклярэўскага, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі РФ, назваць не магу...

Вось і імя Ізяслава Катлярова ў беларускай рускамоўнай паэзіі даўно не новае, знанае ў літаратурным атачэнні, аднак, сказаць, што яно шырокавядомае ў чытацкіх колах, таксама не выпадае. Зрэшты, тут асабліва адчайвацца не трэба, бо і балышыня беларускамоўных сучасных паэтаў і пісьменнікаў, за выключэннем вузкага кола абраных імён, вядомасцю не вылучаецца. Адчуваецца, што І. Катляроў усё ж камплексуе з гэтай ці блізкай да гэтай прычыны:

*Помоги, стихотворная речь,*
*Нет, не речью уже, а реченьем.*
*Обрекаю себя, но обречь*
*Не могу и своим обреченьем.*

Але сказаць, што ў паэтычных радках І. Катлярова на балючай (ці хоць бы ўзвышанай) ноце выпісана яго айчына Беларусь, ніяк не выпадае. Усе яго словы і паэтычныя тропы рассыпаны ў зямным бязмежжы і па-за нацыянальным кантэкстам чалавечай душы. Ну, хіба вось гэты сімвалічна-сіратлівы штрых пакінутай тубыльцамі хаты напрыканцы зборніка:

*Смолкли навсегда здесь те,*
*кто жили,*
*памятные стенам голоса.*
*Ветром вновь распахнута*
*калитка,*
*словно передумала стучать.*
*Хата незабытая забыта, —*
*продана иль предана?..*
*Как знать...*

Для параўнання: усходняя братняя дзяржава і сімвал яе вялікадзяржаўнасці выпісаны напышліва, па-славянафільску красамоўна-пафасна:

*Россия. Миссия. Мессия —*
*душе созвучные слова...*
*Всё той же грусти ностальгия*
*необъясняемо права.*
*А ветры вновь заголосили,*
*и далью высь уже видна...*
*Я знаю миссию России —*
*она мессией быть должна.*

Мабыць, аўтар, які піша па-руску, жывучы ў інашамоўнай дзяржаве, заўжды камплексуе на гэты конт, найперш думаючы пра чытацкую геаграфію сваіх твораў і іх аднамоўную чытацкую прыхільнасць, пакідаючы на задняім плане ўласную нацыянальную годнасць, згодна нашай беларускай *талерантнасці*. Хоць, вядома, і разумее, што ўся крамлёўская духоўная паднебнасць не што іншае, як даўно змысленая руская вялікадзяржаўная ідэалагічная канцэпцыя:

*А остального просто нет,*
*мы это выдумали сами,*
*а остальное — лунный свет*
*над золочёными крестами.*

І, у рэшце рэшт, вяртаецца да падсвядома закладзеных родавых высноў:

*Родина — не там,*
*где ты зимуешь,*
*Родина — лишь там,*
*где ты рождён.*

Аднак, аддамо належнае таленавітаму аўтару, ён разумее, якой меркай мераецца собскі талент для мясцовага карыстання, і наколькі тая мерка разыходзіцца альбо не дацягвае да агульначалавечых узораў мастацтва і інтэлекту, тады як сапраўдны, неацэнены альбо апальны самародак застаецца ў глыбокім закуцці культурнага грамадскага жыцця.

*Да, прав, кто думает о том,*
*себе не без упрёка,*
*что и в отечестве своём*
*нет своего пророка.*
*Не потому ль во всех веках,*
*безликостью убоги*
*внушают ужас или страх*
*всё те же лжепророки.*

Прызнаем, што мастацкая літаратура на сённяшнім сваім этапе скукожылася і застыгла натапыраным ваўчком у заціненым кутку "прасунутага" ў матэрыяльным плане грамадства. Безумоўна, яна дачакаецца канца гэтай своеасаблівай ***Вальпургіевай ночы*** і, у рэшце рэшт, спагадна пусціць да сябе сцверазелую за дваццаць гадоў публіку. Мне так думаецца. Не сумняваецца ў тым і светлагорскі паэт:

*В житейской доброте,*
*в житейском зле?*
*О, Господи,*
*и впрямь решаем сами:*
*влачиться ли нам духом по земле*
*иль всё-таки парить*
*под небесами.*

Што праўда, некаторым сучасным аўтарам здаецца, што чытач адвярнуўся ад іх паэзіі з прычыны аб'ёмнасці інфармацыйнага поля і беспрэцэдэнтна шырокага выхаду ў інтэрнетную сусветную павуціну, а не адсутнасці ў іх творчасці выбітных высокамастацкіх тэкстаў. Але дарма так глыбока і беспрасветна рэфлексуюць літаратары на гэты конт. Адназначна, чалавек на сучасным этапе свайго развіцця апынуўся ў стане абагаўлення рэчаў (матэрыі), а не духу. Аднак, трэба спадзявацца, што такая эвалюцыйная гіпердынаміка ў развіцці чалавецтва часовая. Думаецца, гэты перыяд працягнецца да таго часу, пакуль рэчы не зробяць чалавека цалкам залежным ад сябе. І толькі тады ён успомніць і зажадае колішняй гегемоніі над імі. Але каб вярнуць сваю былую славу — **духоўнае ўзвышэнства** — яму спатрэбіцца наноў назапашваць і рэканструяваць страчанае: *адукацыю*, *культуру*, *творчасць* і *мастацтва*...

Трэба аднак зазначыць, што і пры такім стане рэчаў некаторыя, асабліва маладзейшыя літаратары, не страцілі надзеі дастукацца да шырокай публікі. Выстаўляючы і рэкламуючы сябе наперад самой творчасці, выступаючы ў ролі прамоутэраў і правакатараў уласных тэкстаў, яны за кошт першага (асабістых здольнасцей, харызмы і ўчынкаў) прасоўваюць і другое (нярэдка другаснае, гэта значыць, самі літаратурныя тэксты). У сусветнай павуціне заблытваюцца не толькі яе чытачы-наведнікі, але і самі пішучыя і тыя, хто развешвае тую павуту, шматтысячныя блогеры...

На жаль, пакуль што "па-за кадрам" часу застаюцца многія сапраўдныя творцы, якія намагаюцца моцай уласнага духу ўздымацца вышэй прыземленага. Сярод іх і паэт са Светлагорска Ізяслаў Катляроў. Я мала што ведаю пра яго чалавечае і грамадзянскае жыццё (ну, можа, толькі тое, што ён муж паэткі Соф'і Шах). Але, пагодзімся, на сёння гэта не так важна, як сама яго творчасць.

*Значит,*
*всё же мало быть поэтом, —*
*Нет, поэтом невозможно стать,*
*Если не умеешь чистым светом*
*То, что не написано, читать.*

Мастак і творчасць, паэт і грамадства — вось асноўныя пытанні, якія пастаянна (і ці не празмерна часта?) уздымае ў сваёй новай кнізе Ізяслаў Катляроў... Не, не тое сацыяльна-пралетарскае пытанне — *"С кем вы, мастера искусства?"* — а пытанне асабістай адказнасці і ўласнага абавязку перад сваім, Богам дадзеным, талентам...

*Понял он,*
*что небо меньше знает,*
*чем само сиянье говорит...*

Аднак крытычна адзначым, што паэт занадта часта выкарыстоўвае адны і тыя ж паэтычныя прыёмы для вырашэння мала адрозных задач. Ды і задачы, на фоне асноўнай — **жыццё паэта** і **лёс паэзіі** — выглядаюць, на мой погляд, наўмысна завышанымі, наўсцяж якіх нікнуць дробныя пытанні чалавечага жыцця, абмінуўшы напластаванні якіх немагчыма ўзвысіцца да галоўнага... Безумоўна, дасведчаны чытач не раз пастаронкава *праходзіў* гэтыя кругі літаратурнага эстэцтва з умоўнымі пазнакамі: *"мастацтва дзеля мастацтва"*, *"паэзія чыстай красы"*, *"мэта паэзіі — паэзія"* (Дэльвіг) і г.д. З іншага боку, я разумею паэтаў, якія спрабуюць адмежаваць дух, уздымаючы яго на неадольную для грэшнай плоці вышыню... Аднак і Катляроў вось, пасля неаднаразовых такіх спроб, змушаны, на прыкладзе жураўлінага выраю, прызнаць вяршэнства Прыроды, якое палягае ў гармоніі зямнога і паднебнага:

*Нет, не могут никак замолчать,*
*оглушают простор небосвода,*
*хоть, зачем бы, казалось,*
*кричать,*
*если силы нужны для полёта...*

Адзін раскручаны сучасны паэт-іраніст, колькі часу таму нават зазлаваў, што публіка і журналісты, якія даносяць яго творчасць да гэтай публікі, не разумеюць **такой** паэзіі, і ён нават звярнуўся з просьбай да кіраўнікоў і выкладчыкаў жур- і філфакаў: *"Давайце іх вучыць хоць крыху цяміць у паэзіі. Беларускай, расійскай, іншай замежнай — якой заўгодна — у мэтах хоць невялічкага памяншэння колькасці жлобства ў нашых афіцыйных і незалежных, папяровых і электронных і г.д. і г.д. СМІ!"*. Трэба зазначыць, што пакуль тыя СМІ не зачапілі некаторых бакоў жыцця і творчасці гэтага паэта, ён да журналістаў не меў ніякіх прэтэнзій... У І. Катлярова ёсць такія радкі, як мне здаецца, блізкія да гэтай праблемы:

*И лишь одно он знать не мог —*
*и в этом вся досада:*
*талант — обязанность,*
*он — долг,*
*его исполнить надо.*

Ці ёсць такая праблема насамрэч і ці не надуманая яна? Як мне здаецца, то паэтычны дар, як і разуменне і адчуванне яго, даецца чалавеку не філфакаўскімі выкладчыкамі, а родавымі генамі, духоўным выхаваннем ды самаўдасканальваннем уласнай натуры. Я, да прыкладу, філфакаў не канчаў, і што ж, як след не разумею значнасці таго, што піша і кажа пра сябе і сваё напісанае спадар паэт? Яшчэ як разумею! І такіх, як я, дастаткова, каб, не камплексуючы ад іх малалікасці і дасведчанасці, нашы літаратары працягвалі пісаць вершы. Паколькі, як справядліва зазначае І. Катляроў:

*Душу невозможно спрятать*
*в тогу, —*
*Ощутил, уже столичный, сам.*
*Слово — лишь от Бога или —*
*к Богу.*
*Остальное — не его устам.*

**ЛеГАЛ**

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

*Рэдакцыйная рада:*
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Жана МАЛЕВІЧ
(адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ
(намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

*Адрас рэдакцыі:*
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

*Тэлефоны:*
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

*Аддзелы:*
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый. Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

*Выдавец:*
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3663
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 30.01.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 553

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686